Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 49 (4544) 24 снежня 2009 г.

У нумары:

Зачын на будучае

Чым жылі айчынныя літаратары ў гэты год, распавядае старшыня СПБ Мікалай Чаргінец.

Стар. 2

Дзеля захавання маральных каштоўнасцей

Рэзананс ад форуму творцаў – першага з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы – надзвычай вялікі.

Стар. 4

Загадка Міхася Стральцова

У яго таленце адмыслова спалучаліся лірызм, псіхалагізм, інтэлектуальнасць.

Стар. 7

Леапард на балконе

Героі рамана Міхася Южыка – нашы з вамі сучаснікі.

Стар. 8 – 9

Шапавальства

Свае майстры не звяліся.

Стар. 14

Сёння – апошні дзень падпіскі на студзень

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 8150 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 11070 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5460 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 8660 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

У Новы год — з новымі творамі!

Фота Кастуся Дробава

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее,
сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць.
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

Максім БАГДАНОВІЧ

Пункцірам

• Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Шчамялёва знаёміла прыхільнікаў фатаграфіі з выстаўкай фотамастака Аляксея Брагіна "Мамаі — квадратны кіламетр шчасця". Творчая палітра аўтара не абмежавана пэўным відам тэхнікі: ён здымае на плёнку і лічбавым фотаапаратам, звяртаецца да чорна-белых і каляровых фотаздымкаў. У экспазіцыі — работы А. Брагіна за апошнія пяць гадоў. У асноўным, гэта жанравая фатаграфія: партрэт, нацюрморт, пейзаж. Большасць прац прысвечана любімаму месцу аўтара — вёсцы Мамаі Вілейскага раёна. Квадратны кіламетр прасторы, на якой месціцца толькі некалькі хат беларускай вёскі, заключае ў сабе блізкае кожнаму пяцідзе малой радзімы, раскрываючы ў той жа час адну з вечных тэм сусветнага мастацтва.

• Беларусь і Францыя плануюць наладзіць абмен гістарычнымі фотавыставамі. Як паведамляе БелТА, такая тэма абмяркоўвалася падчас сустрэчы дырэктараў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі ВАВ Сяргея Азаронка і Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" Валерыя Губарэнкі з кіраўніком Музея Арміі "Дзяржаўны Дом інвалідаў" у Парыжы генералам Робертам Брэсам. Адбылося таксама наведванне Ваеннага мемарыяла ў горадзе Кан, дзе дырэктары абмеркавалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, узаемнага абмену экспанатамі і правядзення сумесных выставачных мерапрыемстваў.

• Фільм ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан "Дзверы" ўвайшоў у лік дзесяці стужак, якія прэтэндуюць на атрыманне прэміі "Оскар" у катэгорыі "найлепшы кароткаметражны мастацкі фільм". У аснову сюжэта пакладзены "Маналог пра цэлае жыццё, напісаны на дзвярах" — гісторыя з кнігі "Чарнобыльская малітва" Святланы Алексіевіч. Фільм здымаўся ў Прыпяці, за некалькі кіламетраў ад чарнобыльскага рэактара. Цырымонія ўручэння прызоў амерыканскай Акадэміі кінамастацтваў пройдзе 7 сакавіка 2010 года.

• Свет пабачыў аўдыёдыск "Тузін. Перазагрузка". На дыск увайшлі 12 беларускамоўных песень айчынных выканаўцаў, якія спяваюць на замежных мовах. Іх хіты былі перакладзены на беларускую Алесем Камоцкім, Віталем Воранавым, Глебам Лабадзенкам, Сяргеем Балахонавым, Андрэем Хадановічам, Віктарыяй Дашкевіч. Сярод выканаўцаў — Дакота, Юрый Дземідовіч, Сяргей Пукст, гурты Atlantica, Naka, "Нестандартны варыянт", "Серебряная свадьба", "Сердце дурака", "Стокс", Hair Peace Salon, Tanin Jazz, Da Vinci.

• На тэлеканале "Лад" стартаваў новы праект "Альбарутэнія". Ён прысвечаны гісторыі Беларусі. Гэты цыкл праграм працягвае гістарычную тэматыку, пачатую праектам "Жарсць і ўлада". Albaruthenia — назва нашай краіны, якую можна пабачыць на картах Сярэднявечча. Аўтары праекта выкладаюць гістарычныя падзеі ў кантэксце іх уплыву на лёс Беларусі і наадварот — разглядаюць уплыў Беларусі на галоўныя сусветныя гістарычныя падзеі.

• Днямі відэакомплекс "Цэнтр-відэа" ладзіў прэм'ерны паказ двух дакументальных фільмаў на актуальныя для нашага часу тэмы. Першы, "Мары і слёзы" (аўтар сцэнарыя і рэжысёр Юрый Цімафееў), прысвечаны адной з сацыяльных праблем — гандлю жанчынамі і сексуальнаму рабству. Другая стужка — "Знайсці каханне" (аўтар сцэнарыя і рэжысёр Аляксандр Бондараў). Яе гераіня — дзяўчына Алена, былая выхаванка школы-інтэрната для дзяцей з запаволеным развіццём, ад якіх адмовіліся бацькі, для дзяцей, якія пазбаўлены любові і асабліва востра адчуваюць несправядлівасць. У кожнага з іх свой лёс. Фільм распавядае пра сённяшні дзень школы-інтэрната, пра тое, як склалася жыццё Алены і як яна ўладкавалася ў грамадстве.

Падрыхтавалі
Павел РАДЫНА і Віктар ЗАЯЦ

Наступны нумар "ЛіМа" выйдзе 6 студзеня.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Зачын на будучае

Так павялося: снежань для творцаў — не толькі месяц падагульненняў. А і — добрага зачыну на год наступны. Ды і не толькі на год — спланаванае на будучае прапісваецца ў ім наступнымі рэальнымі справамі. Пра тое, чым жылі айчынныя літаратары ў гэты год, якія клопаты былі ў іх галоўнымі, распавядае старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. Дарэчы, пры канцы года, падчас святкавання 10-годдзя Саюзнай дзяржавы Мікалай Іванавіч атрымаў Ганаровую грамату Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.

—На схіле адыходзячага года можна вылучыць тыя кірункі дзейнасці, дзе ў нас удалося нешта рашыць, а дзе — не атрымалася.

Нам удалося ўмацаваць сваю арганізацыю. Шмат вопытных літаратараў выйшлі з Саюза беларускіх пісьменнікаў і прыйшлі да нас. Агульная колькасць іх — звыш 200 чалавек.

З міністэрствамі інфармацыі, культуры, адукацыі, Мінскім гарвыканкамам мы змаглі дапрацаваць умовы конкурсу на лепшы твор года. Павялічылі колькасць намінантаў, упершыню ўзнагароджваліся калектывы аўтараў. Скажам, паэт, кампазітар і выканаўца песні. Шляхам цэлага шэрага конкурсаў мы змаглі да творчасці далучыць плеяду маладых паэтаў, празаікаў.

— Да таго ж з'явіліся два новыя конкурсы для маладых...

— Так, мы ставілі мэту — максімальна прыявіць увагу да моладзі. Стварылі, акрамя секцыі па дзіцячай літаратуры, Савет па працы з маладымі аўтарамі. Сталі працаваць з тымі літаратурнымі аб'яднаннямі, якія маюцца пры ВНУ, у розных рэгіёнах, гарадах. І выйшлі на дадатковыя два літаратурныя конкурсы. Па іх выніках рашылі выдаць дзве кнігі. Пакрысе разварочваецца праца секцыі па літаратурнай крытыцы. Мы хочам дабіцца, каб крытыка была справядлівай, у добрым сэнсе жорсткай. Каб указвалі аўтару на яго недахопы. Але з пункта гледжання таго, як зычліва падказаць, звярнуўшы ўвагу на недапрацоўкі.

Я б адзначыў прадуктыўную працу нашых абласных і Мінскай гарадской пісьменніцкіх арганізацый. У Гомельскай абласной арганізацыі на чале з Уладзімірам Гаўрыловічам выдаюць свой альманах, які так і называецца: "Часопіс Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі". Там друкуюцца цікавыя творы, і робіцца ён на ўзроўні рэспубліканскім. У гэтым плане бачу неабходнасць аказаць садзеянне буйнейшай мінскай гарадской арганізацыі і звярнуцца да мінскіх уладаў, каб горад меў свой часопіс альбо альманах.

Цяпер больш адбываецца сустрэч у школах, ВНУ. Тут трэба адзначыць Віцебскую арганізацыю, Тамару Краснову-Гусачэнку. Добрыя паэтычныя вечарыны правялі нашыя калегі з Брэсцкай вобласці на чале з Анатолем Крэйдзічам. Шэраг іх конкурсаў і вечарын можна лічыць узорнымі.

Нашы прапановы добра былі ўспрынятыя і ў дзяржаўных органах. Асабліва што датычыць пашырэння прасторы беларускай мовы. Нас падтрымалі ў кірунку стварэння ў музеях Мінска і Гомеля экспазіцый, прысвечаных творчасці Васіля Быкава, іншых пісьменнікаў. У плане ўмацавання беларускай мовы Прэзідэнт Беларусі падтрымаў прапанову, каб усе паселішчы называліся па-беларуску.

На будучае мы плануем арганізаваць больш конкурсаў па розных напрамках. Ідзе знамянальная дата — 65-годдзе Вялікай Перамогі над фашызмам, варта звярнуць увагу на літаратуру па Вялікай Айчыннай вайне, творы пра сучаснае жыццё моладзі, на літаратуру пра жыццё ў новых умовах у беларускай глыбінцы. Трэба паказаць, што там не толькі ўдумлівыя аграномы і спецыялісты высокага класа, але людзі жывуць, кахаюць. Здараюцца праблемы, драмы. Не лішнімі будуць конкурсы сярод студэнтаў. У гэтым кірунку плануем шэраг праектаў з Міністэрствам адукацыі Беларусі.

Мы зрабілі добрую заяўку ў развіцці секцыі сатыры і гумару. Сёлета, маючы вялікую колькасць гумарыстаў і сатырыкаў, спрацавалі недастаткова.

Пісьменнікі ў гэтым годзе выдалі больш кніг, чым летась (агульная колькасць — больш як 200 назваў).

З выдавецтвам "Харвест" ажыццяўляем далей выданне серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі". Яна мае вялікі рэзананс. Больш як 30 пісьменніцкіх арганізацый розных дзяржаў, нават праз пасольствы звярталіся да нас, каб даслалі ім гэтую серыю. І 12 тамоў сучаснай беларускай фантастычнай і прыгодніцкай прозы выклікалі шырокую чытацкую ўвагу.

Яшчэ адзін творчы праект — вярнуць на радзіму імёны беларусаў, якія багата зрабілі для ўсяго свету. У нас маюцца звесткі пра паўтары тысячы такіх асоб. Многім, відаць, будзе цікава даведацца, што Пацёмкін і Пржэвальскі — выхадцы з Беларусі, што Аляксандр Грын — карэннямі таксама з Беларусі. Што Яўген Бурачэк з Магілёўскай вобласці заснаваў горад Уладзівасток, што на кінастудыі павінна з'явіцца шыльда першаму мультыплікатару Уладзіславу Старэвічу, які таксама нарадзіўся ў Беларусі. Унікальны свет гэтага творцы не мае аналагаў. У Англіі пастаўлены тэлефільм пра Старэвіча, прагляд яго адбыўся ў Варшаве, Вільнюсе, Рызе, Эдзінбургу, Кракаве. А ў нас — не было. А чалавек варты ўшанавання!

— Гэта што датычыць нашай самасвядомасці. А што робіцца для таго, каб пра сучасную творчасць беларускіх літаратараў ведалі па-за межамі краіны, як наладжваюцца міжнародныя стасункі?

— Мы гатовыя супрацоўнічаць з іншымі краінамі. Шмат для Беларусі зрабілі тыя ж расіяне, выхадцы з нашай старонкі. І мы гатовыя дапамагчы ўсім краінам вярнуць добрыя імёны іх суайчыннікаў, тых, хто праслаўляў свой край. Вось, легендарны генерал Ліпарскі, выхадзец з Беларусі, — унікальнейшы чалавек! Ён у 73 гады камандаваў рудні камі, куды ссылалі дзекабрыстаў, і стварыў ім больш-менш прыстойныя ўмовы, туды дазволілі прыехаць жонкам, большасць вязняў хадзілі без кайданоў і да т.п. Мы ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правялі першыя сустрэчы з кіраўнікамі інстытутаў і пагадзіліся з тым, што трэба пачынаць сумесную працу.

— Калі згадваць праекты на будучае, то хочацца звярнуць увагу і на іншае. У Расіі некалькі год ужо працуе нацыянальная праграма падтрымкі чытання. Тут і праблемы мовы рашаюцца, і выданні ды распаўсюджванне кніг, і цэн на кнігі. Магчыма ініцыіраванне падобнага праекта ў Беларусі?

— Бясспрэчна. Але трэба падумаць, што нам перашкаджае. Зараз у цяжкім становішчы кнігарні краіны. Яны павінны будуць выплачваць арэндную плату ў 10 разоў большую, чым сёння. Будзем звяртацца да ўладаў з просьбай разгледзець гэта архіважнае пытанне. Бо і цяпер дзейнічаюць гандлёвыя нацэнкі на кнігі, калі іх яшчэ павялічыць — пра якую падтрымку чытання мы зможам гаварыць? Яшчэ да канца года мы звернемся з пісьмом у адпаведныя ўстановы.

Але пра чытанне можна гаварыць, і калі збіраюцца людзі па інтарэсах. Да прыкладу, аматары гістарычнай літаратуры, тых жа дэтэктываў, класікі альбо фантастыкі. Запрасіць на такія сустрэчы пісьменнікаў, а можа, і стужку якую паказаць. Нездарма мы заключылі дамову з саюзамі кінематаграфістаў, кампазітараў. Разам хутчэй вырашым праблемы.

— Неабходна гаварыць і пра тое, як прысутнічае пісьменнік у сучасным грамадстве...

— Так, трэба ўзнімаць аўтарытэт пісьменніка. І шляхам далучэння да грамадскага жыцця, і ўдзелу ў бліжэйшых выбарах мясцовых органаў улады. Чаму б на месцах не разгледзець магчымасць і падтрымаць пісьменнікаў, каб яны былі вылучаныя ў кандыдаты?

— У Расіі 2010-ты — Год культуры Беларусі. Як у ім будуць удзельнічаць пісьменнікі?

— Сёлета мы ўтварылі Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Маюцца і яго прыхільнікі, і крытыкі. Мы хочам, каб гэты год стаў годам узбагачэння культур. Каб кнігі беларускіх аўтараў выдаваліся ў Расіі, а расійскія — у нас. А калі мы здзейснім сумесныя праекты, такія, як, прыкладам, выданне 50-томніка твораў пісьменнікаў Беларусі і Расіі, альбо святкаванне агульных дат, як Дзень Перамогі, альбо святкаванне юбілеяў нашых класікаў, будзе вельмі добра!

— Адным з пунктаў святкаванняў магло б стаць урачыстае адкрыццё помніка Янку Купалу ў Маскве. Гэтае пытанне творцы ўзнімалі неаднойчы...

— Так атрымалася, што ў цэнтры Масквы стаіць выдатнейшы помнік. Побач са школай. Але адкрыцця яго не зрабілі. Лічу, што такія помнікі павінны адкрывацца ўрачыста. Тым больш, што на помніку напісана: "Дар Рэспублікі Беларусь жыхарам Масквы". Неабходна вярнуцца да пытання, і, сапраўды, урачыста адзначыць гэту падзею.

Рыта СТАХ

На здымку: Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў віншуюць старшыню СПБ Мікалая Чаргінца з узнагародай.

З нагоды

«Салют» — «Вожыку»

"Вожык" умее смяяцца сам, умее смяшыць і іншых. А для гэтага ў яго маецца цэлы арсенал "смехавыбуховых" сродкаў: верш, байка, гумарэска, фельетон, дасціпны жарт. Але найбольш дзейсная ў гэтым арсенале карыкатура. Яе фарбамі і штрыхамі смяялася не адно пакаленне айчынных мастакоў-карыкатурыстаў.

Школа беларускай карыкатуры даўняя і сур'ёзная. Уласна вожыкаўскі яе стаж пачынаецца з 1941 года — з часу выхаду газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», з якой у 1945 годзе і нарадзіўся часопіс сатыры і гумару «Вожык» (з другой паловы 2009 года — альманах сатыры і гумару).

Варта толькі ўявіць, колькіх карыкатурыстаў за гэты час браславіла выданне ў дарогу. Колькі мастакоў выхоўваліся, раслі творча, падтрымліваліся часопісам. Колькі кніжак карыкатур выйшла ў «Бібліятэцы «Вожыка». «Вожык», сапраўды, стаўся энцыклапедыяй беларускай карыкатуры.

Таму і не дзіўна, што ў сценах рэдакцыі выспеў своеасаблівы праект выставы вожыкаўскай карыкатуры. Яго падтрымала кіраўніцтва «Кінавідэапраката» Мінгарвыканкама (у прыватнасці, хочацца асабліва падзякаваць дырэктару гэтай установы Васілю Коктышу). Свой старт выстава ўзяла ў новым, сучасна абсталяваным сталічным кінатэатры «Беларусь» у снежні мінулага года. А потым пасмяяцца разам з «Вожыкам» мелі магчымасць гледачы кінатэатраў «Дом кіно», «Кастрычнік». (Дарэчы, у «Кастрычніку» экспазіцыя вожыкаўскіх сатырычных і гумарыстычных малюнкаў абнаўлялася тройчы.)

І вось новы яе адрас — сталічны кінатэатр «Салют». Тут усе жадаючыя змогуць пабачыць лепшыя работы вядомых майстроў беларускай сатырычнай графікі — Сяргея Волкава, Аляксандра Каршакевіча, Міколы Гіргеля, Алега Папова, Пятра Козіча, Аркадзя Гурскага, Алега Гуцола, Андрэя Слуцкага, Анатоля Гармазы ды іншых слынных мастакоў-карыкатурыстаў.

Кастусь КАМЕЛЬ

Яго жыццё — творчасць

Літ-абсягі

Творчасць Івана Чыгрынава — выдатная з'ява ў беларускай і ўсёй еўрапейскай літаратуры. Яго раманы нельга чытаць без хвалявання і сёння, калі прайшло ўжо амаль 65 гадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны. Безумоўна, тут і пісьменніцкі талент, і тое, што лёс нашага народа пранізаны той вайною наскрозь.

Сам Іван Чыгрынаў зазначыў: "Вайна была самай галоўнай падзеяй у маім жыцці. І не толькі ў маім. Чалавек у ёй быў як на далоні. І сама па сабе філасофія вайны цікавая для пісьменніка. У ёй усё праяўляецца. І чалавек, які ён ёсць, і сістэма, і лад, і традыцыі. Сапраўды ўсё праяўляецца. Найбагацейшы матэрыял для роздуму. Гісторыя вайны — не толькі вопыт, але і навука. Шкада, што мы дрэнна вучымся, здавалася б, у жыцці, у гісторыі нашай усё было. Усякага хапала. Але шмат што паўтараецца".

Так, усіх тых, хто пажадаў дакрануцца да творчага лёсу празаіка, драматурга, народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры ладзіў вечар памяці "Літаратура — маё жыццё, мой лёс...", які адбыўся ў рамках сацыяльна-культурнага праекта "Чалавек нараджаецца, каб жыць" (да 65-годдзя вызвалення Беларусі і перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне).

Сярод гасцей вечарыны — жонка Людміла Прохараўна і сваякі, сябры, пісьменнікі, даследчыкі, студэнты...

У сваім выступленні Дзмітрый Бугаёў распавёў пра чуласць, чалавечнасць і дзелавітасць І. Чыгрынава. Анатоль Вярцінскі зрабіў акцэнт на Чыгрынаве-паэце. Таксама пра творчы лёс і жыццёвы шлях пісьменніка расказвалі творцы Раіса Баравікова, Генадзь Бураўкін, Віктар Казько, Арсень Ліс, Алесь Марціновіч, Уладзімір Скарынкін, Анатоль Бутэвіч. Да іх далучыліся акцёры Марыя Захарэвіч і Эдуард Гарачы.

Колькі цёплых і шчырых слоў пра свайго земляка сказаў намеснік міністра інфармацыі нашай краіны Аляксандр Слабадчук. Ён зазначыў, што быў знаёмы з Іванам Гаўрылавічам з першага курса вучобы на факультэце журналістыкі БДУ, узгадаў некаторыя эпізоды з іх агульнага знаёмства, адзначыўшы дабрыню і талент народнага пісьменніка.

Таксама супрацоўнікі музея з дапамогай Людмілы Прохараўны падрыхтавалі выстаўку арыгінальных ды перакладных кніг і асабістых рэчаў пісьменніка.

Час няўмольна бяжыць наперад. Няма народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава, але засталіся яго творы, плён напружанай працы. Творчасць пісьменніка скіравана на тое, каб чытач Беларусі ў гады яе новага адраджэння як мага хутчэй далучыўся да асноўных вехаў яе гісторыі.

У адным з інтэрв'ю ў Івана Гаўрылавіча запыталіся: "Вы аптыміст?", і ён адказаў: "Так, аптыміст. Хоць часам ад суму няма куды падзецца. Але будзем жыць...". Сапраўды, наша жыццё працягваецца. А жыццё творцы працягваецца ў тым, што ён тварыў. Для пісьменніка — у кнігах, у якіх мы можам адкрываць свет не толькі аўтара і яго герояў, але адкрываць і саміх сябе.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: выступае Дзмітрый Бугаёў.

Фота Кастуся Дробава

З-пад пяра

Рэспубліканскі конкурс "Рака майго дзяцінства", які праходзіў у рамках Года роднай зямлі і абвешчанага ААН Міжнароднага дзесяцігоддзя "Вада для жыцця" (2005 — 2015 гг.), завяршыўся. Кампетэнтнае журы разгледзела 650 творчых работ. Узнагароджанне пераможцаў прайшло ў сценах музея "Водныя рэсурсы Рэспублікі Беларусь". Перамаглі ў намінацыях "Проза" Ганна Лябікава, "Паэзія" — Віктар Мянчэня, "Мастацкі фотаздымак" — Дзмітрый Фёдараў, "Фальклор" (за гісторыка-краязнаўчае даследаванне) — Вера Крэчка. Спецыяльнымі дыпломамі Прадстаўніцтва ААН у Беларусі адзначаны Іван Зарэмба (за апавяданне "Рака майго дзяцінства"), Аляксандр Якавенка (за вершы "Рака майго жыцця" і "Яе Вялікасць вада"), Кацярына Сасно (за гісторыка-культурны нарыс "Янка — калыска майго дзяцінства") і Кацярына Хадасевіч-Лісавая (за цыкл легенд пра азёры Мядзельскай групы). Магчыма, конкурс стане штогадовым і ў ім прыме ўдзел яшчэ больш таленавітых аўтараў. Мэта такіх мерапрыемстваў адна — праз творчыя работы, надрукаваныя ў СМІ, звярнуць увагу грамадства на праблемы захавання і ўзбагачэння прыродных рэсурсаў нашай краіны.

Бажэна СТРОК

У Чэрвеньскім раённым краязнаўчым музеі адбылася прэзентацыя кнігі Івана Ярашэвіча "Чэрвеншчына: гісторыя ў тапонімах". Дырэктар СШ N 1 г.п. Смілавічы і апантаны краязнаўца, Іван Паўлавіч доўгія гады вядзе збор матэрыялаў пра паходжанне назваў паселішчаў старажытнай Ігуменшчыны (раней горад Чэрвень называўся Ігуменам і быў сталіцай Ігуменскага павета Мінскай губерні). Кніга тапанімічных эцюдаў пабачыла свет у РВУ "Літаратура і Мастацтва", ужо з'явіліся ў друку першыя водгукі на гэтае адмысловае выданне. А на прэзентацыі ў мясцовым музеі развагамі пра плён працы настаўніка і краязнаўцы падзяліліся член Саюза пісьменнікаў Беларусі Генадзь Аўласенка, настаўнік-пенсіянер Уладзімір Дарагуж і іншыя цікаўныя да гісторыі і асветніцтва жыхары Чэрвеня. Ішла размова і пра тое, што літаратуры такога кшталту не стае, і вельмі добра, што з'явілася яшчэ адна кніжная гісторыка-тапанімічная "ластаўка". Будзем спадзявацца, што і РВУ "Літаратура і Мастацтва" працягне выдавецкую дзейнасць у гэтым кірунку.

Дар'я ШОЦІК

Ёлачныя ўпрыгажэнні 50 — 70 гадоў мінулага стагоддзя можна будзе ўбачыць з заўтрашняга дня на выстаўцы "Чароўная ёлка" ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне. Гэта шкляныя выдуўныя цацкі, так званыя мантажныя і цацкі з пап'е-машэ, фольгі і кардону, а таксама тыпова рускія ўпрыгажэнні — шкляныя пацеркі. А вось увагу юных наведвальнікаў, безумоўна, прыцягнуць фігуркі казачных персанажаў і экзатычных птушак — іх прымацоўвалі да ёлачных галінак спецыяльнымі прышчэпкамі. Не могуць не выклікаць захапленне ў наведвальнікаў шкляныя звяркі, садавіна ды гародніна, грыбы ды самавары, казачныя хаткі ды мудрагелістых форм ледзяшы. І тое не дзіўна, бо сённяшнія ёлкі ўпрыгожваюцца ў асноўным шарамі розных памераў. Таму сустрэча з яркімі, вельмі добрымі і вясёлымі цацкамі падорыць хлопчыкам і дзяўчынкам незабыўныя ўражанні, а дарослым дасць магчымасць яшчэ раз вярнуцца ў сваё дзяцінства.

Ул. інф.

Арт-лінія

Сугучча талентаў

Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі існуе ўжо другое дзесяцігоддзе. Увесь гэты час фонд падтрымлівае самых таленавітых прадстаўнікоў нашай краіны. Сёння лаўрэаты і стыпендыяты фонду атрымліваюць адукацыю і паспяхова гастралююць па ўсім свеце.

У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі адбыўся адмысловы канцэрт "Ступені творчасці". Ён ладзіўся ў рамках праекта "Маладыя таленты Беларусі". Усе яго ўдзельнікі — стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі: Вольга Сцяжко, Анастасія Масквіна, Аксана Волкава і Ілья Сільчукоў. Музычны кіраўнік і дырыжор канцэрта — Вячаслаў Воліч.

У першым аддзяленні прагучалі творы В. А. Моцарта — уверцюра да оперы "Выкраданне з сераля" ў выкананні аркестра тэатра і Канцэрт № 25 для фартэпіяна з аркестрам. Саліравала Вольга Сцяжко. Дарэчы, Вольга — адна з першых стыпендыятаў фонду, лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў. Першае канцэртнае выступленне піяністкі адбылося ў 8 гадоў на сцэне беларускага тэатра оперы і балета, годам пазней — міжнародны дэбют у Акадэміі музыкі ў Беластоку (Польшча), а два гады таму — дэбют у Карнегі-Холе (Нью-Йорк, ЗША). Вольга Сцяжко выступае з сольнымі праграмамі і ў якасці салісткі з аркестрам, у складзе камерных ансамбляў з калектывамі Польшчы, Германіі, Расіі, Харватыі, Італіі, Славеніі, Вялікабрытаніі, Іспаніі. Сёння яна — аспірант і стыпендыят Лонданскай Каралеўскай Акадэміі.

У другім аддзяленні выступілі салісты тэатра оперы і балета Беларусі. Анастасія Масквіна (сапрана) — дыпламант і лаўрэат нацыянальных і міжнародных конкурсаў, уладальніца медаля Францыска Скарыны за выбітныя творчыя дасягненні, высокае прафесійнае майстэрства і за заслугі ў развіцці нацыянальнай культуры і мастацтва — выканала арыі з опер "Русалка" (А. Дворжак) і "Трубадур" (Д. Вердзі). Адна з самых яркіх і таленавітых маладых выканаўцаў беларускай оперы Аксана Волкава (мецца-сапрана) — таксама дыпламант і лаўрэат разнастайных нацыянальных і міжнародных конкурсаў вакалістаў, двойчы была стыпендыятам фонду, уладальніца медаля Францыска Скарыны. У яе выкананні прагучалі арыі з опер "Уяўная садоўніца" (В. А. Моцарт), "Самсон і Даліла" (К. Сен-Санс), "Сельскі гонар" (П. Масканьі) і фрагмент з оперы "Дон Карлас" (Д. Вердзі). Каваціну Фігара з оперы "Севільскі цырульнік" (Д. Расіні), арыю Кізгайлы з оперы "Сівая легенда" (Д. Смольскі) і арыю Жэрмона з оперы "Травіята" (Д. Вердзі) выканаў Ілья Сільчукоў (барытон). Ілья — лаўрэат Гранд-прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэат прэстыжных міжнародных конкурсаў вакалістаў.

Віктар ЗАЯЦ

На здымку: Ілья Сільчукоў.

Фота аўтара

Повязі

Купала і Колас у Польшчы

Адам Міцкевіч, Тадэвуш Касцюшка, Станіслаў Манюшка, Напалеон Орда — асобы, якія нямала зрабілі для развіцця сусветнай культуры, асабліва блізкія яны беларускаму і польскаму народам. Пра тое, што нашы культуры аб'ядноўвае вельмі шмат, безліч агульных праектаў і напарадзе — гаварылася на мінулым тыдні ў Мінску. У нашай краіне знаходзілася дэлегацыя Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча на чале з міністрам Богданам Здраеўскім.

Цяпер паміж нашымі краінамі дзейнічаюць пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, аховы гісторыка-культурнай спадчыны ды іншыя дакументы, якія складаюць прававую базу, на падставе якой будуюцца адносіны паміж дзяржавамі. Наступны год у нашай краіне аб'яўлены Годам Фрыдэрыка Шапэна. З гісторыі вядома, што Шапэн сябраваў з Напалеонам Ордам, яго музычныя зборнікі былі вельмі папулярныя ў магнацкіх дамах у Мінску, Оршы ды іншых гарадах Беларусі.

У Беларусі да 200-годдзя кампазітара будзе праведзены шэраг мерапрыемстваў. Перадусім — канцэрты ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, у абласных філармоніях. Абмяркоўвалася пытанне пастаноўкі оперы ў Вялікім тэатры оперы і балета, правядзення адпаведных міжнародных канферэнцый, цікавых акцый у музычных школах. Да ўсяго, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам прынята рашэнне аб наданні імя Фрыдэрыка Шапэна школе мастацтваў № 3. Плануецца таксама сумесны ўдзел дзвюх краін у святкаванні 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Плануецца ўзаемадзеянне двух міністэрстваў культуры Беларусі і Польшчы і прапануецца такі падыход для міністэрстваў Украіны і Літвы. Зацікаўленыя дзяржавы таксама ў актывізацыі кантактаў на ўзроўні нацыянальных устаноў культуры, нацыянальных бібліятэк, нацыянальных мастацкіх музеяў.

Гаварылася на выніковай прэс-канферэнцыі па выніках наведвання нашай краіны польскімі прадстаўнікамі культуры і пра магчымасць устанаўлення ў іх дзяржаве помнікаў беларускім класікам Янку Купалу і Якубу Коласу.

Міністр культуры Польшчы Богдан Здраеўскі пацвердзіў станоўчыя намеры польскага боку. Паводле яго слоў, рэшэнне па гэтым пытанні будзе прымаць мэрыя Варшавы, і хутчэй за ўсё гэтая справа будзе завершана пазітыўна. Міністр культуры Беларусі Павел Латушка дадаў: гэта будзе важным элементам, які падкрэсліць супольнасць беларускай і польскай культур, іх прыналежнасць да культуры агульнаеўрапейскай. І стане добрым знакам супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: міністр культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча Богдан Здраеўскі і міністр культуры Беларусі Павел Латушка.

Фота Кастуся Дробава

Сёлета на пачатку снежня ў Мінску адбыўся першы з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Форуму належала адыграць гістарычную ролю — стварыць пісьменніцкую карпарацыю дзвюх суседніх краін — Расіі і Беларусі. Іншымі словамі — утвараліся першая грамадская арганізацыя Саюзнай дзяржавы, творчая супольнасць. І дэбаты на з'ездзе пра тое, якой ёй быць, напэўна, распачалі доўгачаканы дыялог літаратараў.

У звароце Першага з'езда пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы да творчай інтэлігенцыі, пісьменнікаў Беларусі і Расіі гаворыцца: "Саюз мае на мэце, выкарыстоўваючы вялікі творчы патэнцыял літаратараў дзвюх краін, зрабіць вялікі ўнёсак у далейшае духоўнае развіццё грамадства, у стварэнне моцных незалежных дзяржаў Расіі і Беларусі; захоўваць і прапагандаваць высокія мастацкія каштоўнасці, створаныя народамі за шматвекавую гісторыю і якія знайшлі сваё адлюстраванне ў бессмяротных творах Пушкіна і Дастаеўскага, Гогаля і Шолахава, Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага і Францыска Скарыны, Францішка Багушэвіча і Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа і іншых вялікіх пісьменнікаў дзвюх краін...; садзейнічаць стварэнню новых таленавітых літаратурных твораў, аказваць усялякую падтрымку творчай моладзі; ствараць умовы для далейшага паступовага развіцця літаратурнага працэсу ў дзяржавах; будаваць канструктыўныя адносіны з творчымі саюзамі дзвюх краін, а таксама міжнароднымі літаратурнымі арганізацыямі, якія падзяляюць нашы ўяўленні пра духоўнасць і маральнасць...".

Рэзананс ад форуму творцаў вялікі. Яго падтрымліваюць, цікавяцца падрабязнасцямі прыняцця рашэнняў, падзяляюць думкі альбо дыскутуюць з прамоўцамі. На з'ездзе гучала шмат меркаванняў. Выказана і важкае слова прадстаўнікоў улады, ёмкае і канструктыўнае — арганізатараў форуму, мастацкае — майстроў прыгожага пісьменства. У гэтым нумары мы друкуем некаторыя выступленні пісьменнікаў Беларусі, якія перадаюць атмасферу, што панавала на форуме. Імёны творцаў беларускаму і рускаму чытачу добра знаёмыя, іх літаратурная дзейнасць адзначана Дзяржаўнымі прэміямі Рэспублікі Беларусь.

Дзеля захавання маральных каштоўнасцей

Новы падмурак — для новага

Раіса БАРАВІКОВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць

— Нярэдка кажуць, што ўсялякае новае — гэта добра забытае старое, але, відаць, не да ўсяго гэты выраз падыходзіць.

Абдумваючы сваё выступленне на гэтым пісьменніцкім з'ездзе, міжволі задумалася: з чаго ж мне пачаць? Ну, вядома, з класікі, а найлепш з кнігі, якую і не трэба было доўга шукаць сярод кніжных паліц маёй хатняй бібліятэкі. Мікалай Рубцоў — класік рускай паэзіі, яго "Звезда полей" другая па ліку кніжка, выдадзеная пры жыцці паэта невялікім тыражом, якая сённяшнім часам даўно ўжо стала рарытэтам. Для мяне гэтая кніжка асабліва каштоўная. Я атрымала яе ад самога Мікалая Рубцова з вельмі прыхільным надпісам: "Рае, как всегда с любовью от автора. Москва, 19-68 год". І як тут не ўразіцца! 1968 год! Прайшло чатыры дзесяцігоддзі, а ў памяці так ясна можна ўсё аднавіць, ды і вершы з гэтай кніжкі многія помняцца на памяць. Як, дарэчы, і вершы маіх аднакурснікаў па Літаратурным інстытуце ў Маскве: Ігара Ляпіна, Васіля Макеева, Раісы Раманавай, ці таго ж цудоўнага расійскага паэта Анатоля Перадрэева... Ёсць рэчы, над якімі час — не ўладар і разам з тым: сорак адзін год прайшоў з таго ўжо такога далёкага 1968!

І якія змены адбыліся за гэты час! Адна эпоха змяніла другую, і ўжо даўно няма той агульнай дзяржавы — СССР. На карце свету ёсць Расія і з'явілася новая незалежная краіна Рэспубліка Беларусь, якая мацуе сваю незалежнасць і адпаведна абсталёўваецца, а гэта: свая гісторыя, мова, культура, літаратура, традыцыі народа, што перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Калі валіцца, разбураецца нейкі дом, дбайны, руплівы гаспадар нічога не аднаўляе і не будуе на руінах. Ён проста пачынае ўзводзіць новы дом на новым падмурку. Адно, імкнецца, каб гэты дом быў лепшым. Мяркую, што ў нас ёсць магчымасць пабудаваць гэты дом выключна на тым самым новым падмурку, сыходзячы з інтарэсаў літаратур двух блізкіх народаў.

На беларускім Палессі, на Піншчыне ёсць музей Аляксандра Блока, а ў краязнаўчым музеі Яраслаўля — не адзін стэнд аддадзены жыццю і творчасці Максіма Багдановіча. Хіба гэта не падстава для правядзення ў гэтых мясцінах сумесных Святаў паэзіі? Шмат гадоў у Маскве жылі класікі нашай беларускай літаратуры Канстанцыя Буйло і Уладзімір Дубоўка. Не адно пакаленне беларусаў вырасла на іх класічных радках: "Люблю мой край, старонку гэту, дзе я радзілася, расла"... (К. Буйло) і "О, Беларусь, мая шыпшына"...(Ул. Дубоўка). У радках — пачуцці, знаёмыя ўсім народам, дык, напэўна, трэба цяпер паклапаціцца, каб на тых дамах у расійскай сталіцы, дзе жылі класікі беларускай літаратуры, з'явіліся мемарыяльныя дошкі. А наш вялікі пясняр Янка Купала! Некалькі гадоў таму ў Маскве быў пастаўлены помнік нашаму класіку, а ці было ўрачыстае адкрыццё помніка, ці былі там, на гэтым адкрыцці, беларускія пісьменнікі, якія хацелі б там пакланіцца свайму генію?

Як бачна, у нас можа быць шмат агульных спраў, вырашыць якія могуць пісьменнікі, наша агульная пісьменніцкая супольнасць.

Мне спадабалася выступленне Альберта Ліханава і ў мяне таксама ёсць цалкам практычная прапанова. На любых кантынентах, у любых краінах свету заўжды вялікай папулярнасцю карыстаецца літаратура для дзяцей. Лічу, што гэта магчыма, каб нашым першым сумесным праектам стаў двухтомнік сучасных аўтарскіх казак. Адзін том твораў рускіх пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову, другі — беларускія пісьменнікі дзецям у перакладах на рускую мову.

Літаратура — справа рухомая. У гэты працэс уліваюцца ўсё новыя і новыя пакаленні, у літаратуру прыходзіць творчая моладзь. Хочацца думаць, што, дзякуючы агульнаму клопату і намаганням, будуць адкрывацца і новыя імёны, і цікавыя творы — праз узаемныя пераклады. А самае галоўнае, каб пры ўсім гэтым прысутнічала павага і разуменне, што кожная з нашых літаратур — вялікая літаратура і што мы, пісьменнікі, працуем на духоўны росквіт сваіх краін, на росквіт сваёй мовы і культуры.

Памяць роднай зямлі

Алесь САВІЦКІ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны

— Гісторыкі будучага, вывучаючы пачатак XXI стагоддзя, бясспрэчна, звернуць асаблівую ўвагу на падзеі, якія адбываюцца тут, у зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе пісьменнікі Расіі і Беларусі стварылі творчы Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, каб яшчэ больш эфектыўна змагацца супраць рабаўнічага дэмантажу духоўнасці нашых народаў, пагібельнага спаўзання ў чорную прорву, імя якой — БЯСПАМЯЦТВА.

Ёсць Памяць розуму. Ёсць Памяць сэрца. А самая надзейная і трывалая — гэта Памяць зямлі. Але зямлі вольнай, таму што ў зямлі заваяванай, якая скарылася перад чужаземцам, Памяці няма. Яна вынішчаецца, выпальваецца дарэшты захопнікамі.

Вельмі дакладна гаворыцца пра гэту Памяць у адной з нашых песень "Лясныя абяліскі". Пачынаецца яна так:

"Да тых палян шляхі няблізкія,// і сэрцу болю не стрываць, // як над ляснымі абяліскамі // цвіце ў маі сон-трава. // І не расой — слязой матулінай // дол акрапляе з даўніх дзён, // і сніцца хлопцам, што паснулі там // трывожны сіні майскі сон. // І цвіце сон-трава,// і звініць сон-трава,// нашы душы гукае, гукае".

Памяць зямлі, у роўнай меры палітая крывёю рускай і беларускай, зноў уладарна пастукалася ў нашы сэрцы, паклікала нашы душы. І таму пісьменнікі Расіі і Беларусі тут, разам. З памкненнямі чыстымі і святымі.

Праект Статута нашага творчага Саюза беларускія дэлегаты ўхваляюць і прымаюць аднадушна. А мы, былыя партызаны і франтавікі, з асаблівай вастрынёй адчуваем і разумеем, што ён, гэты Статут, — цвёрды і бескампрамісны адказ на разбуральныя тэндэнцыі ў нашай культуры, на спробы знявечыць, вытаптаць у людскіх душах Памяць роднай зямлі.

Цывілізацыі знікалі не таму, што ў тых цывілізацыях не было мудрых людзей, якія ведалі шляхі чалавека да шчасця, ці смелых патрыётаў, якія ставілі жыццё Радзімы вышэй за сваё ўласнае. Былі і тады такія людзі.

Цывілізацыі знікалі, ператвараліся ў пыл стагоддзяў таму, што новыя пакаленні здраджвалі Памяці роднай зямлі, перакрэслівалі Праўду, па якой жылі і змагаліся іх бацькі і дзяды, вынішчалі інтэлектуальны фундамент свайго нацыянальнага дома, а з яго абломкаў ляпілі мангалы, на якіх, дзеля дробнага славалюбства і імгненных выгод спальвалі замест бярозавых трэсак старонкі кніг, якія славілі прыгажосць і веліч чалавечага духу. І не заўважалі, што ператвараюць свае ўласныя лёсы і лёсы будучых пакаленняў у попел.

Мужнасць і мудрасць беларускага народа захавалі сілавое поле духоўнасці і адвялі краіну ад прорвы гістарычнага забыцця. Разам з намі былі і ёсць адвага і вернасць нашых пабрацімаў былой магутнай савецкай дзяржавы — у першую чаргу братоў рускіх! І таму нам не сорамна сёння глядзець у вочы адно аднаму.

У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сярод многіх святых экспанатаў ёсць медаль "За адвагу", прабіты фашысцкай куляй улетку сорак чацвёртага. Праз трыццаць гадоў пасля вызвалення Беларусі яго знайшлі школьныя следапыты непадалёк ад Мінска. Па нумары медаля пасля даведаліся: рускі салдат Сямён Рыгоравіч Летаў атрымаў гэтую ўзнагароду за мужнасць у баях на Курскай дузе. Хто і калі дакладна падлічыць, колькі такіх перадсмяротных стогнаў і слоў, колькі "сэрцаў скаменелых пламень" пераплавіліся ў неўміручую Памяць зямлі Беларусі?

Адказы на гэтыя пытанні — на сумленні жывых.

Пачуць, зразумець незгасальны покліч Памяці зямлі дадзена небам і мастацкаму слову. І наш найпершы абавязак у тым і заключаецца, каб зноў і зноў праўдзіва і шчыра адраджаць на белых лістах паперы гэтую Памяць, не шкадуючы сіл і творчага запалу для таго, каб новыя пакаленні прынялі яе ўсёй сваёй істотаю, не згасілі ў сваіх сэрцах любові да роднага краю і пачыналі сваё свядомае жыццё са святой прысягі на вернасць ёй, Памяці роднай зямлі.

У гэтым, і толькі ў гэтым бачыцца мне наша выратаванне!

Мастацкае слова, пісьменніцкі Саюз Расіі і Беларусі — несумненна — пойдуць менавіта гэтым шляхам, дапамогуць грамадству як мага лепш умацаваць інтэлектуальны фундамент Саюзнай дзяржавы, пашырыць і ўзбагаціць сілавое поле духоўнасці нашых народаў. І тады ніякая бяда не адолее гэты надзейны шчыт, які зберагае нашы душы ад спусташэння. І толькі змрок пагібельнага бяспамяцтва ніколі не навісне над нашай Айчынай.

Смела і мудра сказаў рускі паэт : "... и в недрах земли не хватит урана, чтоб двинуть историю вспять..." Менавіта так яно і будзе, калі нашы душы пачуюць і не забудуцца на тое, што гаворыць нам, жывым, Памяць роднай зямлі! Памяць жывая і вечная!

Самыя гуманныя літаратуры

Мікола МЯТЛІЦКІ, галоўны рэдактар часопіса «Полымя»

— Мне, як і многім прысутным у гэтай зале, выпала быць у далёкім ужо 1992 годзе дэлегатам апошняга з'езда Саюза пісьменнікаў СССР, на якім было прынята рашэнне аб ліквідацыі нашай саюзнай пісьменніцкай арганізацыі. Гэта адбывалася ўжо ўслед за сумнавядомымі Белавежскімі пагадненнямі, калі быў ліквідаваны сам Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Памятаю, з якім цяжкім настроем мы вярталіся назад у Мінск. З Беларускага вакзала Масквы цягнік адыходзіў адвячоркам. Напярадзе была бяссонная трывожная ноч. Тахкалі гучна колы вагона, наплывалі горычныя думкі. Здавалася, што з кожным праеханым кіламетрам рвецца тая духоўная прастора, якая і яднала нас у адной вялікай краіне, што дзеліцца на кавалкі наша агульная гісторыя. Памяталіся запаветныя словы вялікага аварца Расула Гамзатава, прамоўленыя ім з трыбуны гэтага ліквідацыйнага з'езда: мы яшчэ да канца не разумеем, што адбылося, што багата пашкадуем аб гэтым потым.

Я думаў аб тым, што губляю асабіста з ліквідацыяй Саюза пісьменнікаў СССР. Прыгадваў сваю паездку ў Балгарыю ў складзе маладзёжнай пісьменніцкай дэлегацыі вялікай краіны, дзе мы, маладыя літаратары, прадстаўлялі свае рэспублікі, а мне выпала прадстаўляць Беларусь. Якая з'яднала нас тады дружба, колькі цікавага было пачута і сказана. Памятаўся ўдзел у саюзных паэтычных фестывалях у тувінскім Кызыле і аддаленым тысячамі вёрст Уладзівастоку. І ўскіпала горкае разуменне: гэтага ўжо ніколі не будзе.

Час паказаў, на жаль, што нашы літаратурныя і сяброўскія сувязі значна аслаблі. Стала рэдкасцю публікацыя твораў на іншых мовах, выросла за гэтыя гады цэлае літаратурнае пакаленне, прадстаўнікі якога не ведаюць сваіх равеснікаў з братніх краін і не чыталі адзін аднаго. Што ніколі яны не збіраліся вось гэтак разам, не абмяркоўвалі праблем жыцця і літаратуры.

Але на шчасце духоўная прастора не раскалолася. Для нас, беларусаў, не сталі далёкімі і чужымі ні Пушкін, ні Талстой, ні Дастаеўскі. Мы наладжваем творчыя сувязі з пісьменнікамі былых брацкіх рэспублік. Гэтым займаецца і старэйшы літаратурна-мастацкі часопіс "Полымя", які я маю гонар тут прадстаўляць. Мы цікавімся і новымі набыткамі вялікай рускай літаратуры.

У нашай суверэннай Беларусі на правах дзяржаўнай гучыць руская мова, вывучаюцца творы класікаў рускай літаратуры ў школах і ВНУ. Да нас прыходзяць літаратурныя выданні Расіі.

Багата зроблена ў межах Саюзнай дзяржавы, закладзены за дзесятак гадоў яе існавання новы эканамічны падмурак. Абапіраючыся на яго трываласць, мы сягоння, сабраўшыся ў Мінску на Першы ўстаноўчы з'езд, можам сур'ёзна падумаць і аб адзінстве духоўным, аб прымнажэнні даўніх існуючых традыцый нашых літаратурных узаемасувязей.

І руская, і беларуская літаратуры з'яўляюцца самымі гуманнымі літаратурамі свету і ў XXI стагоддзі. Нас яднае як працалюбівая сучаснасць, так і акрываўленая памяць мінулай Вялікай Айчыннай вайны, 65-годдзе Перамогі ў якой у будучым маі адзначаць нашы народы. На гэтым шырокім полі вайны вырашаліся лёсы нашых незалежных дзяржаў, яно паліта крывёю і потам усіх народаў былой вялікай краіны, і ніколі, спадзяюся, не парасце бадыллём забыцця. Гэтаму якраз-такі паслужыць голас нашых творцаў, іх сумленне і талент. Багата супольных неадкладных задач мы можам вырашыць ужо сягоння, бо маем усе магчымасці стварыць дзеяздольную пісьменніцкую арганізацыю Саюзнай дзяржавы, жыццядзейнасць якой можа быць падмацавана пэўнымі сродкамі з саюзнага бюджэту. Той, хто шкадуе грошай на развіццё духоўнасці, значна больш траціць іх апасля на змаганне з праявамі амаральнасці, танных спакушэнняў і дэградацыі грамадства. Упэўнены, што ў Беларусі і Расіі нас зразумеюць, падтрымаюць наш духоўны парыў. Бо ўсе разам — і ўлады, і мы, пісьменнікі, думаем і клапоцімся пра сягонняшняе і заўтрашняе духоўнае здароў'е сваіх народаў.

Месяц, у якім праходзіць наш з'езд, на Беларусі называецца снежань. Вельмі хутка на прасторах і Беларусі, і Расіі выпадзе першы белы і чысты снег. Ён будзе падобны на бялюткі аркуш паперы. Гэта сама гісторыя разгортвае перад намі яго і дае нам новы шанц напісаць вялікія творы, што адгукнуцца мастацкаю праўдай у сэрцах мільёнаў людзей. І давайце зробім гэта таленавіта, з грамадзянскай мужнасцю.

За падзеяй

Па шляху адкрытасці

Традыцыйна, напярэдадні Новага года прайшоў пленум Праўлення грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз журналістаў". Адкрываючы мерапрыемства, старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль Лемяшонак зазначыў, што год быў вельмі няпростым. Але прыемна, што папулярнасць БСЖ павышаецца. Характарызуе гэту тэндэнцыю канкрэтны факт: толькі за апошнія два гады ў саюз уступіла больш як 500 чалавек. І ў асноўным — маладыя журналісты. У значнай ступені гэта тлумачыцца тым, што БСЖ у перыяд рэарганізацыі не пайшоў па шляху закрытасці, нейкай клубнай элітарнасці, а наадварот, стаў адкрытай пляцоўкай для творчых дыскусій. Пры гэтым значная частка такой работы была перанесена ў абласныя, раённыя і пярвічныя арганізацыі. Анатоль Іванавіч распавёў пра творчую дзейнасць арганізацыі, якую ён ачольвае, і падрыхтоўку да

XII з'езда Беларускага саюза журналістаў.

Першы намеснік старшыні БСЖ, старшыня Мінскай арганізацыі журналістаў Рыгор Сакалоўскі падкрэсліў, што журналісту дадзена магчымасць крануць сэрца чытача, адкрыць для яго нешта новае і невядомае. У сапраўднай журналістыцы застаюцца тыя газетчыкі, якія разумеюць душу чалавека і імкнуцца сваім словам змяніць жыццё ў лепшы бок. Журналістыка перш за ўсё — адказнасць перад грамадствам.

Як бы падсумоўваючы вынікі сустрэчы, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч зрабіла акцэнт на дзяржаўнай інфармацыйнай палітыцы, падкрэсліла важкасць працэсаў, скіраваных на тое, каб сродкі масавай інфармацыі былі канкурэнтаздольныя і высакаякасныя.

Пасля рабочай часткі пленума адбылося ўручэнне ўзнагарод новым лаўрэатам творчага конкурсу Беларускага саюза журналістаў "Залатое пяро". Ганаровы дыплом БСЖ і лаўрэацкі знак атрымалі Анатоль Крэйдзіч, рэдактар іванаўскай раённай газеты "Чырвоная звязда", старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі — за праблемныя публіцыстычныя выступленні на тэмы культуры, мовы, нацыянальных традыцый; творчы калектыў ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне" — за распрацоўку гістарычнай тэматыкі ў дакументальным тэлефільме "Гарачая восень 39-га" (аўтары сцэнарыя — Генадзь Салдатаў і Наталля Вільтоўская, рэжысёр — Андрэй Лескін); Аляксандр Казак, галоўны рэдактар бабруйскай гарадской газеты "Бабруйскае жыццё" — за цыкл хранікальна-дакументальных матэрыялаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны (аперацыя "Бабруйскі кацёл"); Юрый Нікалаеў, адказны сакратар раённай газеты "Ашмянскі веснік" — за цыкл матэрыялаў пра станаўленне мясцовага друку на заходніх тэрыторыях рэспублікі пасля аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі; Іна Гармель, рэдактар аддзела навін газеты "Белорусская нива" — за глыбокую распрацоўку праблем вёскі ў аператыўных жанрах; Міхась Кавалёў, намеснік рэдактара рагачоўскай раённай газеты "Свабоднае слова" — за серыю крытычных матэрыялаў пра недахопы сучаснага быту.

А шэраг ветэранаў сродкаў масавай інфармацыі — Георгій Загародны, Аляксандра В'юнова, Анатоль Смалянка і Таццяна Якаўлевіч — удастоены звання "Заслужаны журналіст".

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: Анатоль Крэйдзіч прымае віншаванні ад Рыгора Сакалоўскага і Анатоля Лемяшонка.

Фота аўтара

Гісторыя і сённяшняя дзейнасць Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры", асоба і творчасць яго стваральніка і лідэра, незабыўнага Уладзіміра Мулявіна — зноў у цэнтры ўвагі культурнай грамады. "Песнярам" споўнілася 40 гадоў, і з шэрагу сёлетніх праектаў, прымеркаваных да гэтай даты, самыя, бадай, адметныя імпрэзы прыпалі на снежаньскія дні.

Песні, нашых дум сям'я...

Асаблівы розгалас атрымалі канцэрты, арганізаваныя (і, вядома ж, запісаныя) тэлеканалам "АНТ" у Вялікай зале Палаца Рэспублікі. Дзіва што! Для ўдзелу ў гэтым праекце прыехалі знаныя госці з замежжа: "магіканін" савецкай эстрады Іосіф Кабзон; неадлучны ад Беларусі кампазітар Эдуард Ханок; спявачка Надзея Бабкіна са сваім ансамблем "Русская песня"; расійскі ВІА "Ариель", стыль якога ў свой час фарміраваўся пад магутным уплывам аранжыровак і прыёмаў выканання "Песняроў". Прыехалі ветэраны мулявінскага ансамбля Уладзімір Нікалаеў з Расіі ды Валянцін Бадзьяраў з Германіі. А яшчэ — упершыню за гады драматычнай гісторыі расколу, развалу, абнаўлення ды "кланіравання" нашага легендарнага ВІА — на адной сцэне, у адной праграме з Беларускім дзяржаўным ансамблем "Песняры", якім сёння кіруе Вячаслаў Шарапаў, выступілі не менш папулярныя "Беларускія песняры": у іх складзе, напрыклад, кумір публікі Валерый Дайнека ды Уладзіслаў Місевіч, адзін з першых спадзвіжнікаў Уладзіміра Мулявіна...

Уключаныя ў канцэрт знаёмыя, культавыя для цэлага пакалення, песні нагадалі пра зорны час мулявінскіх "Песняроў", іх сенсацыйную ўсесаюзную славу, іх трыумфальнае турнэ па ЗША. А яшчэ пра тое небывалае ўзвышэнне беларускай народнай песні, беларускага

паэтычнага слова, мовы роднай, што адбылося, дзякуючы выключнаму таленту У. Мулявіна. Прагучала і новая праграма "Вольнаму — воля" (яна прадстаўленая на аднайменным аўдыёдыску, выдадзеным да 40-годдзя ансамбля).

Між іншым, народны артыст СССР Іосіф Кабзон у сваім кароткім інтэрв'ю падкрэсліў: "Я не рабіў бы акцэнт на 40-годдзі самога ансамбля "Песняры". Проста гэта нагода для яшчэ аднаго паклону Уладзіміру Мулявіну". І якраз такім шчырым паклонам таленту вялікага Артыста, Музыканта сталася імпрэза ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы — адкрыццё дакументальна-мастацкай выстаўкі "Песня пра долю".

Знаўцам творчасці "Песняроў" няцяжка здагадацца, што назву выстаўкі падказала опера-прыпавесць Уладзіміра Мулявіна, створаная паводле драматычнай паэмы Янкі Купалы "Адвечная песня" (прэм'ера адбылася на сцэне Мінскага палаца спорту ў 1976 годзе). Экспазіцыя, прадстаўленая супрацоўнікамі музея ў межах культурна-адукацыйнага праекта, прысвечанага 40-годдзю ансамбля, успрымаецца ў гэтых сценах надзвычай арганічна і настройвае на развагі пра мелодыку вершаваных Купалавых радкоў, пра дзівосную духоўную, "касмічную" повязь двух геніяў: народнага паэта Беларусі ды сына Расіі, зачараванага не толькі музыкай беларускай зямлі, мілагучнасцю яе мовы, але і мудрым словам нашага Песняра.

Купалава паэзія натхняла і самога У. Мулявіна, а таксама Ігара Лучанка, Анатоля Багатырова, Юрыя Семяняку, Яўгена Глебава, многіх іншых кампазітараў на творчасць у розных жанрах. І ўжо немагчыма ўявіць нацыянальную культуру без хрэстаматыйнага рэпертуару "Песняроў" на вершы Янкі Купалы: оперы-прыпавесці "Песня пра долю", рок-оперы "Гусляр", такіх вакальных узораў, як "Спадчына", "Мая малітва", "Явар і каліна", "Беларускім партызанам", "Людка"... Пранікнёную творчую атмасферу новага вернісажа падтрымала не толькі калекцыя Купалавага дома, а і частка экспанатаў створанага ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі Музея Уладзіміра Мулявіна, і матэрыялы з асабістых архіваў Святланы Пенкінай-Мулявінай, аўтараў касцюмаў, мастакоў-сцэнографаў, якія супрацоўнічалі з "Песнярамі", — Валянціны і Леаніда Бартлавых, Галіны Крывабалоцкай. І, вядома, прысутнасць неабыякавых людзей на адкрыцці выстаўкі, сярод якіх былі знаныя, шаноўныя асобы, у тым ліку народны артыст СССР Ігар Лучанок. Яго класічная "Спадчына", створаная на вершы Янкі Купалы, кранальна прагучала ў жывым выкананні сённяшніх "Песняроў".

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: паэзія Песняра — у спевах "Песняроў"; легендарная гітара Уладзіміра Мулявіна экспанавалася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы толькі адзін дзень.

Фота Кастуся Дробава

З рэдакцыйнай пошты

Жыццё і мастацтва побач

Радыё — складаны, але высакародны від мастацтва, каштоўная крыніца ведаў, прыклад дасканаласці нацыянальнай моўнай культуры. Работа на радыё больш складаная, чым тэатральная, паколькі выконваецца без дэкарацый. Вядучы абавязаны валодаць энцыклапедычнымі ведамі, абвостраным пачуццём адказнасці, развітай інтуіцыяй, імгненна рэагаваць на нечаканасці. Сучаснасць патрабуе высокаідэйнага мадэліравання жыцця.

Адзначым, што ў 80 — 90 гг. XX ст. літаратурна-драматычная рэдакцыя Беларускага радыё з'яўлялася крыніцай багацця чалавечай думкі, абараняла каноны класічнай, сусветнай і нацыянальнай культуры. Разважлівы слухач любога ўзросту меў магчымасць вучыцца суперажываць, ацэньваць сучаснасць.

Неаднаразова па радыё гучалі перадачы па творах класікаў беларускай літаратуры: Якуба Коласа, Янкі Купалы, І. Мележа, Ул. Караткевіча.

На працягу апошніх месяцаў я слухаю раман Янкі Брыля "Птушкі і гнёзды" ў выкананні артыста Алега Вінярскага. Галоўны герой рамана — Алесь Руневіч, апынуўшыся ў палоне, не чакаў літасці, а з мужнасцю шукаў выхад і змагаўся з абставінамі. Сіла рамана не толькі ў дакументалізме, рэалістычнасці абставін, але і ў паказе магчымай "дыялектыкі" чалавечай душы...

На працягу двух месяцаў высокі ўзровень прафесіяналізму чытальніка-артыста Алега Вінярскага не аслабляўся, быццам ён, разам з суайчыннікамі прайшоў ізуверскі шлях, апынуўся ў палоне, без аніякай магчымасці на выратаванне. Манеру зносін, інтанацыйную афарбоўку кожнага дзеючага персанажа рамана Я. Брыля артыст беспамылкова збярог з дакладнай галасавой высатой, вібрацыяй пры апісанні ўсіх складаных калізій і характараў.

Мастак слова — А. Вінярскі нібыта маляваў фарбамі на драматычна-эмацыянальным палатне падзей. Прасветленым тэмбрам даносіў фрагменты ўспамінаў пра даваенны час. Тонка ўлавіў артыст, напрыклад у словах Lachen ist gesund (смех — гэта здароўе) філасофскую падаплёку пісьменніка, які сам выпакутаваў на мяжы гібелі і палону, з адценнем глумлення, падкрэсліў здзеклівую сутнасць прыгнятальнікаў.

Таццяна ІГНАТОВІЧ

Жыватворная «Крынічка»

Вядома, што бацькі, якія хочуць выгадаваць дзіця інтэлектуальна развітой і духоўна багатай асобай, ужо з самага маленства выхоўваюць у яго любоў да літаратуры і мастацтва. Сапраўды, кніга тут адыгрывае вялікую ролю. Але, зразумела, не кожная. Ужо цэлае стагоддзе (ад нашаніўскай пары да сённяшніх дзён) доўжыцца палеміка пра тое, якой быць дзіцячай кнізе і літаратуры ўвогуле. Адназначнага адказу няма... Аднак варта ўзгадаць словы Эдзі Агняцвет, творчасць якой была прысвечана пераважна маленькім чытачам: "Нам патрэбны і паэмы, і казкі, і паэтычныя мініяцюры. Галоўнае, каб у творы былі думкі, ідэя, пачуццё, каб вызначаўся твор добрай мовай, адточанай рыфмай, цікавым рытмам..." З гэтым меркаваннем цяжка не пагадзіцца. Кнігі, што адпавядаюць названым крытэрыям, развіваюць мысленне, фантазію юнага чытача, адкрываюць яму таямніцы яшчэ неспазнанага свету. Таму з'яўленне новай добрай кнігі для дзяцей — гэта чарговая прыступка для іх далейшага развіцця.

"Крынічка" — так называецца кніга, якую прапануе маленькаму чытачу выдавецтва "Мастацкая літаратура" (укладальнік Рэгіна Міронава). Перагарнуўшы літаральна першыя старонкі выдання, міжволі прыгадваеш словы Янкі Брыля, які калісьці заўважыў: "...Дзеці — гэта такі чытач, якога абы-чым не падкупіш". І "Крынічка", думаецца, стала такім выданнем, якое шмат у чым з'яўляецца ўзорным. Тут знайшлі ўвасабленне творы на беларускай і рускай мовах; падабраны яны з улікам узроставых асаблівасцей дзяцей старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзростаў. Кніга мае некалькі тэматычных раздзелаў ("Пачынаюцца нашы казкі, заплятаюцца нашы казкі", "Вучымся рабіць добрыя справы", "Першы раз у першы клас" і інш.), у кожны з якіх увайшлі выдатныя творы нашых вядучых мастакоў слова.

Нельга, праўда, забывацца, што вытокі кожнай нацыянальнай літаратуры, у тым ліку і дзіцячай, знаходзяцца ў вуснай народнай творчасці. Прыемна, што пра патэнцыял айчыннага фальклору не забыліся і аўтары гэтай кнігі. У першых двух раздзелах змешчаны адмысловыя пацешкі, заклічкі, калыханкі, казкі. Сучаснаму чытачу, думаецца, будзе цікава і карысна пачуць наступнае:

Наша бабачка піражкі пякла,
А ў панядзелак муку сеяла,
А ў аўторак вадзіцу грэла,
А ў сераду дзяжу чыніла,
А ў чацвер жа дзяжу мясіла,
А ў суботу ў печ садзіла,
А ў нядзелю ўмывалася,
К унучачцы сабіралася.

Думаецца, пачуўшы гэты вершык, нехта з дзяцей зацікавіцца народным бытам, папросіць бацькоў ці бабулю з дзядулем расказаць штосьці пра лад жыцця ў былыя часы...

Знойдзе юны чытач тут і аўтарскія творы (калыханкі Андрэя Александровіча, Артура Вольскага, Міхася Пазнякова; казкі Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Алеся Якімовіча), якія побач з народнымі дазваляюць дзіцячай аўдыторыі адчуць сапраўдны каларыт нацыянальнага слоўнага мастацтва.

Фактычна кожны дзіцячы твор у "Крынічцы" арыентаваны на вечныя, гуманістычныя каштоўнасці, вучыць размяжоўваць дабро і зло, праўду і хлусню. Мудрыя і павучальныя творы ўвайшлі ў раздзелы "Мой родны край, мая зямля, цябе люблю я ўсёй душою!", "Будзем вучыцца добра працаваць, працу паважаць", "Вучымся рабіць добрыя справы", дзе разам з творамі класікаў (Якуба Коласа, Янкі Купалы, Уладзіміра Караткевіча, Петруся Броўкі і іншых) прапанаваны творы сучасных майстроў пяра (Леаніда Дайнекі, Леаніда Пранчака, Васіля Жуковіча, Алеся Бадака і іншых). Гэта творы, якія дапамогуць маленькаму чытачу зразумець усю веліч Бацькаўшчыны, прыгажосць зямлі, што завецца Беларуссю, падштурхнуць да ўявы гераічнай і трагічнай гісторыі сваёй Айчыны.

Пакружыўся
над Хатынню бусел
і паплыў у светлую смугу.
Ён не ведаў болю Беларусі,
пэўна ж, ён адчуў яе тугу.

Пакружыўся бусел
над Хатынню
і ў смузе пад воблакамі знік.
Папялішча ўсё яшчэ не стыне,
і ў грудзях не замірае крык.

(Васіль Жуковіч)

Дзецям, як вядома, значна ў большай ступені чым дарослым, уласціва жывая і дынамічная фантазія, якая дазваляе ім не толькі ўяўляць прачытанае, але і быць "непасрэдным удзельнікам" мастацкіх падзей. Таму адной з асаблівасцей, якую не павінны абмінаць увагай дзіцячыя пісьменнікі, гэта і сама па сабе гульнёвая тэматыка, і творы, якія могуць быць выкарыстаны падчас гульні (лічылкі, пацешкі і інш.). Вельмі прыемна, што і такім творам знайшлося месца ў "Крынічцы". Тут яны паяднаны ў раздзел пад назвай "Гульня нас падружыць, гульня нас навучыць". Вершы "Як зроблены цацкі" Алеся Ставера, "Паляўнічы" Уладзіміра Карызны, "Пудзіла" Кастуся Цвіркі і многія іншыя, напісаныя ў прастай форме і нязмушанай манеры, не толькі забаўляюць, але і непасрэдным чынам навучаюць, уздзейнічаюць на свядомасць маленькага чытача.

Дзеці зноўку ранкам золкім
Селі маляваць вясёлку.
Малявалі-малявалі —
Спрэчкі тут завіравалі:
Колер кожны вельмі важны,
Што ён значыць, хто адкажа?
— Жоўты, ускрылены цяплом,
Ласку дорыць і святло.
— А блакітны разам
з сінім —
Гэта мір усім краінам!
— Фіялетавы... А гэты
Знак павагі і прывету.

(Валянцін Лукша)

Апошнія раздзелы "Крынічкі", прысвечаныя порам года, расхінаюць перад чытачамі прыгожы і дзівосны свет прыроды Беларусі. Нібыта ўвачавідкі паўстаюць перад намі шматколерныя пейзажы, ажываюць велічныя краявіды. Гэтыя пейзажныя малюнкі арганічна дапаўняюцца рытмічнымі і дынамічнымі вершамі, прысвечанымі дрэвам, птушкам і з'явам прыроды. Вось, напрыклад, як нязмушана і па-мастацку арыгінальна расказаў дзецям пра салаўя Алесь Бадак:

Не будзіце, салавейку,
не будзіце!
Не крычыце гэтак моцна,
не крычыце!
Ён уночы нават крышку
не паспаў,
А ўсё песенькі да раніцы
складаў.
Ну, а заўтра
на світанку
На рацэ
Ён даваць
будзе сябрам сваім
Канцэрт.
І збяруцца там
І пчолкі,
І жучкі,
І камарыкі,
Стракозкі,
Матылькі.
Ох, і песні,
Ох, і песні загучаць!
Як шкада,
Што вы так любіце
паспаць!

Трэба адзначыць, што ў кожным дзіцячым выданні заўсёды, апроч аўтара (укладальніка), існуе і паўнапраўны сааўтар — мастак. Тэкст без малюнкаў, думаецца, значна менш цікавы маленькаму чытачу. Ілюстрацыі, несумненна, і прывабліваюць да кнігі, і дапамагаюць зразумець мастацкі тэкст. Дарослыя не заўсёды задумваюцца пра тое, што для дзіцяці кніга з малюнкамі — гэта першая сустрэча з мастацтвам. І ад гэтай сустрэчы залежыць многае... "Крынічка" таксама мае свайго сааўтара. Гэта Т. Беразенская, дзякуючы якой выданне нават вонкава прыцягвае погляд, а ўжо калі юны чытач адкрые кнігу, то наўрад ці выпусціць з рук.

Дзіцячы ўзрост — гэта той перыяд жыцця, калі ўсе падзеі і ўражанні ўспрымаюцца даволі востра і могуць пакінуць глыбокі след у душы. Няма сумневу, што кніжка "Крынічка" станецца для дзяцей сапраўднай жыватворнай крыніцай, якая здольна наталіць прагу ведаў, істотна паўплываць на развіццё мовы юных кнігалюбаў, узбагаціць іх агульны жыццёвы досвед.

Алесь ГРЫБОЎСКІ

Чалавек з сонечнаю ўсмешкай

У канцы леташняга года я развітаўся назаўсёды са сваімі найлепшымі сябрамі студэнцкіх гадоў: Алегам Лойкам і Аняй Квяткоўскаю. Яны і пайшлі з жыцця адно за другім: Алег Лойка ў лістападзе, а Аня Квяткоўская ў снежні. Абое вучоныя, яна — мовазнаўца, кандыдат навук, ён — яшчэ больш вядомы і знакаміты: паэт, празаік, даследчык літаратуры, прафесар, доктар філалогіі. Вось такія знакамітыя сябры пакінулі мяне летась, у той цяжкі высакосны год. Гэта, можна сказаць, мае апошнія студэнцкія сябры.

З Алегам Лойкам я пазнаёміўся, калі мы разам паступалі ў БДУ на філфак беларускага аддзялення, якое тады, у 1948 годзе, толькі адкрылася, і там шмат аказалася заходнікаў, экзамены мы здалі добра, Алег Лойка меў, здаецца, усе пяцёркі, але студэнтам яго не залічылі, а пакінулі кандыдатам — была такая форма прывязкі.

Але прайшло паўтода — і кандыдат паказаў сябе з лепшага боку на семінарскіх занятках, выдатна здаў першую сесію — і яго залічылі ў студэнты. Для яго гэта была вялікая радасць, як, дарэчы, і для нас, сяброў па курсе.

Яшчэ адну радасць мы перажылі, калі Алега Лойку прызначылі старастам нашага беларускага аддзялення. А здарылася гэта так. Аднойчы на перапынку мяне выклікаюць у дэканат. Я захваляваўся: што за прычына? Заходжу, вітаюся, мяне запрашаюць садзіцца. За сталом сядзіць салідны сівы дэкан Шніткo, непадалёку ў крэсле — куратар нашага аддзялення Марыя Андрэеўна Жыдовіч, яна вяла курс гісторыі беларускай мовы.

Пасля кароткай паўзы дэкан звярнуўся да мяне і сказаў, што яны тут параіліся і вырашылі зрабіць старастам аддзялення мяне, так як у біяграфіі ў мяне ўсё гладка, ды і ўзрост — дваццаць гадоў, таксама мае значэнне.

Я задумаўся на хвіліну, а пасля адказаў, што ў мяне няма ніякага арганізатарскага таленту, я трохі замкнуты, вясковы хлопец. А тут патрэбен нехта іншы: актыўны, кампанейскі, гарадскі. І такі чалавек на нашым аддзяленні гэта — Алег Лойка. Ён — выдатнік, да таго ж паэт, музыкант, добра спявае, танцуе, дэкламуе. Лепшага старасты на нашым курсе проста няма, — скончыў я сваю думку.

Нашы вучоныя педагогі пераглянуліся, заўсміхаліся, і дэкан Шніткo сказаў, што кандыдатура Лойкі як быццам неблагая: "Мы падумаем", —падсумаваў ён гутарку.

Так з маёй лёгкай рукі Алег Лойка стаў старастам нашага беларускага аддзялення, і быў ён нязменным і незаменным усе пяць гадоў нашай вучобы. І мы ўсе былі вельмі рады за свайго старасту, ды і начальства ацаніла яго арганізатарскі і дыпламатычны талент.

Пяць гадоў вучобы — лёгка сказаць, а колькі за імі ўсякіх клопатаў-згрызотаў, удач і расчараванняў! І ў кожнага студэнта — свая сцяжына, свае, як у мяне, нечаканыя павароты. Пра гэта я потым пісаў у аповесці "Студэнты апошняга курса".

У гэтым сэнсе ў Алега Лойкі ўсё ішло даволі роўна, ён вучыўся выдатна, а па заканчэнні адразу паступіў у аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ, а роўна праз тры гады абараніў кандыдацкую дысертацыю і стаў працаваць на філфаку, дзе нядаўна вучыўся.

...Час ішоў, нават ляцеў. Праца выкладчыка, сям'я, вершы, даследчыцкія пошукі — усё гэта вымагала ад яго шмат энергіі, фізічнага і маральнага напружання. І раптам — проза! Нават мяне, які ведаў яго так блізка, ён прыемна ўразіў і здзівіў, напісаўшы раман пра нашага песняра Янку Купалу пад назвай "Як агонь, як вада", а пасля другі раман — пра далёкую ад нашага часу эпоху, малавядомую і вывучаную — пра дзейнасць нашага першадрукара і вучонага Францішка Скарыну — "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае". Паэт паказаў сябе дасканалым празаікам!

Як ён казаў, пісалася яму лёгка, а вось выдавалася цяжка, асабліва кніга пра Янку Купалу. І найхутчэй таму, што Янка Купала пад яго пяром паўставаў без хрэстаматыйнага глянцу, а як жывы геніяльны творца, які добра разумее, што трэба Беларусі і яе народу. Аўтар разрывае цесныя рамкі афіцыйнай тагачаснай крытыкі, паказвае яе грубую тэндэнцыйнасць, якая даводзіць паэта да замаху на сваё жыццё, да напісання "пакаяльнага ліста"...

Амаль такі ж самы цяжкі шлях да чытача прайшоў і другі раман Алега Лойкі "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае"...

Дарэчы будзе сказаць, што артыкул Дзмітрыя Бугаёва ў "ЛіМе" стане адпраўным пунктам па збіранні і захаванні літаратурнай спадчыны нашага выдатнага пісьменніка і вучонага: там пералічана і названа ці не ўсё тое, што выдадзена Алегам Лойкам. А хто ведае, колькі ў яго яшчэ засталося рукапісаў? Але бібліёграфы павінны разабрацца... Яшчэ трэба дадаць, што лімаўская старонка "Вянок памяці" стала сапраўдным жывым вянком — не на магілу! — на светлае і мудрае чало нашага знакамітага паэта і вучонага, — разам з пялёсткамі вершаў самога паэта.

Наша сяброўства — вось тое галоўнае ў нашых адносінах, бо яно шмат чаго нам давала. Мы ішлі побач плячо ў плячо яшчэ са студэнцкіх гадоў, калі нашы жалезныя ложкі ў інтэрнатах — за выключэннем аднаго года — стаялі побач. І шмат чаго было перагаворана, шмат перадумана, шмат чаго засталося ў памяці. І вэнджаная слонімская саланіна часам успамінаецца мне, асабліва калі я бываю галодны. Але гэта між іншым...

Добра запомніўся мне вечар, які прайшоў у адной кампаніі з Алегам Лойкам. Нас запрасіла на імяніны тады яшчэ малавядомая паэтка Дуся Лось. Ды і мы з Алегам тады яшчэ сама ўбіраліся ў сілу. Са спазненнем заявіўся знакаміты паэт Анатоль Вялюгін, ужо трохі падвяселены, і застолле ажывілася.

Пра Дусю Лось мы ўсе сказалі шмат цёплых слоў, жадалі поспехаў ёй і яе паэзіі, якая ўжо набірала сілу. Мы не агледзеліся, як гадзіннік на сцяне прабомкаў дванаццаць раз. Шчыра падзякавалі гаспадыням, маладой і старой, і падаліся на выхад.

З невялікімі прыгодамі дабраліся ў раён Дзяржаўнага цырка, "здалі" Анатоля Вялюгіна яго жонцы, а самі яшчэ доўга стаялі на вуліцы і гаварылі, абмяркоўвалі вечар, які, здаецца, прайшоў няблага, і што Дуся Лось на нас крыўдаваць не павінна.

Мы развіталіся, калі ўжо стала развідняцца. Я падумаў, як добра мець такога сябра, як Алег Лойка. Аднак з цягам часу мы сустракаліся ўсё радзей. У кожнага была свая дарога і свой клопат.

Але былі і даты, якіх нельга было абмінуць. Алег Лойка часам збіраў вялікія застоллі, калі сталы гнуліся ад закусі. Хмялелі ад напояў, калі тосты ішлі па крузе і вясёлая бяседа заводзіла родную песню, а сам гаспадар застолля акампаніраваў на акардэоне, які служыў яму нязменна яшчэ са студэнцкіх гадоў.

Шмат чаго можна сказаць і ўспомніць пра Алега Лойку — сябра, чалавека, вучонага, паэта, шчырага патрыёта Беларусі, яе лепшага сына, які аддаў усяго сябе працы на ніве беларускай навукі і культуры.

Чалавек з сонечнаю ўсмешкай — такім бачыцца мне Алег Лойка. Лагодная, мяккая, сонечная ўсмешка была, можна сказаць, яго візітоўкаю карткаю.

Такім я запомніў яго назаўсёды.

Уладзімір ДАМАШЭВІЧ

Міхась Стральцоў — адзін з самых значных беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя. Ён стварыў узоры лірыка-філасофскай прозы, паэзіі, літаратурнай крытыкі. З дзейнасцю Стральцова ў беларускай літаратуры другой паловы 1950-х — 1980-х гг. у новым абліччы паўстала традыцыя спасціжэння высокай красы, сапраўднай духоўнасці; яны былі нанова адкрытыя пісьменнікам у драматычных і будзённых праявах чалавечага быцця. Міхась Стральцоў абраў кірунак Максіма Багдановіча; ён працягнуў і пацвердзіў гэты кірунак сваім непаўторным творчым шляхам — як мастак ужо сваёй, бліжэйшай да сучасніка эпохі.

Загадка Міхася Стральцова

Уталенце Стральцова адмыслова спалучыліся многія складнікі, у тым ліку лірызм, псіхалагізм, інтэлектуальнасць. Лірызм азначае адлюстраванне жыцця праз унутраны свет чалавека. Тут і паэтызацыя рэчаіснасці, і вельмі асабісты, суб'ектыўны погляд на яе. У творах Міхася Стральцова не толькі думкі і пачуцці, а нават прадчуванні, імгненныя ўражанні, сны лірычнага героя, вельмі блізкага аўтару, важаць столькі ж, колькі рэальныя факты, падзеі знешняга жыцця. Найвялікшая вага пачуццяў звязаная ў мастацтве з імпрэсіянізмам, і яго ўплывы адчувальныя ў прозе Міхася Стральцова.

Абвостранасць пачуццяў дапамагала мастаку спасцігаць не толькі сваю душу. Стральцоў быў майстрам псіхалагічнага аналізу як умення раскрыць унутраны свет іншага чалавека, літаратурнага персанажа. Пры гэтым пісьменнік абавязкова паказваў характары ў цеснай сувязі з жыццём цэлай нацыі ў пэўны гістарычны час.

Ніводзін выбітны мастак XX стагоддзя не можа абысціся без абазнанасці ў скарбах сусветнай культуры. Таму невыпадкова ў творах Міхася Стральцова мы сустракаемся з вялікай мысленчай працай, запасам ведаў, эрудыцыяй, "абсалютным літаратурным густам" (Р. Барадулін). Міхась Стральцоў быў вытанчаным стылістам, арганічным і вольным у мастацкім маўленні. Інтэлектуальнасць прозы і паэзіі Міхася Стральцова ў вялікай ступені абумоўлена філасофіяй экзістэнцыялізму, што ў 1960-я гады зрабілася асабліва папулярнай, дзякуючы французскай антываеннай прозе. Экзістэнцыялізм патрабуе ўвагі да асобнага чалавека, якому наканавана шукаць сябе ў трагічным і абсурдным свеце. Міхась Стральцоў такую паэтыку найвыразна выявіў у апавяданні "Смаленне вепрука", дзе глыбока перажыў спрадвечную сувязь жыцця са смерцю, прычым у знакавых для кожнага беларуса вобразах. Заканчваецца гэтае апавяданне, аднак, згадкай пра надзею насуперак непазбежнасці. Аўтар нібы прадказвае перамогу шчырага творцы, якім быў сам, над сіламі нябыту: *"Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засмяюся ад бяды — бо сказаў. Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг"*.

Міхась Стральцоў (1937 — 1987) нарадзіўся 14 лютага, на Грамніцы. Месца нараджэння — Магілёўшчына, Слаўгарадскі раён, вёска Сычын. Сям'я: бацька, Лявон Клімавіч, настаўнік, дырэктар мясцовай школы; маці, Марыя Міхайлаўна, хатняя гаспадыня. Можна ўявіць сабе, якім, верагодна, быў будучы пісьменнік, па шчыра-праніклівым апісанні лірычнага героя з апавядання "Смаленне вепрука": *"У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве, гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук — хударлявы, бледны, шыракароты; парывісты і адначасова ціхмяны, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа, і можна сказаць, што яна была надзелена здольнасцю разумення і хацення дабра..."*. Міхась вырас у прыгожага і вельмі таленавітага юнака, улюбёнага ў свет вялікай літаратуры. У 1954 г., Міхась паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт, на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта.

Даследчыца А. Сямёнава прыгадвала : "...прыехаў гэты хлопец — Міхась Стральцоў — у сталіцу парой, якую пазначаюць "хрушчоўскай адлігай". У сярэдзіне 50-х гадоў. У пару ашаламляльнага сацыяльна-грамадскага прарыву". Поруч з рэабілітаванымі (пасля XX з'езда партыі ў 1956 г.) айчыннымі пісьменнікамі, такімі, напрыклад, як Гарэцкі і Дубоўка,

гэта былі Хемінгуэй, Рэмарк, Сент-Экзюперы, Сартр, Камю, рускія Бунін, Ахматава, Цвятаева, Салжаніцын; гэта быў жывапіс Пабла Пікаса і Сальвадора Далі, замежная музыка — джаз і рок-н-рол, новы тэатр, кінематограф... многае, многае іншае. Безумоўна, патрабаванні сацыялістычнага рэалізму, дзяржаўная цэнзура захоўвалі сваю моц, але дзейнічалі не так жорстка, як, напрыклад, у 1930-я гг. Тагачасная моладзь адчула покліч інтэлектуальнай свабоды і памкнулася да бязмежнага свету культуры (няхай тая "адліга" і змянілася неўзабаве няўмольным "прымаразкам" наступнага дзесяцігоддзя). А пакуль што герой-равеснік з апавядання М. Стральцова "Свет Іванавіч, былы донжуан" (1965) выглядае наступным чынам: *"Недзе на трэцім курсе я адпусціў доўгія валасы — тады гэта было модна. І падняў каўнер курткі — гэта таксама, здаецца, лічылася, што няблага. Тады катастрафічна, увачавідкі вузелі ў хлопцаў штаны, затое так прасторна было плячам пад шырачэзнымі пінжакамі. <...> Я чытаў тады французскія раманы. Эміль Бландэ, Люсьен Рубампрэ... Галантны век, дасціпнасць. І скепсіс."*

Беларускія даследчыкі спачатку назвалі маладзейшых шасцідзесятнікаў "філалагічным" пакаленнем, а крыху пазней — абпаленым вайной. У дзяцінстве бачылі вайну і яе наступствы Уладзімір Караткевіч, Барыс Сачанка, Вячаслаў Адамчык, Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Алесь Петрашкевіч, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Віктар Карамазаў, Анатоль Кудравец, Віктар Казько, іншыя пісьменнікі, а таксама будучыя даследчыкі літаратуры. Усе яны былі адукаванымі, усе высока цанілі магчымасць вучыцца ў пасляваенныя гады. Міхась Стральцоў не сумняваўся: *"Калі-небудзь хто-небудзь напіша пра тую пару, калі ў нашым сталічным універсітэце на адным курсе ці паралельным (філолагі — журналісты) вучыліся Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Юрась Свірка, Сымон Бластун, Таццяна Арлова, Мікола Гіль, Алесь Станюта..."* І ён, Міхась Стральцоў.

Пазней месцам ягонай працы будуць розныя рэдакцыі: штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва", часопісаў "Полымя", "Маладосць", "Нёман". Але асноўным прызваннем зробіцца творчасць: паэзія, проза, літаратурная крытыка і эсэістыка, прычым паўсюль ён пакіне амаль сенсацыйныя, а потым праверэныя часам мастацкія адкрыцці.

У паэзіі гэта былі выдатныя вершы з кніг "Ядлоўцавы куст" (1973), "Цень ад вясла" (1979), "Яшчэ і заўтра" (1983), "Мой свеце ясны" (1987). Паэзія М. Стральцова спалучае інтэлектуальнасць з пачуццёвай адкрытасцю, падтэкставы зварот да сусветнай мастацкай спадчыны — з непасрэднай эмацыянальнасцю. Яму роўна падуладныя як традыцыйна-гарманічныя вершаваныя памеры, інтанацыя, вобразнасць, так і астрафічныя, нерыфмаваныя, умоўна-асацыятыўныя па вобразнасці вершы. Каб пацвердзіць гэтую выснову прыкладамі, прыгадаем два стральцоўскія вершы на адну тэму — "адысеі", вяртання чалавека з няпростых жыццёвых дарог дадому, да свайго жытла. Вось дзве страфы з філасофска-патрыятычнага верша "Бацькаўшчына": *"З двара прыйду і сяду ля агню. // Палаюць дровы. Ссечана капуста. // На градах — бласлаўленне дню. // Змрок у палях — там сіберна і пуста. <...> // О роднае маё! Як доўга да цябе // Ішоў я, кволы падарожнік. // О весялосць у восеньскай журбе! // Агонь. // Саган. // Вуголле і трыножнік"*. А вось "аўтапартрэт" інтэлектуала ў вершы "З дарогі": *"Святло запаліў, распрануўся, // на люстэрка павёў краем вока. // Ад святла па кустах пахаваўшыся, // няўцямна пенаты маўчалі. // Стоячы перад люстэркам, // ён доўга сябе пазнаваў. // Пасля ўжо яго абступілі пенаты. // "Стаміўся", — хацеў ён сказаць. // "Вярнуўся", — сказаў ён пенатам"*. (Слова "пенаты" азначае родны дом, утульнае жытло, родны кут; старажытныя рымляне пенатамі называлі багоў-ахоўнікаў сям'і, дому, хатняга агменю.) За апошнюю кнігу паэзіі М.Стральцоў пасмяротна быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Янкі Купалы.

У літаратуразнаўстве Стральцоў вядомы зборнікамі артыкулаў і эсэ "Жыццё ў слове" (1965), "Загадка Багдановіча" (1968), "У полі зроку" (1976), "Пячатка майстра" (1986). Найбольш папулярным з літаратуразнаўчых стральцоўскіх тэкстаў зрабілася праца "Загадка Багдановіча". "Якая культура думкі, пачуцця, эстэтычная культура стаіць за адным толькі эсэ "Загадка Багдановіча"! І якое разуменне, што ў паэта не біяграфія, а — лёс", — так выказваў сваё захапленне гэтым творам Алесь Адамовіч. *"Сплятайце свае вянкі. Не старайцеся адшчыкнуць хоць адзін лісток ад тых лаўраў: тыя лаўры, перш чым стаць імі, былі цернямі"*, — гаркавая іранічна пісаў Міхась Стральцоў пра славу Максіма-Кніжніка, які ў фатальнай аддаленасці ад Радзімы стаў яе класічным паэтам.

У мастацкай прозе засталіся зборнікі яскравых і вытанчаных стральцоўскіх апавяданняў: "Блакітны вецер" (1962), "Сена на асфальце" (1966). Асобным выданнем друкавалася аповесць "Адзін лапаць, адзін чунь" (1970). Адметнай падзеяй, якая ўзрушыла літаратурную грамадскасць, стала публікацыя апавядання "Смаленне вепрука" (1973), строгага па думцы і радыкальна свабоднага па сюжэтабудове. Проза Стральцова выдавалася і ў кнізе выбраных тэкстаў пад назвай "На ўспамін аб радасці" (1974). Са стральцоўскіх перакладаў вылучаецца праца над раманам Ч. Айтматава "Буранны паўстанак" («И дольше века длится день»), які быў надрукаваны па-беларуску ў 1987г.

Вясной 1987 г. ужо цяжкахворы Стральцоў падрыхтаваў кнігу пад назвай "Выбранае", з падзагалоўкам "Проза, паэзія, эсэ", куды ўвайшлі самыя значныя творы пісьменніка. 23 жніўня таго ж года Міхась Стральцоў памёр у Бараўлянах; пахаваны на Чыжоўскіх могілках у Мінску. Нібы збылася яго вершаваная мроя:

Кіну, рыну — пакіну
Гэты дом на гары.
Горкі дым успамінаў
Хай развеюць вятры.

Хіба гэтак няможна?
Дзе пасцелецца цень
Ад капы прыдарожнай,
Там і будзе пасцель.

Мо на Шчару, ці Піну,
Ці на Пціч, Вілію,
А мо на лугавіну
Я слязу пралію —

Каб зрабілася парай
Над ракой, над ракой,
Каб здружылася з хмарай
Талакой, талакой, —

І каб чайкі крычалі,
Прадчуваючы гром,
Каб на дальнім прычале
Здрыгануўся паром!

У лёсе Міхася Стральцова былі свае драмы і загадкі, была прага дасканаласці і туга па няспраўджаным — усё ж пакінуў ён гэты свет, ледзь пераступіўшы мяжу свайго пяцідзесяцігоддзя. За 17 дзён да адыходу, адчуўшы сябе крыху лепш у бальнічнай палаце, ён паўтары гадзіны прагаварыў з адным са сваіх любімых класікаў — Янкам Брылём. Ён застаўся ў гісторыі літаратуры, не сышоў і з памяці паплечнікаў, сяброў. Часцей за іншых згадвае Міхася Стральцова ў сваіх вершах былы аднакурснік Рыгор Барадулін: "І раптам хлопец малады // З абліччам Міхася Стральцова // Расчырванелы ад хады // Узнікне. // Быццам выпадкова <...>".

Відаць, наканавана спраўдзіцца прадказанню Алеся Адамовіча: Стральцоў яшчэ ў нас наперадзе, мы будзем шмат вяртацца да яго як да хрэстаматыйнага пісьменніка.

Людміла СІНЬКОВА
Мінск,
лістапад, 2009 год

«Бог даў мне сілу і красу...»

У снежні споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Зьніча (Алега Бембеля).

У Слонімскай цэнтральнай бібліятэцы імя Якуба Коласа адбылася творчая вечарына, прысвечаная паэту Зьнічу (Алегу Бембелю). Яе адкрыў сам юбіляр і прапанаваў паглядзець дакументальны фільм пра яго жыццё і дзейнасць. Фільм "Паэма веры" стварылі рэжысёры Аляксандр Налівайка і Андрэй Куціла.

Пасля прагляду паэт чытаў свае філасофскія і лірычныя вершы, прысвечаныя пошукам сэнсу зямнога жыцця.

Алег Бембель (інак Мікалай) жыве ў Жыровічах, з'яўляецца насельнікам Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра. Сюды яго лёс прывёў трынаццаць гадоў таму. Інака Мікалая часта можна ўбачыць на вуліцах Слоніма, калі ён крочыць упэўненай хадой, найперш у мясцовую друкарню, дзе выдае не толькі свае ўласныя творы, але і рэдагуе багаслоўска-літаратурна-мастацкі лісток "Жыровіцкая абіцель". Часам яго можна сустрэць і ў Слонімскай гімназіі, куды інака Мікалая нярэдка запрашаюць і дзе ён, кажучы словамі паэта, "малітву патаемную у прыцемках шэпча".

Алег Бембель нарадзіўся ў Мінску ў сям'і народнага мастака Беларусі Андрэя Бембеля. Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі і Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя Луначарскага. Пэўны час настаўнічаў, працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Скарыны.

Як філосаф-публіцыст і як паэт Алег Бембель адбыўся на памежжы 1970 — 1980-х гадоў, калі яго першыя вершаваныя публікацыі пачалі з'яўляцца ў рэспубліканскім друку. З 1988 года за Алегам Бембелем замацоўваецца яго сталы псеўданім Зьніч, а яго паэзія акрэсліваецца пераважна ў інтэлектуальным рэлігійна-быційным напрамку. Асноўнымі тэмамі і матывамі паэзіі Зьніча з'яўляюцца хрысціянская ідэя міласэрнасці, вымярэнне з'яў і падзей жыцця, учынкі і памкненні людзей, роздум над лёсам Бацькаўшчыны і беларускага народа:

Мы прывыклі неяк не па-людску
Пра матывы сэрцаў меркаваць:
Можна нішчыць Беларусь
па-беларуску...
Можна па-расейску — ратаваць...

Першыя зборнікі вершаў Зьніча выйшлі не ў Беларусі: "Рэха малітвы" — у Нью-Йорку, "Саната ростані" — у Беластоку. А першы зборнік вершаў на Радзіме "Малітвы за Беларусь" пабачыў свет у 1989 годзе.

Сёлета ў Слонімскай друкарні з'явілася яго новая паэтычная кніга "Мне не цябе шкада — а тваю маці...". Гісторыка-філасофская элегія ў вершах адрасавана найперш сучасніку, яна дапаможа ў нашых роздумах на зямных шляхах паразважаць аб краіне, у якой мы жывём:

Пад завірухай кроў ліецца...
Вятрыска — памяць расхістаў...
О, Беларусь, ці станеш сэрцам
Укрыжаванага Хрыста?..

Што датычыць філасофскіх разважанняў Алега Бембеля, то самым грунтоўным творам філасофскай публіцыстыкі з'яўляецца яго кніга "Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс", якая ў 1985 годзе была надрукавана ў Лондане. Яна прысвечана лёсу і сучаснаму стану беларускай мовы, крытычнасць якога на той момант была відавочнай для аўтара, і ён сярод нешматлікіх абаронцаў мовы заклікаў да яе ратавання. На жаль, яе даводзіцца ратаваць і сёння.

На вечарыне, прысвечанай 70-годдзю Зьніча, юбіляр ігraў паланез Агінскага "Развітанне з Радзімай" і кожнаму прысутнаму падараваў свой новы паэтычны зборнік.

Сяргей ЧЫГРЫН

У святара

Леапард на балконе

Міхась Южык

Прырода чалавечага злачынства... Ці вынікае злачынства з выхавання, акаляючага асяроддзя, аб'ектыўных жыццёвых абставінаў, або крыніцай яго з'яўляецца нябачнае, метафізічнае, над чым ніхто з нас не ўладны? Прызнаюся, гэтае пытанне, пастаўленае класікамі сусветнай літаратуры, даўно турбуе мяне. Раман "Леапард на балконе", дзе героі — нашы з вамі сучаснікі-гараджане, прысвечаны пераважна гэтаму: магчымасці ці немагчымасці чалавеку нешта ў сабе змяніць. Змяніць для таго, каб стаць лепшым, ці хаця б для таго, каб не ператвараць у кашмар жыццё сваіх блізкіх.

Поўны варыянт рамана прапанаваны ў часопіс "Полымя".

Аўтар

Ні разу яшчэ Наталля Ціханаўна не была настолькі няўважлівая падчас службы. Словы айца Аляксея не клаліся на душу, рухі яго здаваліся занадта павольнымі і нават найгранымі. Хваласпевы, што ліліся з боку царкоўнага хору і ўзмацняліся пад скляпеннямі, гучалі манатонна, нудліва і не краналі душы. Са страхам спрабавала Наталля Ціханаўна ўзяць сябе ў рукі і засяродзіцца на словах малітвы, намагалася паўтараць іх пра сябе і шаптаць. Але словы вымаўляліся механічна, пуста, і ад таго адчуванне сваёй грахоўнасці шматкроць узмацнялася.

Хваляванне Наталлі Ціханаўны выспела на цалкам рэальных рэчах. На паводзінах і душэўным стане роднага сына. Дужа непакоіў апошнім часам Пятрусь. Грубіў бацьку, не адказваў на тэлефонныя званкі, закінуў заняткі ў аспірантуры і нават у сваёй кватэры не прыбіраўся. А аднойчы, калі маці ў яго адсутнасць зайшла і зрабіла прыборку, учыніў істэрычны скандал, крычаў у трубку, што знарок высыпаў смецце з вядра на кілім у зале і што Наталля Ціханаўна можа прыехаць і праверыць. Пагражаў, што памяняе замкі, каб яго болей не турбавалі.

Уражваў сынаў калючы позірк, з'явілася косая маршчына на лбе, край правай губы разпораз непрыгожа падымаўся, ствараючы аднабаковую, нядобрую ўсмешку. Акрамя таго, не было раней, каб сын хоць раз на суткі не пазваніў, не пацікавіўся самаадчуваннем бацькоў, ці хаця б не сказаў, што ў яго ўсё нармальна. Цяпер жа мабільны ў яго, як правіла, стаяў на рэжыме аўтаадказчыка і прапаноўваў надыктаваць паведамленне ў памяць. Але, нават калі маці запісвала на аўтаадказчык просьбу перазваніць, Пятро нярэдка не рэагаваў і прыходзілася тэлефанаваць яму зноў і зноў.

А яшчэ адчувалася, што паміж сынам і мужам назапасіўся вялізны адмоўны патэнцыял, гатовы ў любую секунду грымнуць выбухам. Пятро нібы выпрабоўваў нервы Сямёна Паўлавіча, адцягваючы афіцыйную прапанову Ніне Сулеевай. Бацька ж трымаўся з апошняй змогі, не прыспешваў, але жудасна нерваваўся. Пры сыне маўчаў, а спаганяў сваё раздражненне на жонцы. Да таго ж стаў папіваць карвалол, мімаволі прыкладаць руку да левага боку грудзей. Начамі бяссоннічаў, выходзіў са спальні на балкон, тупаў па зале. Карацей, над сямействам Мігуляў збіралася навальніца, і Наталля Ціханаўна хацела, пакуль не позна, параіцца з айцом Аляксеем, як быць.

...Бацюшка, калі скончыў службу, адразу ж скіраваў на лесвіцу, што вяла ў прыбудову да храма, — там знаходзіліся яго апартаменты. Наталля Ціханаўна, счакаўшы пятнаццаць хвілін, як было дамоўлена, паднялася ўслед за айцом Аляксеем. Падымалася яна цяжка, апошнім часам ногі дрэнна слухаліся, а ў суставе правага бядра нешта парыпвала, і тады ўсю нагу, зверху ўніз, пранізваў востры боль.

Цемнавата было ў калідоры. Гарэла пара слабенькіх лямпачак на левай сцяне. Уздоўж гэтай сцяны стаяла лаўка. Насупраць знаходзіліся двое дзвярэй, драўляныя, масіўныя, знутры абабітыя дэрмацінам. Ніводзін гук не пранікаў праз іх у час душавыратавальных гутарак з айцом Аляксеем. Зараз ён, мабыць, прымае дзячка Міхаіла. Трэба дачакацца. Наталля Ціханаўна рахмана паклала рукі на сумачку, сашчапіла пальцы і стала маліцца, каб суняць хваляванне. У цёмнай хустцы, з-пад якой выбіваліся сівыя пасмы, у някідкай кофтачцы і доўгай шэрай спадніцы, яна выглядала на саму пакору.

Дзверы ў пакой айца Аляксея адчыніліся ціха, без найменшага рыпу.

— Наталля Ціханаўна, прайдзіце, — паклікаў сваім басавітым мілагучным голасам святар, ледзь паказаўшыся ў праёме ашчэццем барады.

Наталля Ціханаўна ўвайшла, прысела на краёчак крэсла каля стала. Згорнуты плашч і валізку паклала на калені.

Бацюшка, як заўсёды румяны і жыццярадасны, сеў насупраць Ціханаўны ў сваё працоўнае крэсла — з высокай выгінастаю спінкай, якое выдавала на трон. Айцец Аляксей быў не стары мужчына, гадоў пяцідзесяці. Бухматую яго бараду сівізна ледзь кранула. У валасах слядоў яе зусім не было. Высокі, мажны, але не тоўсты, ён ствараў уражанне вельмі ўпэўненага ў сабе чалавека. Пераапрані яго ў цывільнае, згалі бараду — стане падобны да дырэктара якога-небудзь канцэрна. Надзень на яго даспехі — будзе былінны волат.

На прыхаджанку ён пазіраў цяпер неяк задзірыста, весела. І следу стомленасці не адчувалася ў ім пасля працяглага набажэнства.

— Бацюшка, — нарэшце прамовіла Наталля Ціханаўна, — вы ўжо выбачайце, што вас патрывожыла. Я многа часу не адыму. Тут вось...

— Наталля Ціханаўна, давайце без гэтага... без рэверансаў. Згода? — Айцец Аляксей усміхнуўся. — Даваць парады ў жыццёвых абставінах — гэта тое, для чаго я пастаўлены. Разнявольцеся і гаварыце смела, што вас хвалюе.

Сын, бацюшка. Цяпер толькі гэта ў мяне ў галаве... Адны падазрэнні, праўда, пакуль, айцец Аляксей, адны падазрэнні... Чуццё.

— Ну, матчына прадчуванне самае вернае. Расказвайце. І сядзьце вы як найлепш, абапрыцеся на спінку. Вось так.

— Бацюшка, каб ведаць, што не нашкодзіш, я б даўно яму ўсё прама сказала. Ды баюся лезці ў душу. Бездань там нейкая... Ведаеце, жэніць яго цяпер муж мой, Сямён Паўлавіч, на дачцэ вельмі багатага чалавека. Усё як быццам дамоўлена, абгаворана, а я адчуваю, што Пятрусь яшчэ для сябе канчаткова не вырашыў, будзе ён жаніцца ці не, што рыхтуе ў апошні момант фартэль... — У Наталлі Ціханаўны заняло дух, яна зрабіла паўзу.

— Ну-ну, вы не нервуйцеся так. Вады, Наталля Ціханаўна? — Бацюшка прыўстаў з крэсла.

— Ага, вады, калі можна...

Айцец Аляксей прайшоў да тумбачкі, што стаяла перад акном, наліў з графіна ў шклянку вады, папярэдне праверыўшы яе чысціню на святло. Паднёс Наталлі Ціханаўне. Тая хутка, прагна адпіла палову, паставіла шклянку перад сабой.

— Дзякуй, бацюшка. Здароўя няма, у роце сохне... А тут адны хваляванні... Справа ў тым, што для бацькі, мужа майго, вельмі важная тая жаніцьба... А сын адчуў гэта і яму на нервах іграе. Ужо і прапанову даўно рабіць пара, а Пятрусь марудзіць. І, акрамя таго, я дакладна ведаю, што сапраўды ён баіцца гэтай жаніцьбы, не для Пеці тая сям'я, не яго маштаб. Ён ціхі ў мяне, адзінотнік. Ні сяброў, ні зухаватых кампаній... Жанчыны толькі, вось дзе бяда... Грэшная я, даруйце айцец Аляксей, не справілася з гэтым. Жанчынамі ён залішне захоплены. Вельмі шмат іх у яго... Грэх. І без кахання ўсё. А проста так, дзеля цялеснага... Ну і там... Ох, баюся... — Яна сціснула галаву далонямі.

Святар правёў рукою па дагледжанай барадзе зверху ўніз.

— Хм... Скажыце, Наталля Ціханаўна, а каб ваш Пятро, акрамя ўсяго, стаў на шлях ліхадзейства, каб ён біў сваіх бацькоў, вымагаючы грошы? А такое ж бывае. Усё, Наталля Ціханаўна, пазнаецца праз параўнанне. Гэта я вам, канечне, адно прыватным чынам магу гаварыць. Афіцыйна звернецеся, пры народзе — асуджу. А з вока на вока — параю дзякаваць Усявышняму, што яшчэ не горшага сына ён вам падарыў. Дай Бог яму, Пятру вашаму, здароўя і даўгалецця. Перашалее, адумаецца. А жаніцца яму неабходна. Хай нават на дачцэ таго багатага чалавека. Чаго вы так баіцеся? Не бойцеся. Колькі распуснікаў і гулякаў сталі ўзорнымі бацькамі — не пералічыць. Бязбожнасць сынава, Наталля Ціханаўна, — вось што вас павінна найперш непакоіць. Гэта, як вам сказаць... гэта такі заганны патэнцыял, што можа чалавека адно ў прорву прывесці. Бегае ён па схілах варонкі, і кожны крок — па спіралі, ніжэй і ніжэй... Таму і жаніцца трэба вашаму сыну. Ды не марудзячы. Сямейнік можа ў Бога не верыць, але ж праз любоў да сям'і, бацькоўскія абавязкі, праз спачуванне, сужыцельства да Бога, глядзіш, і далучыцца. Адзінокаму ў бязбожнасці небяспечна, а сям'я — лякарства такім няшчасным...

— Эх, бацюшка, там і сям'я такая... бацька мусульманін, маці з каталікоў...

— А вось гэта нядобра вы кажаце, Наталля Ціханаўна. — Айцец Аляксей не пераставаў ледзь улоўна ўсміхацца. — Перад Госпадам усе роўныя, што кітаец, што эскімос, што амерыканец.

— А як жа, бацюшка... у Пісанні сказана, судзіце не па справах іхніх, а па веры іхняй... — сказала жанчына і сама спужалася сваёй смеласці; яна нават прыкусіла верхнюю губу.

— Там хіба сказана, па якой веры? — з найгранай строгасцю зірнуў на яе святар. — Там маецца на ўвазе сіла веры, а не прыналежнасць да пэўнай канфесіі.

— Ды якая там... гэта... канфесія. Бязбожнікі яны. Долар уся іх рэлігія...

— Гэта не нам судзіць, Наталля Ціханаўна.

— Прабачце, айцец Аляксей, хвалююся, грэшная. Ад таго немаведама што гавару. Даруйце... — Яна перабірала матузкі валізы ў нервовых пальцах; галаву, як і ўвесь час гутаркі, трымала пануранай. — Вось ледзь не забылася пра галоўнае, дзеля чаго да вас папрасілася... Выраз твару ў Петруся нейкі злавесны стаў. Баюся! А чаго баюся — выпадак з яго дзяцінства з памяці не выходзіць.

— Так-так. — Можа, упершыню твар святара набыў больш-менш сур'ёзны, адпаведны сітуацыі выраз.

— Як вам сказаць... Ну, карацей, у школе ён, у трэцім класе раз напракудзіў... Ды якое там напракудзіў — пасля гэтага бацька мусіў яго з той школы забраць... Паспрачаўся ён там з адным хлопчыкам на пераменцы, у класе, каля дошкі. Што яны не падзялілі — богведама. А хлопчык той з завадатараў быў, вечна ўсіх падбухторваў, чапляў, дрэнны такі хлопчык... І Пятрусь, пры аднакласніках, пры настаўніцы, якая сядзела за рабочым сталом, кінуўся на свайго крыўдзіцеля. Як ашалеў пры тым, мне расказвалі. Чырвоны, вочы вырачаныя збялелыя, вены на шыі надзьмуліся... Збіў з ног таго хлопчыка, калашмаціў рукамі-нагамі, указкай ссінячыў, парваў вопратку... Адцягнуць яго не маглі. Адцягваюць, а ён рукамі за пінжак таго хлопчыка — мёртвай хваткаю. І за валасы настаўніца цягнула, а ён як болю не адчуваў. Адарвалі толькі тады, калі на крык збегліся іншыя настаўнікі. А ў Петруся пальцы потым, далоні — да мяса здзёртыя, так чэпка трымаўся за пінжак... Адцягнулі, а ён супакоіцца не мог, як ліхаманка яго тузала. Мусілі выклікаць "хуткую", і толькі пасля ўколу Пятрусь сцішыўся.

— Угу... хм... — перхануў айцец Аляксей, так як суразмоўца ўзяла невялікую паўзу.

— Але дзіўна тое, бацюшка, што нічога ён потым успомніць не мог, — працягвала яна. — Напачатку думалі, што прытвараецца. Але не. Псіхіятры, да якіх мы Петруся потым вадзілі, пацвердзілі, што такое адключэнне памяці цалкам магчымае. Нават тэрмін навуковы назвалі, зараз не ўспомню... Божа мой, як жа мы з Сямёнам Паўлавічам тады напалохаліся! Дзякаваць Богу, без лячэння абышлося, і прыступ болей не паўтарыўся. Са школы, праўда, давялося сысці — бацькі астатніх дзяцей за сваіх пестуноў забаяліся. Але, бацюшка... паверце, усё жыццё як пад сякерай, у страху жыву, не выходзіць з памяці тое здарэнне.

— І вы думаеце...

— Ой, нават вымавіць баюся гэтыя словы. — Наталля Ціханаўна падняла вочы на святара; па левай яе шчацэ пракацілася слязінка. — Твар мне сынаў не падабаецца... Тут, канечне, чуццё больш падказвае.

— Правільна, што чуццю свайму давяраеце. Правільна, што прыйшлі да мяне, дарагая Наталля Ціханаўна. — Бацюшка крыху памаўчаў, пастукваючы пальцамі па стале. — Выпадак цяжкі, падманваць не стану. Як вам сказаць... Ёсць такое паняцце — апантаны нячыстым духам...

— О Божа, бацюшка, ды што ж гэта... — Няшчасная маці схапілася рукою за горла, сутаргава хапала паветра.

— Не хвалюйцеся, напрамілы Бог, Наталля Ціханаўна. — Айцец Аляксей пацягнуўся праз стол і паклаў сваю вялізную далонь на яе руку. — Я магу гаварыць толькі праўду, якой бы цяжкай яна ні была. Дакладней, няпраўды не магу гаварыць. Але ж гэта не значыць, што сказанае мной у поўнай меры тычыцца вашага сына. Рэальнай сітуацыі, ісціны, я не ведаю. І ніхто не ведае, апроч Бога... Тым не менш, дарагая, нам з вамі трэба быць пільнымі.

— Ой, як я баюся вашых слоў... — Наталля Ціханаўна каторы раз перахрысцілася.

— Не бойцеся. Уратуемся верай. — Паўза. Пастукванне тоўстымі пальцамі па стальніцы. — Хм... Злыя духі, адвечныя нашы ворагі, умеюць падсяляцца да абранай ахвяры цішком. Умеюць таіцца, вонкава праяўляючыся толькі зрэдку, або зусім да пары да часу не праяўляюцца. Чаму яны выбіраюць таго ці іншага чалавека — невядома. Ён, мабыць, у гэтым больш не вінаваты, чым вінаваты... Расце такі чалавечак, гадуецца ў нармальнай сям'і, усмешлівы і добразычлівы. І раптам азмрочваецца яго душа, кісне, аддаляецца ад людзей. Ён можа замкнуцца ў сабе, а можа не страціць якасцяў дружбы і вернасці. Апантаныя дэманамі бываюць самотныя, а бываюць, наадварот, празмерна сацыяльна актыўныя. Але ж актыўнасць іхняя не з любові, а з нянавісці да людзей. Будучы ў цэнтры ўвагі, яны адзінокія не менш, чым апантаныя дэманам першага тыпу. Наталля Ціханаўна, вады?..

— Дзякуй, дзякуй, бацюшка. Нічога, нічога, я вып'ю. — Яна няпэўнай рукой узяла шклянку, прыпала да яе вуснамі, але больш за глыток зрабіць не здолела.

— Мацуйцеся, помніце пра Збавіцеля. Калі цяжка, вобраз Яго ўявіце найсветлы. І страх як вадой змые. — Святар глядзеў на прыхаджанку цёпла, ласкава. — У нашым выпадку, наколькі я бачу, варта звярнуць увагу на апантаных першага тыпу... Падкрэсліваю, я не сцвярджаю, што Пятро адносіцца да іх ліку, але... — Ён уздыхнуў, звыкла агладзіў бараду, працягваў: — З нашых ранейшых сустрэч я зразумеў, што сын ваш дзічыцца людзей. Жыве адзін, жаніцца думкі не мае... Дакладней, не меў, бо цяпер сітуацыя можа выправіцца...

— Не ведаю нават, што лепш...

— Пры тым, не намерваючыся жаніцца, Пятро надзвычай цікавіўся жаночым полам. Аднак са шматлікімі жанчынамі душэўна не блізкі. Няма ў яго і сталых сяброў... Слушна я гавару?

— Усё так, — бездапаможна пазірала на святара Наталля Ціханаўна.

— Што ж, будзем маліцца, — сказаў айцец Аляксей, крыху памаўчаўшы. — Маліцца, каб нашы найгоршыя падазрэнні не спраўдзіліся. Сачыце за сынам, і мне, калі што, дакладвайце. Хацелася б з ім пагутарыць, але ж ведаю, у царкву такія людзі не пойдуць. Ганарлівасць, замяшаная на бязбожнасці, — страшэнны біч нашага часу.

— А адчытка... Кажуць, яна можа дапамагчы.

— Ёсць... Вядома ж, ёсць свяшчэннікі, што яе робяць. І ў Мінску такіх можна знайсці. — Айцец Аляксей нахмурыўся. — Я не прыхільнік адчыткі, а можа, нават праціўнік. Складаная, неймаверна адказная гэтая працэдура. Можна такія сілы спарадзіць да жыцця, якіх у душы апантанага дагэтуль і не было. Акрамя таго, у царкву ваш Пятро, паўтараю, не пойдзе. Дый не ведаем мы, ці жыве ў душы яго дэман. Будзем спадзявацца, што не жыве... Сачыце, паўтараю, сачыце, дарагая, за сынавым тварам. Твар многае можа сказаць... І я штодня буду маліцца, у спісы яго ўнясу.

— Эх, бацюшка, каб толькі не позна было...

— З Божай дапамогай, Наталля Ціханаўна... Уціскам, папрокамі тут не возьмеш. Толькі цярпеннем, любоўю. А Хрыстос на нашы малітвы ўвагу зверне і пашле збавенне Пятру... Я спадзяюся. У якой яно будзе форме — то таямніца. Часта падзенне ў чалавечых вачах насамрэч выратаваннем з'яўляецца. Нязведаны шляхі Гасподнія. Галоўнае, каб чалавек, якога мучыць нячысцік, канчаткова ад Бога не адвярнуўся. Ён можа ў нейкай меры людскія законы праігнараваць, а на Госпада апошняе спадзяванне не страціць... Толькі б захаваць якое каліўца веры — і Хрыстос працягне руку.

...З нялёгкім сэрцам выходзіла Наталля Ціханаўна з царквы. Непраглядны вечар пачатку лістапада азмрочыў яе і без таго засмучаную душу. Праваруч ад царквы цягнуўся вялізны прыватны сектар. Панылая, дрэнна асветленая вуліца. Адзінокія ліхтары люструюцца ў лужынах. Перабрэхваюцца сабакі. Каля далёкай калонкі хістаецца постаць кабеты з вядром... За царквой — чуйнае вуха ўлавіла — голас непрыемны раздаўся: лямант і выкрыкі. Скаланулася Наталля Ціханаўна: гэта Сцёпка, юродзівы. Вось жа прынесла яго нялёгкая. Скандальны, гарласты, прычэплівы абарванец. Часта ён тут з'яўляецца, але ўсё больш — на людзях, пасля заканчэння службы юродствуе. І кожны раз выхадкі ў яго новыя. Баіцца яго Наталля Ціханаўна. Таму шпарчэй затэпала па царкоўным дворыку, вышмыгнула з брамкі, налева збочыла, перайшла на процілеглы бок вуліцы — там няма ліхтароў, — і ў цяньку пашыбавала да пусткі. А Сцёпкаў крык, здаецца, мацнее, надрыўны такі, злавесны, на высокія ноты ўздымаецца і раптам пераходзіць на бас.

Хрысціцца Наталля Ціханаўна на хаду і з торбачкай сваёй спяшаецца праз цемру да аўтобуснага прыпынку.

Леапард

Нарэшце я падыходзіў да дома Гаспадара з чыстым сумленнем. Прыспеў мой час. Я дачакаўся сталага снегу. Тры дні валіў снегапад, такі, што я не мог носа высунуць з дома. Гурбы дасягалі акон першага паверха. Дворнікі доўга і няспынна шчыравалі, перш чым прабілі нешырокія сцежкі. Людзі рушылі па іх да аўтобуснага прыпынку па пояс у снезе. Легкавікі не маглі ні заехаць, ні выехаць з двара. Яны чакалі адмысловай машыны.

Я выйшаў уранку, калі яшчэ не былі патушаны ліхтары, але світанне паціху займалася. Марозны ўтаптаны сняжок парыпваў у такт маіх крокаў. Сцяжына была нагэтулькі вузкая, што я насілу размінаўся з рэдкімі прахожымі, што ішлі мне насустрач.

Пакалыхваючыся ў аўтобусе, я наталяўся выглядам горада. Гэта была нейкая казка. Аўтобус ішоў, нібы ледакол у якім запалярным моры. Бела, чыста, некранута кругом. Цяпер Гаспадар не асмеліцца пракнуць, што я прыйшоў раней часу...



Вось знаёмы пад'езд, да якога давялося прабівацца праз сумёты, што даставалі да жывата. Ад яго не вяло слядоў. Гэта мяне, між тым, не моцна здзівіла. Сверб ад прадчування найжаданай сустрэчы перабіваў усё: абачлівасць, разважлівасць, насцярогу.

Ціха каля пад'езда. Ціха ўнутры. Але то была незвычайная ціша. Яна абвастрыла ўсе пачуцці мае і адкрыла нейкае новае пачуццё. Немаведама чым я лавіў дыханне і рык леапарда. Я ведаў напэўна, што наўкола ўсё змянілася, што сустрэча з Гаспадаром пойдзе сёння ў іншым кірунку. Выпаў мокры снег. А гэта не жарты.

Дзверы падаліся, ледзь я паспеў дакрануцца да ручкі. Гасцінна сустрэла мяне вітальня. Там упершыню гарэла святло. Зрэшты, не вельмі моцная лямпачка пад столлю, але яна здалася мне самім сонцам. З кухні прыемна пахла вараным мясам. Лунаў лёгкі дымок — відаць, палілася печка, аб гэтым сведчыла незвычайная цеплыня, што сустрэла мяне, прышэльца з марозу. Дзверы ў залу былі адчынены шырэй, чым іншым разам. Адтуль даносіліся жвавыя гукі. Я паспяшаўся ў залу.

— Рады вітаць вас, — прамовіў я на парозе. — Можна ўвайсці?

— Ён яшчэ пытаецца! — адказаў мне памаладзелы, рухавы стары; ён стаяў пасярод пакоя са швабрай у руках. — Як не трэба, ад яго не адбіцца было. Як прыйшоў час, ён марудзіць. Я чакаў цябе з учарашняга апаўдня...

— Была непраглядная завіруха. Я збаяўся, што заблукаю, — нязграбна апраўдваўся я, праходзячы ўнутр. Па звычцы зняў свае грубасткія чаравікі.

Кіліма на падлозе не было, паколькі ішло прыбіранне. Ён стаяў скручаны і прыхілены да сцяны.

— Залазь на маё месца. — Гаспадар указаў на канапу. — Сёння мы як бы памяняемся ролямі.

— У якім сэнсе? — Я ўжо ўзлез з нагамі на мяккі плед.

— У тым сэнсе, што табе не давядзецца выцягваць з мяне слова за словам і прасіць паказаць леапарда. Ён прачнуўся, калі гэта цябе цікавіць. І можаш неўзабаве на яго паглядзець.

— Я ведаў гэта. Інакш і быць не магло. Я адчуваў яго рухі яшчэ на лесвіцы. А цяпер на свае вушы чую, як ён варочаецца і сапе на балконе. Чаму б вам не растуліць шторы, каб пільнаваць яго ўвесь час?

— О, я на яго нагледзеўся за доўгі свой век. Гэта забаўка для маладых. Да таго ж тут не звярынец.

— Вы, мусіць, наўмысна выпрабоўваеце маё цярпенне. — Я сам не заўважыў, як пачаў заводзіцца і нервавацца праз меру.

— Што ты! Наадварот, — супакоіў стары. — Я бачу цябе адзіным вартым кандыдатам на гэтую ролю. Так што не бойся, і лічы, што твой час надышоў.

— Я гэта ведаю. І таму я тут.

— Ну тады хадзем. — Гаспадар прыставіў швабру да сценкі; вышараваная падлога адбівала лямпачкі люстры. — Хадзем, раз ты такі няўрымслівы.

Я з гатоўнасцю саскочыў з канапы.

— Надзень свае чаравікі, — параіў стары. — На балконе будзе халаднавата. — Ён адхінуў адну шторыну, аднак святло зімовага дня чамусьці не палілося ў пакой — на балконе панавала цёмная ноч.

Заінтрыгаваны, я паспяшаўся за Гаспадаром, які ўжо адчыняў балконныя дзверы.

Ён ступіў за іх і знік, як растварыўся. Секунду павагаўшыся, я рушыў за ім і апынуўся ў непраглядналй цямрэчы.

— Ідзі на гук майго голасу і маіх крокаў, — пачулася прыглушанае настаўленне. — Той, хто хоча назіраць леапарда, павінен быць смелым і чуйным, як гэты звер.

— Добра. Я чую вас і рушу за вамі. — Голас мой прагучаў, як не свой; дзіўная акустыка памяшкання яго моцна сказіла.

Я асцярожна крочыў наперад і дзівіўся, чаму за дзвярыма аказаўся не балкон, а нейкі доўгі, неасветлены і затхлы калідор.

— Зараз будзем пераходзіць ручай, — данеслася да мяне даволі здалёк.

Я апасліва сцішыў хаду.

— Прыслухвайся да цурчання вады. Ручай вузкі, але глыбокі, — папярэдзіў Гаспадар.

Я пачуў бег вады ля сваіх ног, зажмурыўся і штосілы адштурхнуўся ад долу. Вада цурчэла ўжо за маёй спінай.

— Цяпер прытуліся да правай сцяны, — скамандаваў Гаспадар, — і руш, пакуль не адчуеш пралаз на ўзроўні грудзей. Пралазь у яго і падымайся па лесвіцы.

Я дакладна выканаў інструкцыі майго правадніка. Праўда, пралаз аказаўся настолькі вузкім, што ў нейкі момант я жахнуўся, што захрасну там назаўсёды: перахапіла дыханне, ногі аслабелі, да душы падступіў адчай. Аднак я, нібы той леапард, выкруціўся, выслізнуў з каменных абдымкаў і пластом упаў на падлогу.

З цеснага памяшкання выхад быў адзін — лесвіца, што вяла ўверх. Крутая, з высокімі прыступкамі. Я вобмацкам, натужліва ўзбіраўся па ёй.

На шчасце, хутка дыхнула свежым паветрам, і праз колькі секунд я апынуўся на балконе трэцяга паверха звычайнага чатырохпавярховага дома. Адтуліна, з якой мы вылазілі, аказалася проста пад акном, леваруч ад дзвярэй, і было незразумела, як такое магчыма.

Але тады я быў настолькі ўзбуджаны доўгачаканай сустрэчай з драпежнікам, што не задумваўся над дзівосамі таемных тунеляў, па якіх вёў мяне Гаспадар.

Пах вялікай і дужай жывёліны адразу ж дайшоў майго нюху. Ён сыходзіў ад кучы зляжалага, ацярушанага снегам восеньскага лісця, што знаходзілася ў правым куце прасторнага, я б нават сказаў — празмерна прасторнага балкона.

Гаспадар стаяў ля кучы, падкалупваючы чаравікам верхні слой лісця. Нарэшце ён беспардонна піхнуў кучу нагой.

Тут жа раздалося незадаволенае бурчанне, менавіта бурчанне, а не грозны рык бязлітаснага драпежніка.

— Ён яшчэ не канчаткова прачнуўся, а таму мы зможам яго толькі чуць і бачыць, як варушыцца лісце.

Леапард, нібы ў пацвярджэнне тых слоў, тузануўся пад сваім покрывам і санліва ці то гыркнуў, ці то пазяхнуў.

— Калі ж адбудзецца канчатковае абуджэнне? — крыху расчаравана спытаў я ў хітравата-ўсмешлівага Гаспадара.

— А табе так карціць даваць ад яго драла? — уеў ён мяне. — Ты, хлопча, яшчэ дрыжыш, а драпежнік чуе чалавечую слабіну. Утаймаваць яго ты пакуль не гатовы.

— А вы нашто? — дзёрзка і пакрыўджана адказаў я.

— Я гэта я. А ты гэта ты. Той, хто жадае займець леапарда, павінен сам яго ўтаймоўваць.

— Дык вы дасце мне яго ва ўласнае карыстанне? — Я быў усцешаны словамі бывалага чалавека.

— Я вельмі хачу, і нават абавязаны гэта зрабіць. — Гаспадар ледзь прыкметна мне падмыргнуў. — Абавязаны таму, што дні мае злічаны. Усё на гэтым свеце мае канец, якой бы доўгай і пакутнай ні была наша дарога. Толькі леапард вечны на гэтай зямлі, і яму нельга без гаспадара.

— І таму я тут?

— І таму ты тут. Каб узяць у мяне эстафету.

— І абуджэнне несумненна адбудзецца?

— Гэтак жа несумненна, як тое, што дзень зменіцца ноччу. Будзем чакаць.

— Будзем чакаць... — паўтарыў я, аддана пазіраючы ў вочы свайму настаўніку.

З балкона ён вывеў мяне проста праз дзверы, за якімі аказалася знаёмая зала, а не таямнічы тунель.

Я быў уражаны і ўсе наступныя дні знаходзіўся ў неадчэпным хваравітым экстазе.

«Ветах» над Еўропай

Фальклорны фестываль Еўрапейскага вяшчальнага саюза (ЕВС) на працягу многіх гадоў з'яўляецца адной з найбольш значных падзей у культурным жыцці Еўропы. Ён вядомы не менш, чым папулярны тэлевізійны конкурс песні "Еўрабачанне". Гэта не проста фэст, а жывая панарама напрамкаў, стыляў, тэндэнцый, якія існуюць у сучаснай фальклорнай музыцы. Заўважны штрых у гэтую панараму ўносяць беларусы.

У першыя гады свайго існавання фестываль збіраў удзельнікаў з Заходняй Еўропы, бо ў 1980-ыя ў ЕВС уваходзілі толькі заходнія вяшчальныя кампаніі. На пачатку 90-х, пасля вялікіх змен у Еўропе, фестываль ператварыўся ў музычную трыбуну для ўсіх еўрапейскіх музыкантаў. Ён прайшоў у Венгрыі, двойчы — у Польшчы, а яшчэ ў Чэхіі, і летась — у Расіі. За гэты час на фестывалі выступіла больш як 500 ансамбляў амаль з усіх краін нашага кантынента, а таксама прадстаўнікі Аўстраліі. Для многіх вядомых сёння калектываў гэты фестываль стаў першай прыступкай у творчай кар'еры. Галоўная мэта яго арганізатараў — паказаць разнастайнасць і багацце еўрапейскіх музычных тэндэнцый. Але не менш важна і іншае: абарона ды папулярызацыя фальклорнай музыкі, падтрымка яе новых напрамкаў. Канцэрты фестывалю адрасаваныя шырокай публіцы. А колькасць удзельнікаў дэманструе, наколькі важная і запатрабаваная фальклорная музыка сёння ў Еўропе і за яе межамі. Усе выступленні запісваюцца і гучаць у эфіры радыёстанцый, якія ўваходзяць у ЕВС.

"Беларускі народ з'яўляецца адным з самых заглыбленых у сваю песенную творчасць народаў Еўропы. Наша культура незвычайнай прыгажосці, незвычайнай моцы", — такую выснову зрабіў калісьці Рыгор Шырма. І яе слушнасць пацвердзілі беларускія артысты на сёлетнім, XXX фальклорным фестывалі ЕВС, які адбыўся ў Кёльне.

У ім удзельнічала 15 радыёстанцый з 12 краін Еўропы. А калі дадаць яшчэ краіны, якія прымалі трансляцыі фестывальных імпрэз, то маштаб падзеі значна пашыраецца. Музычныя калектывы выступалі з 40-мінутнымі праграмамі і прадэманстравалі свой падыход да інтэрпрэтацыі фальклору, сваё разуменне такой музыкі ў наш час. Напрыклад, артысты з Германіі спалучылі акадэмічныя харавыя спевы, джазавыя імправізацыі і клаунаду. Атрымаўся свайго роду нямецкі "лубок". Сцепаніда Барысава з Якуціі стварала на сцэне атмасферу шаманскіх дзеянняў і прадэманстравала так званыя якуцкія гарлавыя спевы, якія адрозніваюцца ад тувінскіх своеасаблівай галасавой вібрацыяй. Гэта былі два полюсы, паміж якімі існуе сучасны фальклор, — тэатралізацыя і глыбінныя пласты. А вось калектыў з Бельгіі на аўтэнтычных інструментах выконваў сучасную музыку — г.зв. фальклор без межаў і адметнасцей. Этнаджаз прадэманстравала група "Трыгон" з Малдовы (яна прадстаўляла "Радыё Расіі"). У выкананні гэтых віртуозных музыкантаў яўна адчуваўся ўплыў мастацтва лаўтараў, былі і варыяцыі ў малдаўскім стылі на "Танец з шаблямі" А. Хачатурана. Музыканты з Іспаніі і Чэхіі, Польшчы і Швейцарыі, Харватыі і Нарвегіі дэманстравалі свае тэмбравыя пошукі і гукавыя знаходкі, хтосьці — імкненне быць арыгінальным, хтосьці — эпатажным...

Слухала я два дні, з чаканнем адчуць у музыцы нацыянальную адметнасць кожнай краіны — і не знаходзіла гэтага. Вельмі хвалявалася за наш "Ветах" (Вячаслаў Калацэй, Таццяна Пладунова — выкладчыкі спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" БДУ, студэнты Павел Ляшок, Алесь Масібут, Вячаслаў Красулін).

У паўночнай Беларусі "ветахам" называлі месяц у трэцяй квадры. Група пад такой назвай з'явілася на беларускай музычнай сцэне ў канцы 1990-х, калі выканаўцы розных стыляў і жанраў шукалі карані культурнага самаўсведамлення. Стваральнік і кіраўнік "Ветаха" В. Калацэй выступае за чысціню захавання традыцыі ва ўсіх яе праявах: аўтэнтычных інструментах, галасах, строях. Група наведвае вёскі, якія зрабіліся свайго роду фальклорнымі запаведнікамі (абрады, традыцыі выканання маюць афіцыйны статус помнікаў нематэрыяльнай культуры беларусаў і ахоўваюцца дзяржавай). Музыкі ўдзельнічаюць у абрадах, спяваюць разам з бабулямі. А стыль свайго гурта вызначаюць як «пост-фальклор» (другасныя формы вясковай музычнай культуры, якія існуюць ва ўмовах горада). Механічныя копіі традыцыйнай музыкі, аднак, ніколі не з'яўляліся самамэтай для «Ветаха». Ад каранёвага меласу ён бярэ перадусім стыль музычнага мыслення, манеру гуказдабывання, тэкставую аснову рэпертуару. Нягледзячы на неблагую музычную адукацыю, удзельнікі гурта ў сваіх партытурах ніколі не «расфарбоўвалі» манадыйны і поліфанічны мелас Беларусі гамафонна-гарманічнымі структурамі нямецка-італьянскай акадэмічнай музыкі.

Думала, ведаю пра "Ветах" усё: чула і песні, і інструментальную музыку, але падчас фестывальнага канцэрта ў Кёльне з новай цікавасцю сачыла за яго выступленнем, за тым, як песня змянялася танцам, потым інструментальным найгрышам. Усё адбывалася вельмі прадумана, драматургічна тонка. А ўспрыманне музыкі эмацыйна ўзмацнялі мультымедыйныя сродкі: этнаграфічныя фотаздымкі XIX — XX стст., відэазапісы фальклорных экспедыцый самога "Ветаха" і знакамітага беларускага этнамузыколага Зінаіды Мажэйкі. Гэтае выдатнае мультымедыйнае слайд-шоу зрабіў В. Красулін — з глыбокім адчуваннем характару музыкі. І як цудоўна спалучыліся непаўторныя песні і старыя фотаздымкі вясковых музыкаў, беларускія краявіды, інтэр'еры традыцыйных хат, якія яшчэ ёсць у нашым краі! "Ветах" выступаў квінтэтам: дзве дуды — В. Красулін і В. Калацэй, скрыпка — А. Масібут, ударныя — П. Ляшок, спевы — Т. Пладунова. У працэсе выканання інструменты мянялі: напрыклад, ігралі на керамічных ударных, В. Калацэй акампанаваў спевам на гуслях. Аснову фестывальнай праграмы складала гадавое каляндарнае кола песень, прымеркаваных да сезонаў, інструментальныя нумары, побытавыя танцы... Вельмі яркі прагучалі і мужчынскія спевы (валачобная і рэкруцкая песні). Праграма беларусаў не давала гледачам нават адвесці вочы ад сцэны — столькі тут было прыцягальнага: інструменты, строі, галасы, музыкі...

"Ветах" быў найбольш аўтэнтычны з усіх гуртоў на фестывалі. І зноў пацвердзіў тое, што ў Беларусі традыцыйная культура дагэтуль жывая не толькі ў сваіх носьбітах, але і ў яе пераемніках. Вось што кажа салістка Таццяна Пладунова: "Самае галоўнае — гэта камунікацыя, зносіны праз гук адзін з адным, з прыродай, наваколлем. Мы імкнёмся праз песню адчуць бесперапыннасць быцця. На фестывалі публіка і адчула жывы нерв нашага выканання. Гэта была жывая энергія пераходу аднаго сезона ў другі, адной формы быцця ў другую. Гледачы Еўропы дзівіліся гэтай разнастайнасці нашага эмацыйнага быцця".

У Кёльне са сцэны гучалі інструменты, якія вырабілі беларускія майстры: дуды — Віктар Кульпін, гуслі — Вадзім Пархімовіч, дудкі — Алесь Жукоўскі, керамічныя ўдарныя — Андрусь Шабар.

Традыцыя "Ветаха" — гэта не толькі разнастайнасць у музыцы, але і разнастайнасць аблічча. Музыканты імкнуцца захаваць этнаграфічную версію беларускіх строяў. Напрыклад, Таццяна Пладунова спявала ў вялікім "плаце" — хусціне даўжынёю 3 метры, якую адмыслова трэба павязаць. Салістка кажа, што ў гэтым маларыцкім строі яна пачувае сябе каралевай. Мужчынскія строі прыдумала мастачка Людміла Бажок, скарыстаўшы прыкметы іх мадэляванні этнаграфічныя фотаздымкі і відэазапісы. Паясы рабіла Ніна Сакалова-Кубай.

Беларускіх артыстаў павіншавалі з цудоўнай праграмай гаспадары фестывалю, музычныя прадзюсеры, прадстаўнікі кіраўніцтва ЕВС, а музыкант і прадзюсер са Швейцарыі П'етра Б'янка сказаў, што пасля нашых танцаў і песень захацелася прыехаць у Беларусь, каб самому паўдзельнічаць у вясковых святах.

Сапраўды, гэта быў наш трыумф. Усе мы адчулі гонар за нашу краіну, яе таленавіты народ. І як бы пафасна гэта не гучала, а перажыць такое пачуццё было варта, каб зразумець, якім багаццем мы валодаем, як трэба яго зберагаць для нашчадкаў. Бо спрычыніўшыся да яго, мы сапраўды адчуваем сябе годнымі жыхарамі самабытнай і цудоўнай краіны — Беларусь!

Таццяна ПЕСНЯКЕВІЧ,
сакратар праўлення Беларускага саюза кампазітараў, спецыяльны карэспандэнт Беларускага радыё

На здымках: "Ветах" у Кёльне.

Бэбі-бум. Творчы!

Пра гэтую выстаўку, што сталася адным з найбольш арыгінальных сёлетніх праектаў сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", успамінаеш як пра свята. Свята дзяцінства, з якога родам усе мы.

І ў наведнікаў выстаўкі "Бэбі-бум!", і ў яе экспанентаў былі па-дзіцячы прасветленыя твары, пазітыўны настрой. Вернісаж удаўся! І разам з усімі ўдзельнікамі праекта радаваўся яго куратар — дырэктар галерэі "Універсітэт культуры" мастак Дзяніс Барсукоў, для якога сама тэма дзяцінства ды вобразнасць па-дзіцячы шчырага светаўспрымання з'яўляюцца прыярытэтамі ва ўласнай творчасці. Паводле яго слоў, галоўны сэнс праекта "Бэбі-бум!" у тым, каб вобраз дзіцяці, свет дзяцінства, напоўнены фантазіямі і гульнямі, першымі радасцямі і засмучэннямі, прадставіць праз творы маладых беларускіх мастакоў, скульптараў, фатографаў, дызайнераў.

"У душы кожнага сапраўднага мастака ёсць "дзіцячае", непасрэднае ўспрыманне свету, якое дапамагае яму глядзець на звыклыя рэчы па-іншаму, — разважае Д.Барсукоў. — Успаміны дзяцінства для многіх мастакоў з'яўляюцца ўспамінамі пра "страчаны рай", вярнуць які можна толькі ў сваіх работах. Хаця б ва ўласным мастацтве аднавіць дзіцячае ўспрыманне свету — вось чым кіруюцца творцы, якія працуюць у дзіцячай тэме". А такіх творцаў нямала. Спрычыніцца да праекта "Бэбі-бум!" поруч з творчай моладдзю захацелі нашы прызнаныя майстры. І атрымалася багатая на свежыя, нестандартныя, гожа ўвасобленыя ідэі, у лепшым сэнсе слова сямейная выстаўка: цікавая для гледачоў розных узростаў, адметная творамі мастацкіх дынастый (Аракчэевых, Івановых, напрыклад).

Галерэя "Універсітэт культуры", БДУ культуры і мастацтваў ажыццявілі такі кранальны, прасякнуты гуманістычным духам, выставачны праект разам з Прадстаўніцтвам ААН у нашай краіне. Вось што сказаў з гэтай нагоды Прадстаўнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі Антоніус Брук: "Нам выпаў вельмі высокі гонар падтрымаць правядзенне выстаўкі "Бэбі-бум!". Акрамя работ беларускіх творцаў, якія адлюстроўваюць розныя бакі дзіцячага жыцця, наведнікі ўбачылі фотавыстаўку пра дзяцей-салдат і дзяцей-ахвяр вайны, падрыхтаваную на аснове здымкаў ваенных фатографаў. Абарона дзяцей ва

ўмовах узброеных канфліктаў з'яўляецца адным з самых вострых пытанняў на парадку дня ААН, і сусветная супольнасць абавязаная выступаць супраць гэтага парушэння правоў дзяцей. А Беларусь павінна ганарыцца тым, што ў гэтай краіне дзеці ўжо многія гады жывуць пад мірным небам..."

С. ВЕТКА

На здымках: Стас Сугінтас "Ваня Гогаў"; Вадзім Качан, з серыі "Свята горада; Таццяна Гомза "Бычок"; "Дар'я Іванова "Чароўныя сны".



Музыка радасці

На завяршэнне Года культуры Расіі ў нашай краіне, у працяг даўняй традыцыі міжнароднага супрацоўніцтва і ў азнаменаванне свайго 70-годдзя, Нацыянальны мастацкі музей Беларусі парадаваў аматараў жывапісу прэм'ерай. Прэм'ерай вялікай мажорнай сімфоніі, якая гучыць гэтымі днямі ў цэнтральнай галерэі музея.

"Сімфонія фарбаў. Уладзімірскія мастакі-жывапісцы" — выстаўка, якая ўпершыню прадстаўляе беларускім гледачам унікальную з'яву рускага выяўленчага мастацтва другой паловы XX стагоддзя і яе сённяшнія тэндэнцыі. Магчымасць асэнсаваць гэтую з'яву, паглядзеўшы каля паўтараста дзівосных карцін з прыватных збораў, мы атрымалі дзякуючы сябру НММ Беларусі — маскоўскаму калекцыянеру-асветніку (між іншым, колішняй мінчанцы) Алене Ахулкавай і падтрымцы пасольства Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне.

Разважаючы пра феномен уладзімірскага пейзажу, Алена Мікалаеўна параўноўвае яго з французскім імпрэсіянізмам. Відавочна, у тым сэнсе, што ні тое, ні другое не варта называць мастацкай школай: проста на аснове пэўных эстэтычных памкненняў блізкіх па духу творчых асоб узнік непаўторны, адзінкавы напрамак у жывапісе. У гэтым хаўрусе кожны прывабны сам па сабе: хтосьці з мастакоў-уладзімірцаў уражвае шыкоўным колерам, іншы не мае роўных у валоданні малюнкам, а наймоцны бок работ іх калегі — кампазіцыя. Сабраныя разам карціны дапаўняюць адна адну, утвараючы гарманічную "сімфонію фарбаў".

Зразумела, нарадзілася яна не з цішыні дый не з выяўленчага хаосу. Усё-ткі спачатку была школа. І школа слынная, з глыбокімі старажытнымі традыцыямі. Рускае сяло Мсцёра, што ва ўладзімірскім краі, вядомае як асяродак мастацкай адукацыі, іканапісу ды народных промыслаў, на пачатку і ў сярэдзіне мінулага стагоддзя прываблівала таленавітую моладзь з горада Уладзіміра і яго наваколля: мясцовае вучылішча рыхтавала майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тут і пачыналі свой творчы шлях Кім Брытаў, Валерый Какурын ды Уладзімір Юкін, заснавальнікі свежай самабытнай плыні ў рускім пейзажы, якая пасля 1960 года (іх дэбют на маскоўскай выстаўцы "Советская Россия") заўважна і годна ўвайшла ў еўрапейскі мастацкі працэс. Дэкаратыўна кідкі, сакавіты і пастозны ("мазистый" — кажуць так), дзёрзка плоскасны, са знарочыста няроўным, фактурным грунтам (бывала, у яго падмешвалі муку, пілавінне, крупы, нават хлеб!) "рэгіянальны" жывапіс ігнараваў выяўленчыя каноны. А галоўнае — успрымаўся як тэмпераментны выклік традыцыйна стрыманаму па каларыце маляванню сціплай прыгажосці сярэднерасійскіх краявідаў. Уладзімірскіх навацараў не толькі прымалі "на ўра": былі такія, хто абураўся іх "безыдэйнай", "прымітыўнай", "няправільнай" творчасцю. Але ўжо ў 1975 годзе выстаўка незвычайных пейзажаў з трыумфам вандравала па розных краінах, і сёння лепшыя работы ўладзімірскіх майстроў ёсць у расійскіх і замежных музеях, у тым ліку — у Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква), у Рускім музеі (Санкт-Пецярбург).

Беларускія мастакі старэйшага пакалення памятаюць, які ажыятаж выклікалі карціны іх уладзімірскіх калег на ўсесаюзных выстаўках. Гэта была своеасаблівая праява "адлігі" 1960-х. Аднак за вонкавай арыгінальнасцю заўсёды адчувалася сур'ёзная ўгрунтаванасць мастацтва ўладзімірскіх жывапісцаў у глыбінныя традыцыі сваёй зямлі, у магутны пласт народнай культуры. І наведнікі цяперашняй выстаўкі ў Мінску, углядаючыся, "услухоўваючыся" ў мажорную сімфонію фарбаў, могуць прасачыць вытокі гэтай эстэтычнай сістэмы: іканапіс, мсцёрская лакавая мініяцюра, даматканы ходнік, коўдра з абрэзкаў, уладзімірская вышыўка гладдзю... А, можа, і набыткі еўрапейскага прафесійнага выяўленчага мастацтва 1920-х? Пэўна, так, бо ў старых майстроў з'явіліся сучасныя паслядоўнікі, якія шукаюць уласную стылёвую адметнасць.

Простыя і лаканічныя сюжэты са звычайнымі аб'ектамі: дворыкі, хаціны, храмы, стажкі, бярозкі, вада, снег, постаці людзей... Але якое арыгінальнае, радаснае, добрае і любаснае ўспрыманне гэтых будзённых рэалій перадаецца праз жывапісныя кампазіцыі гледачам! Ты адчуваеш цеплыню мастакоўскага погляду і нібы ўсміхаешся яму ў адказ, у захапленні ад таго, што з белым снегам і ярка-блакітным небам суседнічаюць шэравогненна-бэжава-малінавыя кроны дрэў, а поле пралягае зялёна-бірузовай паласой (Валерый Какурын "Ветрана"). А следам — новае захапляльнае ўражанне: неба колеру зямлі, поле колеру... вінегрэту, за ім — барвовыя бярозкі, на ім — зялёна-жоўты стажок з бурачкова-"вінегрэтавым" каптурком на макаўцы ды свіран пад аранжавым дахам, ад якога кладзецца на поле васільковы цень (Валерый Какурын "Вясна"). Нібы малюнак з кніжкі дзяцінства — вясёлыя, сонцам аблашчаныя караблі на сіняй вадзе ля ружовага берага, пад назваю... "Ля пірса рыбкалгаса" (Кім Брытаў). Мяккія абрысы і мяккі гумар у абліччы "Дамы з казой" (Уладзімір Севасцьянаў): вясковая кабета ў белай хустцы з белым непрамаляваным тварам трымае на шворцы белую козачку, падобную, дарэчы, да распаўсюджанага персанажа віцебскіх рэмінісцэнцый Марка Шагала. Вабяць па-левітанаўску залаталістыя, але не палевітанаўску аптымістычныя восенькія бярозкі Валерыя Ягорава ("Раніца на Елнаці", "Широка страна моя..."). Праўду кажуць: пра музыку цяжка распавядаць, яе трэба слухаць. Вось і жывапіс уладзімірскіх мастакоў — зусім як музыка: не паддаецца пераказу. Нездарма назвалі выстаўку "Сімфонія фарбаў". Дык што яшчэ дадаць? Схадзіце. Гэта варта паглядзець!

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: Кім Брытаў "Хутка вясна" (1968); Дзмітрый Холін "Вербная нядзеля" (2007); першыя гледачы; сеанс пескаграфіі падчас вернісажа.

Фота Кастуся Дробава

Важней за словы...

Упершыню ў экспазіцыйнай прасторы Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура "гасцявалі" дзіцячыя малюнкі — работы выхаванцаў творчай майстэрні "Фарба" (кіраўнік Дзмітрый Ярмілаў). Іх выстаўка ладзілася падчас творчай акцыі "Важней за словы...".

Сур'ёзныя, маўклівыя дзеці з надзвычай выразнымі вачамі засяроджана сачылі за пластычнай імправізацыяй Вольгі Дворнікавай ды Наталлі Барсуковай — дуэта з Тэатра жывога дзеяння, што пры гарадскім цэнтры творчасці "Вікторыя". Потым усе разам — юныя мастакі, іх бацькі ды педагогі — узняліся на другі паверх незвычайнага творчага дома, дзе адбылася прэзентацыя адразу дзвюх выставак. Экспазіцыя "Адкрываючы новыя прасторы..." прадставіла творчасць (гуаш, акварэль) больш як дваццаці выхаванцаў майстэрні "Фарба", а юны мастак Віталь Мельнікаў паказаў серыю сваіх работ пад назваю "Maps".

"Фарба" — майстэрня вядомая. Яна ўжо шаснаццаць гадоў працуе на базе сталічнай Спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы № 14 для дзяцей з парушэннямі слыху. За гады існавання гэтага творчага асяродка да заняткаў у ім прычынілася 58 навучэнцаў школы, а работы выхаванцаў "Фарбы" экспанаваліся ў Беларусі, Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраіля, Францыі, Швейцарыі, Японіі. Спрычыненне да выяўленчага мастацтва развівае пачуццёвы, эмацыйны досвед юных вучняў Дзмітрыя Ярмілава, развівае іх унутраны свет і стасункі са светам навакольным, дае неацэнную магчымасць самавыяўлення і выказвання праз мову колеравых вобразаў і пластычных ліній. Асабліва натхнёна і плённа праходзяць пленэры на возеры Свіцязь, куды ў цёплы час выязджаюць студыйцы.

І вось — новая акцыя з удзелам "Фарбы" ў межах штогадовага праекта "Адкрытае мастацтва", прымеркаваная да Дня інвалідаў Рэспублікі Беларусь. Гэтым разам юныя мастакі спасцігалі свет скульптуры: кульмінацыяй сустрэчы ў мемарыяльным музеі народнага мастака СССР Заіра Азгура стаўся майстар-клас пад назваю "Ад задумы да ўвасаблення". Правялі яго скульптары Ігар Засімовіч, Кацярына Злоціна, Аляксей Сарокін, Уладзімір Піпін у скульптурнай зале, сярод легендарных выяў, створаных знакамітым майстрам. Надзіва хутка знайшлі агульную мову настаўнікі і вучні. Працэс лепкі аказаўся такі захапляльны, што нават бабулі не вытрымалі ролю пасіўных назіральнікаў — мяккая, "прафесійная" радашковіцкая гліна пабывала ў руках ці не кожнага прысутнага, і дарослыя разам з дзецьмі далучыліся да стварэння фантазійных пластычных вобразаў...

Лана ІВАНОВА

На здымках: у скульптурнай майстэрні; вернісаж Віталя Мельнікава.

Фота Віктара Кавалёва

«Усякіх там Коласаў ды Бядуль...»

У аўтабіяграфічнай характарыстыцы Юркі Лявоннага, якая захоўваецца сярод дакументаў Магілёўскай філіі "Маладняка" ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, ёсць цікавае прызнанне: "З беларускай творчасцю крыху пазнаёміўся ў студзені 1925 года, слухаючы беларусазнаўства на Магілёўскіх агульнаадукацыйных курсах.

Адразу надта зацікавіўся ёю, але наогул аб сучасным стане літаратуры меў вельмі дрэннае прадстаўленьне" (БДАМЛМ, ф. 225, в. 1, спр. 9, арт. 64).

Чытачу, які ведае Юрку Лявоннага як аўтара некалькіх паэтычных зборнікаў, такое прызнанне можа падацца дзіўным. Аднак у сярэдзіне 1920-х гг. такая сітуацыя была звычайнай, маладнякоўцы не саромеліся сваёй неабазнанасці, бо лічылі, што сапраўдная беларуская літаратура пачынаецца толькі з іх. Сябра той жа Магілёўскай філіі Кастусь Губарэвіч у аўтахарактарыстыцы, якую пісьменнікі складалі для ўступлення ў "Маладняк", пісаў: *"Упершыню пазнаёміўся я ў тэхнікуме з нашай беларускай літаратурай... перачытаў я амаль што ўсіх старых і новых пісьменьнікаў, якія толькі пападаліся пад рукі. Спачатку я тож проста плакаў бы ўмесьці з Коласам, Купалам, Бядулем аб сваёй старонцы гаротнай (што, вядома, зьяўлялася адбіткам майго жыцьця ў беднай сялянскай сям'і ...) Я зразумеў, што за сьлязьмі нацыянальна-адраджэнчаскіх песень ня здолею ўбачыць соцыяльную сутнасьць сваёй эпохі і т.ч. я спыніўся перад пагрозай двоіцца ў сваёй творчасьці"*.

Вельмі цікавая рэмарка адносна "пагрозы двоіцца". Цікавая тым, што так ці іначай гэтая "двоістасць" (жаданне прымірыць ідэалы нацыянальнага адраджэння і тэндэнцыі новага часу) паўстала перад кожным беларускім пісьменнікам на пачатку 1920-х гг., набыла сэнс своеасаблівай праблемы пакалення, што бліскуча было адлюстравана ў аповесці Максіма Гарэцкага "Дзве душы".

Кожны здзяйсняў свой выбар па-рознаму. Маладнякоўцы лічылі патрэбным адмовіцца ад "слёз нацыянальна-адраджэнцкіх песень", а гэта — у сваю чаргу — значыла адмовіцца ад працягу нашаніўскай традыцыі. Усім вядомая так званая маладнякоўская тактыка "ў рожкі са старымі". Яна дастаткова яскрава адлюстравалася і ў тагачаснай перыёдыцы, і ў саміх мастацкіх творах. Засталіся яе "сляды" і ў архіўных дакументах.

Алесь Дудар, ствараючы для ЦБ "Маладняка" кароткія характарыстыкі сяброў Полацкай філіі, абавязкова адзначаў стаўленне кожнага да творчасці пісьменнікаў старэйшага пакалення. Так, напрыклад, пра Паскрэбку пісаў: *"Адносіцца да маладнякоўскай працы шчыра, але занадта сымпатызуе тым самым Коласам"* (БДАМЛМ, ф. 225, в. 1, спр. 13, арт. 57). Зразумела, што пад "тымі самымі Коласамі" меўся на ўвазе не адзін пісьменнік, а агулам усе нашаніўцы. У іншым лісце Алеся Дудара з Полацка: *"Дужа пажадана, каб сюды прыехаў хто-небудзь, асабліва добра было б, каб прыехаў Вольны ці Александровіч — самыя папулярныя сярод полацкай моладзі: усякіх там Коласаў ды Бядуль нешта моладзь, асабліва камсамольская, зусім ня ведае, а пра нас чула"* (БДАМЛМ, ф. 225, в. 1, спр. 13, арт. 73). Праўда, з Якубам Коласам у маладнякоўцаў былі сапраўды асабліва напружаныя адносіны, магчыма, таму менавіта яго імя пачало выкарыстоўвацца як метафара ўсяго заганнага ў літаратуры папярэднікаў. Варта прыгадаць хаця б прыяцельскі шарж Коласа "Трыумф", надрукаваны ў "Савецкай Беларусі" за 7 сакавіка 1925 г., у якім створана шыкоўная пародыя на маладнякоўскага паэта.

Па вялікім рахунку, нічога надзвычайнага ў такіх напружаных адносінах паміж нашаніўцамі і маладнякоўцамі няма: супрацьстаянне пісьменніцкіх пакаленняў было і заўсёды будзе неад'емнай часткай літаратурнага працэсу. Іншая справа, што яно не перакрэслівае пераемнасці мастацкай традыцыі — пытанне толькі ў тым, у якой форме гэта адбываецца. А ў 1920-х гг. агрэсіўнае стаўленне маладнякоўцаў да сваіх літаратурных папярэднікаў нагняталася штучна, праз ідэалагічную прапаганду, і было апраўдана заканамернасцямі не літаратурнага, але сацыяльна-палітычнага жыцця.

На здымку: літаратурнае аб'яднанне "Маладняк". К. Губарэвіч — першы злева ў другім шэрагу; Ю. Лявонны — чацвёрты злева ў першым шэрагу. Фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Толькі не ў Полацку...

Пра паэта і празаіка Алеся Дудара і крытыка і памфлетыста Тодара Глыбоцкага чулі многія. Між тым, Аляксандр Дайлідовіч, які актыўна друкаваўся ў 1920-х гг. пад гэтымі псеўданімамі, — постаць неадназначная. Пра яго ролю ў беларускім літаратурным жыцці можна разважаць па-рознаму. Для адных ён быў сябрам і паплечнікам, для другіх — вострым на язык і трапным на ацэнкі крытыкам, а для трэціх...

У сяброў літаратурна-мастацкага згуртавання "Узвышша", напрыклад, былі з ім вельмі напружаныя адносіны. Сёння гэта можна прасачыць па літаратурна-крытычных публікацыях у друку 1920-х гг. з абодвух бакоў. Але напружанасць выяўлялася не заўсёды. У пачатку 1920-х гг. Алесь Дудар і будучыя ўзвышаўцы Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Адам Бабарэка разам стваралі "Маладняк".

Як вядома, Алесь Дудар быў камандзіраваны Цэнтральным Бюро "Маладняка" для арганізацыі і кіравання філіяй у Полацк. Аднак юнацкія бадзёрасць і аптымізм сутыкнуліся з не вельмі спрыяльнымі ўмовамі культурнага жыцця невялікага горада. Неўзабаве Алесь Дудар пачаў пісаць сваім паплечнікам у Мінск скрушныя лісты — з просьбай дапамагчы, прысласць некага на дапамогу ці хаця б арганізаваць сустрэчу полацкай моладзі з самымі папулярнымі маладнякоўскімі паэтамі — Чаротам, Александровічам, Дубоўкам. (Поўны тэкст "полацкіх" лістоў А. Дудара апублікаваны В. Жыбулем).Аднак сталічныя хлопцы, апантаныя "маладнякоўскім запалам", у прыватнасці, Язэп Пушча, раілі Дудару выяўляць напоўніцу свае арганізатарскія здольнасці і дакаралі за ўпадніцкія настроі. На што "полацкі ссыльны" адказваў: *"Мне здаецца, што ня шкодзіла гэтаму самаму Пушчы папрацаваць паўгода ў такой дыры, як Полацак. Ня ведаю, што засыпаваў бы ён"* (БДАМЛМ, в. 1, спр. 13, л. 42). Гэта Дудар пісаў у маі 1925-га, а ўжо праз два месяцы канстатаваў: *"Філія* [Полацкая філія "Маладняка". — **Ж. К.**] *фактычна распалася, і ў гэтым не мая віна, бо з нічога ня зробіш нічога"* (БДАМЛМ, в. 1, спр. 13, л. 49).

Верагодна, Полацку патрэбны быў час, каб дайсці да свайго літаратурнага росквіту. Калі б Алесь Дудар меў магчымасць даведацца, што будзе адбывацца *"ў такой дыры, як Полацак"* прыкладна праз 65 год ад часу напісання гэтага ліста, ён бы пакінуў у душы іншыя ўражанні пра самы старажытны беларускі горад. Аднак нянавісць да Полацка ў душы Дудара была бязмежнай... 14 ліпеня 1925 года, даведзены да адчаю, ён пісаў: *"Толькі пасьля отпуску я ні за што не вярнуся ў Полацак, хаця бы мне прыйшлося кінуць усё. Я магу працаваць, хачу працаваць і буду працаваць. Толькі ня ў Полацку. Полацак мяне зґнаіў і фізычна, і можа маральна. Ад вас я атрымаў толькі цыркуляры ды нявыкананыя абяцанкі. Дужа прыкра, што прыходзіцца вам аб гэтым пісаць, але гэта так. Дасягненьні я маю тут вялікія: калі я меў раней хоць кроплю здольнасьці, дык у Полацку я яе страціў"*.

Зразумела, што перажыўшы такое, малады пісьменнік не мог не пакрыўдзіцца на сваіх калег, цалкам заканамерна ўсклаўшы на іх віну і за творчыя, і за фізічныя хваробы. Думаецца, гэта было не апошнім аргументам у варожым стаўленні Дудара да былых паплечнікаў па "Маладняку", а неўзабаве — лідэраў згуртавання "Узвышша" Адама Бабарэкі, Уладзіміра Дубоўкі і Язэпа Пушчы.

Красамоўным прыкладам могуць служыць крытычныя водгукі ў "Савецкай Беларусі", якія змяшчаў А. Дайлідовіч пад псеўданімам Тодар Глыбоцкі. Так, у артыкуле за 19 кастрычніка 1927 г., аналізуючы вершы маладых паэтаў, прысвечаныя тэме горада, Тодар Глыбоцкі дакараў іх за ігнараванне сапраўднага стану рэчаў, калі рэальная "урбаністычнасць" беларускіх гарадоў аказваецца ў вершах значна перабольшанай: *"Мы б не сказалі, што ў Полацку такі "ўжо "адвечны раскацісты гул", "заводы, гудкі і машыны", "дах увосланы дымам". Ня зусім давяраем мы і полацкім "каменным вуліцам", ці "асфальту", бо ў Полацку пасля добрага дажджу не па кожнай вуліцы можна хадзіць бяз рызыкі патануць у якой-небудзь лужыне велічынёй з добрае возера. <...> Дык што ж тады казаць ужо ня толькі пра Полацак, але нават і пра Менск, дзе да гэтага часу не памерла яшчэ конка і ў самым цэнтры Савецкай вуліцы красуюцца аднапавярховыя драўляныя халупкі"*. Аднак амаль праз паўтара месяца, у артыкуле за 27 лістапада Тодар Глыбоцкі, характарызуючы наступныя паэтычныя радкі У. Дубоўкі: "Менск, Менск! // Твае заводы — // больш на карыкатуры падобны", дае такі каментарый: *" <...> вельмі добра, што менскія рабочыя і рабочыя ўсяе Беларусі ня вельмі зачытваюцца творамі Дубоўкі. Іначы пакрыўдзіліся б ня толькі менскія гарбары, мэталісты, дрэваапрацовачнікі, але і работнікі барысаўскіх фабрык і віцебскіх і гомельскіх і рэчыцкіх. Пакрыўдзіліся б і іншыя рабочыя, бо беларуская прамысловасьць не такая ўжо карыкатурная, як уяўляе сабе Ўладзімер Дубоўка, седзячы недзе ў Маскве"*. (У. Дубоўка пастаянна жыў у Маскве, а ў Мінск толькі час ад часу наведваўся. Гэта, праўда, не замінала яму заставацца адным з самых папулярных і ўплывовых беларускіх паэтаў 1920-х гадоў, і, акрамя гэтага, — фактычным кіраўніком "Узвышша").

Такім чынам, крытык Тодар Глыбоцкі пачынае супярэчыць сабе, ахвяруючы жыццёвай праўдай на карысць асабістых антыпатый. Сёння відавочна, што ў літаратурных дыскусіях 1920-х гг. у падыходах да мастацкіх з'яў часта абсалютызаваўся суб'ектыўны пачатак і асабістыя непаразуменні пачыналі граць ролю крытэрыяў ацэнкі твораў. Менавіта таму да некаторых думак, выказаных у тагачасных крытычных артыкулах, часам трэба падыходзіць з улікам адносін паміж канкрэтнымі пісьменнікамі і крытыкамі, і памятаць пра тое, што не заўсёды гэтыя ацэнкі могуць быць справядлівымі.

Бясспрэчна, такая тэндэнцыя не з'яўляецца характарыстыкай выключна 1920-гг. Мабыць, так было, ёсць і будзе амаль ва ўсіх сферах, дзе працуе жывы чалавек са сваімі пачуццямі, эмоцыямі і прыярытэтамі. Аднак і пераканання сучасных пісьменнікаў адносна тэндэнцыйнасці літаратурных крытыкаў сёння падаецца таксама недарэчным.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Жанна КАПУСТА

На здымку: Аляксандр Дайлідовіч.

Згадкі

У нашчадкаў Аркадзя Моркаўкі

Неяк у 1970-я гады мая мама, настаўніца-пенсіянерка, набыла ў райцэнтры бібліятэчку беларускіх паэтаў — невялічкія выданні ў цвёрдых пераплётах. Сярод іх былі вершы Аркадзя Моркаўкі — сучасніка мамінай маладосці 20-х гадоў. Так я, студэнтка, бліжэй пазнаёмілася з творчасцю малавядомага пісьменніка, у якой вабіла больш за ўсё любоў да роднай старонкі:

Я не маю роскашы чырвонцаў,
Не заўсёды нават маю медзь,
Не ўладар я залатога сонца,
Каб цябе, мой край, сагрэць.

Але маю ў сэрцы звоны веча,
Але маю пчолак песень рой,
Што падслухаў у калядны вечар,
Што збіраў я роснаю парой.

(1922)

Верш "З дарогі" нагадваў тыя далёкія вёскі, куды калісьці маму, юную гараджанку, накіравалі вучыць грамаце дзяцей і дарослых:

Вось і школа, дзе дзірак нямала,
Як нямала й бязногіх сталоў,
Толькі з сцен пазірае Купала
На капу маладняцкіх галоў.

(1925)

Неардынарнай была і біяграфія Аркадзя Андрэевіча: атрымаўшы спачатку сярэднюю спецыяльную тэхнічную адукацыю, а затым вышэйшую, і ўсё жыццё працуючы ў гэтай галіне, ён адначасова пісаў вершы, развіваў паэтычны дар, уваходзіў у рэдкалегіі беларускіх часопісаў. Упершыню яго твор надрукавалі ў 1922 годзе, калі юнак вучыўся ў Віцебску. Паводле М. Гарэцкага, ён нават вёў заняткі па паэтыцы і беларускай літаратуры сярод мясцовых маладнякоўцаў. Пры жыцці паэта выйшаў толькі адзін яго зборнік — "Дым жыцця" (1928 г.). Але Радзіма не забыла творцу пасля таго, як яго ў 1957 годзе не стала: у 1959 годзе выйшаў зборнік "Гады, як ветразі", у 1973 — "Вершы". Друкуюць А. Моркаўку і цяпер...

У 1970-я гады, у выдавецтва "Полымя", дзе я працавала рэдактарам, прыйшла новая супрацоўніца Ірына Качаткова — маладая, сціплая і старанная жанчына. Наша выдавецтва выпускала шмат рознай літаратуры: кнігі, брашуры, буклеты, календары, інструкцыі. Ірына працавала над рэкламнымі выданнямі. Мы пасябравалі. Нас аб'ядноўвала любоў да працы, літаратуры, мастацтва.

Ірына з сям'ёй жыла разам з бацькамі і бабуляй. Іх кватэра сведчыла пра тое, што гаспадары — інтэлігенты: вялікая бібліятэка, копіі карцін сусветных мастакоў на сценах, з густам падабраны посуд, простая мэбля...

Неўзабаве я даведалася, што хаджу ў госці да нашчадкаў Аркадзя Моркаўкі: Ірына — яго ўнучка.

Бацька Ірыны, дзядзька Леў, высокі, статны мужчына, у супрацьлегласць свайму грознаму імені, быў спакойным, інтэлігентным чалавекам. Маючы тэхнічную адукацыю, цікавіўся літаратурай і мастацтвам, што адлюстравалася не толькі ў яго ведах, але і ў абсталяванні кватэры.

Ірыніна маці, цётка Ларыса, працавала настаўніцай. Гэта была строгая і мудрая жанчына.

Аднойчы разам з ёй я ўдзельнічала ў падарожжы мінчан па пушкінскіх мясцінах. Пушкініяна была блізкай ёй, у хатняй бібліятэцы стаялі шматтомнае выданне твораў паэта, кнігі пра яго жыццё і творчасць. У дарозе мая спадарожніца расказала мне, як калісьці Аркадзь Андрэевіч трапіў на расійскі кірмаш і напаткаў там пушкінскі альбом у рэдкай, здаецца, атласнай вокладцы з вышыўкай.

Тысячы няпростых, напружаных працоўных дзён мінулі з той пары. Шмат што перамянілася ў Беларусі. Цяжка сказаць, як напісаў бы пра гэта ў вершах Аркадзь Моркаўка, выхадзец з простага працоўнага асяроддзя, паводле біёграфаў, сціплы чалавек, удзельнік Мінскага падполля ў час Вялікай Айчыннай, патрыёт...

Я вельмі доўга не бачылася з Ірынай. Нарэшце, пры сустрэчы яна паведаміла мне пра змены, што адбыліся ў іх сям'і за гэты час. Ірына, як і раней, вельмі падобная да свайго прыгожага дзядулі. Толькі сівізна ўжо кранае яе валасы, ды кніг, над якімі давялося працаваць па-рэдактарску ў некалькіх выдавецкіх калектывах, працягваючы сямейную традыцыю служэння асветніцтву, стала больш. Няма ўжо выдавецтва "Полымя", якое некалі нас пазнаёміла. Выраслі Ірыніны дзеці.

У наступным годзе нашчадкі Аркадзя Моркаўкі і аматары беларускай літаратуры адзначаць 110-годдзе з дня яго нараджэння.

Святлана РУСАКОВІЧ

Аляксандр БЫКАЎ

Балада аб стрынгах

А чайкі зляталі, як стрынгі,
З нябёсаў аголеных Рыгі.

Уладзімір Мазго

Няхай не пейзажы Ямайкі,
А блізкае ўсё ж ткі замежжа,
Ды стрынгі зляталі, як чайкі —
Свабода не ведае межаў!

Якія навокал кабеты:
Бы кроў з малаком, не іначай.
Чакаюць зусім не санетаў,
А спрэс пацалункаў гарачых.

Ні белы тут верш, ні верлібр
Не здолеюць выказаць думку.
У роспачы стогне Ўладзімір —
Забыў ратавальную гумку!



Янусь МАЛЕЦ

Усё проста

Я хачу над зямлёй узляцець
І даведацца, хто яе круціць.

Юрась Нераток

О, наіўны Нераток,
А ці трэба мучыцца? —
Раскажу табе,
браток,
Як зямелька круціцца:
Я — пяць крокаў,
ты хоць крок, —
І пайшла круціцца!
Трэба ў школе —
што ні ўрок —
Лепш было вучыцца!

Мікола ШАБОВІЧ

Пятру РАДЗЕЧКУ

(аўтару вядомых пародый на В. Шніпа і А. Салтука)

Ясеназнаўцам быў Радзечка,
Пакуль не стрэлася рука
З радком Шніпа
ці Салтука
Пра Мінск, Гаваі,
Маладзечна.

Анатоль ЗЭКАЎ

Марыі ШАМЯКІНАЙ

Сваім крытычным
позіркам з Парнаса
Глядзіць яна
на літдзялянку,
Дзе вершы
наталяюць смагу квасам
І проза п'е расол
уранку.



Шаржы Алега Карповіча

Васіль ТКАЧОЎ

Зуб

На аўтобусным прыпынку да Цітаўца падышоў мужчына невысокага росту, шчуплы, акуратна апрануты і, торкнуўшы пальцам у распухлую шчаку, сказаў, перад гэтым зморшчыўшыся, як леташні яблык:

— Зуб... Толькі што вырваў... Сам я з Чыжоўкі... Ведаеце Чыжоўку?

Цітавец моўчкі кіўнуў: ведаю.

— Ажно два дні, на выхадныя якраз прыйшлося, цярпеў боль. Усе пілюлькі паглытаў, што былі. Не, каб адразу да зубнога доктара падацца... Не, каб асмеліцца... Дзяжурны ж зубны працуе ў горадзе, кажуць, і ноччу... А ў вас калі-небудзь зуб балеў?

Не разумеючы, чаго ад яго хоча гэты мужчына, Цітавец моўчкі кіўнуў: было. А сам адвярнуўся, каб не сустракацца вачыма з мужчынам. "От прычапіўся, смала!" Але той працягваў за ягонай спінай:

— І вось вырваў... А там корань — каб ты бачыў, дзядзька!.. У розныя бакі карэньчыкі тырчаць, ды вялікія, ды такія закручаныя!... І як толькі хапіла моцы ў доктаркі той зуб выцягнуць? Праўда, цягнула яна яго доўга, нават вельмі... Нагой ажно ўпёрлася ў крэсла. Але выцягнула!.. Фу-у!.. Перажыў такое, што і ворагу не пажадаеш...

Цітавец адышоў падалей ад мужчыны, аднак той не пакідаў яго ў спакоі, падступіўся таксама бліжэй.

Як на тое ліха, не было і патрэбнага аўтобуса.

— А доктарка ж — дзяўчынка, ага! — гуў, здавалася, над самым вухам Цітаўца мужчына. — Улічыць таксама трэба і гэта. Але малайчына, справілася. Корань — вы б толькі бачылі!.. У розныя бакі!.. І вось цяпер баліць тое месца, дзе ён, халера, той зуб тырчэў. Шчака, бачыце, якая? Хацеў зайсці выпіць сто грамаў, але ж на працу трэба. Такія вось нелады. Хоць галаву пад корч!.. Цярплю ж, а што паробіш? Трэба цярпець!.. У цябе, дзядзька, балеў калі-небудзь зуб? Рвалі? Страх, аднак!.. Страх!..

Нарэшце Цітаўца выратаваў аўтобус. Ён, шчаслівы і радасны, схаваўся ў салоне, а той мужчына — невысокага росту, шчуплы, акуратна апрануты — паказваў на сваю распухлую шчаку чарговаму першаму стрэчнаму.

Цітавец толькі цяпер адчуў, што ў яго таксама баліць зуб.

І ён нясмела пацягнуўся рукой да шчакі...

Уладзімір ЕРМАЛАЕЎ

Ці не дала маху?

Быў час — мятлою гнала:
Ану вас, мужыкі,
Адстаньце, прыліпалы,
П'янтосы, лайдакі.

Вясёлых баламутаў
Адпудзіла даўно.
Ідзіце вы на хутар,
Патрэбна вам адно.

Няўзнак
гады міналі,
І вось ні даць,
ні ўзяць.

Чамусьці прыставалы
У бок мой
не глядзяць.

Ёсць хлеб
і ёсць да хлеба,
Зайшоў бы хоць які.
Нічога вам не трэба.
Ну што за мужыкі!

Ілья ШАХРАЙ

Вар'ягадкі

Былі часіны раскідваць бутэлькі — надышоў час збіраць іх. Дарэчы, бутэлькі, як дзеці, бываюць прыёмныя і непрыёмныя.

Нябожчык выглядаў маладзей за свае гады.

Хамства — ваяўнічая адсутнасць інтэлігентнасці.

...У людзі не выйшаў, але чалавекам застаўся.

Доўга-доўга нараджалася ісціна ў спрэчцы, бо хавалася на дне шклянак.

Бег я, бег, апякаючыся свежапрасаванымі штанамі, а калі дабег — астылі яны, ды стрэлка затупілася...

Барыс КАВАЛЕРЧЫК

Думкі ўголас

Усе мы ў гасцях у жыцця. Але кожны пры гэтым хоча адчуваць сябе як дома.

Той, хто мелка плавае, не можа зрабіць і глыбокага ўражання.

Гора ад розуму, а без яго — тым болей.

Ад таго, што чакаецца пры глабальным пацяпленні, у холад кідае.

Спрачацца з дурнем неразумна, а згаджацца з ім — яшчэ горш.

Жыццё настолькі сур'ёзнае, што без гумару ў ім не абысціся.

Беднасць мыслення багаццем слоў не кампенсуеш.

Цяжка выглядаць на ўсе сто, калі будзеш часта ўжываць па дзвесце.

У каго галава на плячах, таму на шыю не сядзеш.

Калі вецер у галаве, дык і ў жыцці шторм.

Цяжка быць на кароткай назе з чалавекам, у якога доўгі язык.

Алег ЖДАН

Юбілеі і юбілейчыкі

Фельетон

Калі ў пісьменніка К. набліжаўся трыццаты дзень нараджэння, ён падумаў: гэта ж юбілей! Ну, можа яшчэ не юбілей, а юбілейчык, але ж трэба адзначыць! Праўда, пакуль што малавата было публікацый — надрукаваць пашанцавала толькі адно апавяданне ды адзін вершык, але ж... Ці так гэта важна? Ці не важней добрая кампанія ды чарачка з закускай?

Адразу паўстала пытанне: каго запрасіць на юбілейчык? Ну, вядома рэдакцыю часопіса ў поўным складзе. Крытыка — таго, лысага, вечна пахмурнага і небяспечнага.

Куды запрасіць? Вядома, у рэстарацыю гатэля "Мінск", на "Сёмае неба". Ашчаджаць грошы ён не збіраецца. Хай запомняць!

І ўсё атрымалася добра. Рэдактары часопіса пілі як не ў сябе. Пахмурны крытык еў, як з галоднага краю, а калі пад'еў, трохі павесялеў і па-сяброўску паляпаў яго па плячы. "Будзеш пісьменнікам", — зычліва прамовіў ён. Падпіўшыя рэдактары славілі яго, як надзею айчыннае літаратуры, і прапанавалі прынесці новыя апавяданні.

Калі набліжаўся трыццаць пяты дзень нараджэння, пісьменнік К. падумаў, што абмінуць яго нельга. Канечне, не вельмі круглая дата, але ж... Нельга дапусціць, каб пра яго забыліся! За гэтыя гады напісалася мала, а надрукаваць пашанцавала яшчэ менш. Дый ці так гэта важна? Ці не важней чарачка з добрай закускай? Ці не лепш гучыць шчыры тост, чым любы вершык ці апавяданне? Запрасіць на юбілейчык трэба, па-першае, усіх тых, каго запрашаў той раз. Потым... Добра было б запрасіць і галоўнага рэдактара, але ж страшна... Што як ён не п'е? Што як абразіцца? Увесь літаратурны лёс можа парушыць. Не, галоўнага рэдактара — рана.

І ўсё зноў было як след. Усе ляпалі яго па плячах, а пахмурны крытык прабурчэў: "Будзеш лаўрэатам".

Не, стаць лаўрэатам да наступнага юбілейчыка не давялося, і вінаваты ў гэтым ён, лысы: мала напісаў пра яго за гэтыя гады. А яшчэ вінаваты рэдактары слыннага часопіса: не ўсё друкавалі, што ён прыносіў. Але ж сорак год — не ўзрост, паспеецца. Запрашаць на чарговы юбілейчык рэдактараў трэба. Трэба і гэтага лысага казла, бо, не прывядзі Госпадзі, пакрыўдзіцца ды бадне! Дарэчы, цяпер прыйшоў час запрасіць і галоўнага рэдактара.

І ўсё пайшло, як па масле. Рэдактары прамаўлялі тосты і ляпалі па плячах, галоўны рэдактар згодна і лагодна ківаў галавой, а крытык прабурчаў: "Сказаў — будзеш, значыць будзеш". І ніхто, акрамя іх дваіх, не зразумеў гэтых слоў. "Твае словы ды Богу ў вушы", — заўважыў пісьменнік. "А што — Бог, — усміхнуўся крытык. — Ён тут, на "Сёмым небе". Творы твае не чытае, але зважае, як накрываеш стол". Вось толькі галоўны рэдактар трохі псаваў настрой: маўчаў, як вады у рот набраўшы. "Нічога, — падумаў пісьменнік К. — Ты ў мяне яшчэ тамадой будзеш".

Напярэдадні сорак пятага дня нараджэння пісьменнік К. замаркоціўся: пакуль што адны выдаткі. Слоў шмат, а выніку няма. Няма прэміі! Але ж святкаваць трэба. Сказана: спераду кінеш, ззаду паднімеш. І ён кінуў. Ды як кінуў! Гром стаяў на "Сёмым небе" ад тостаў, а ненавісны крытык паабяцаў: "Класікам будзеш!" "Каб ты згалеў, — падумаў пісьменнік К. —Ты мне прэмію абяцаў, а дзе яна? Стану класікам — я табе падкіну".

І калі набліжалася ягонае 50-годдзе... А потым 55... А потым 60-годдзе...Трымайся "Сёмае неба"!

Прэмію ён атрымаў. І класікам стаў. Праўда, ёсць класікі на ўсе часы, а ёсць на час. На час юбілею. Што ж, таксама няблага, як улічыць, што кожныя пяць год — свята!

Шапавальства

Не тое дорага, што красна золата, а тое дорага, што майстра добрага.

Прыказка

Настаўнікі з замежжа, ці як нас вучаць абуванцца ў лапці

У Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту на старых драўляных хатах, свірнах ды хлявах трэба было перакрыць саламяныя стрэхі. Такую адказную справу выконвалі не абы-хто, а майстры ажно з Нямеччыны. Зразумела, за плату па мерках гэтай краіны. Зараз з тых стрэхаў памалу турысты-наведнікі выцягваюць па саломінцы на сувеніры. Нашыя ж экскурсанты, сярод якіх трапляюцца людзі сталага веку, што яшчэ памятаюць, як крылі калісьці стрэхі, кажуць, што ранейшыя стрыхары так шчыльна ўкладвалі салому, што ў тую страху нават пальца ўціснуць немагчыма было. Такія майстры жывыя і зараз. Толькі стрэхі ў нас цяпер зусім з іншых матэрыялаў, хаця ў замежжы гэта найбольш папулярная экалагічна чыстая дахоўка, праўда, даволі дарагая. Таму і не зводзяцца там спецыялісты-стрыхары, якія яшчэ і на нашых стрэхах зарабляюць няблага.

Зарабляюць у нас замежнікі і на такім паўзабытым рамястве як шапавальства. Кожны з задавальненнем у міжсезонне абуўся б у лёгкія і цёплыя валёнкі, але мала хто з гарадской моладзі ведае, з чаго і як іх вырабляюць ці, дакладней, валяюць. Нават не ведаюць маладыя і сярэдняга ўзросту людзі такіх слоўкаў як лямец ці воўна. Можа, таму і запрасілі да нас замежных настаўнікаў, каб вярнуць з нябыту занядбанае рамяство. Ажно са Швецыі прыехала на Беларусь майстрыха-выкладчыца і ўжо другі раз праводзіла ў Мінску майстар-класы па мастацкіх вырабах з лямцу. Два дні заняткаў каштавалі 40 долараў. Аказваецца, у Еўропе зараз вельмі модныя і надта дарагія ўпрыгожанні ды вопратка з натуральных тканін з воўны, бавоўны ды лёну, а найбольшай папулярнасцю карыстаюцца ўборы і аксесуары з лямцу.

Свае майстры не звяліся, альбо айчынны досвед шапавальства

Шапавальства — гэта шэрстабітны і валяльны промыслы, традыцыйнае мастацтва вырабу з воўны (валенне, качанне) галаўных убораў, валёнак, лямцу. Валеныя шапкі-магеркі і брылі былі вельмі распаўсюджаным у мінулым стагоддзі галаўным уборам беларускіх сялян.

У кожным мястэчку і вёсцы былі раней свае ўмельцы, да якіх прыносілі авечую воўну, найперш на валёнкі. Адмысловыя майстры маглі звяляць і рукавіцы, і шапку, і нават вельмі цёплую коўдру. Аднак такіх майстроў, а тым больш рамесніцкіх асяродкаў засталося вельмі мала. Хіба толькі на Магілёўшчыне, дзе ў Дрыбінскім раёне дасюль працуюць так званыя шапавалы.

Валянне шапак і дало кустарам на Магілёўшчыне назву — "дрыбінскія шапавалы". Тут былі майстры-саматужнікі, але быў яшчэ і промысел адыходны. Пасля завяршэння палявых работ шапавалы адпраўляліся ў заробкі і дабіраліся іншым разам не толькі да Масквы ці Кіева, але і ў Еўропу ды нават у Амерыку, як той Шарлоўскі з Дрыбіна, траплялі. Гэты шапавал няблага там зарабляў, бо штогод дасылаў сямейнікам па трыста рублёў, а гэта былі вялікія на той час грошы. Сённяшнія шапавалы дабраліся пакуль што толькі да Масквы, дзе ў самым цэнтры горада разам з работамі майстроў з другіх раёнаў Магілёўскай вобласці былі прадстаўлены работы дрыбінскіх шапавалаў.

Напрыканцы XIX стагоддзя, у 80-х гадах у Дрыбіне і Дрыбінскай воласці налічвалася 504 шапавалы. У Старым Дрыбіне гэтым промыслам займаліся 92 чалавекі, у Дрыбіне — 152, у Картыжах — 32, у Пакуцці і Галалобаўцы — па 30 чалавек...

Зараз на Дрыбіншчыне майстэрства шапавальства набыло новае дыханне, ажыло. І гэта насамрэч так, бо пры вырабе валёнак майстры ўкладваюць "душу" ў сярэдзіну абутку. "Душа" — гэта пласт воўны, пры дапамозе якога злучаюцца бакавіны і валёнак набывае патрэбную форму.

Усяго 12 гадзін — і валёнкі гатовыя!

Тэхналогія вырабу валёнкаў не сказаць каб складаная, аднак нялёгкая і даволі працаёмкая. Выкарыстоўваецца шапаваламі авечая воўна восеньскай стрыжкі, добра перабраная і вычасаная. Воўну (ці поўсць авечкі) раскладваюць на стале, потым загортваюць на выкрайку, надаючы пачатковую форму спачатку вялізнага валёнка, і пачынаюць, загарнуўшы ў шчыльную ільняную тканіну, таптаць ці валяць з абодвух бакоў, каб воўна скачалася і стала лямцам. Пры гэтым майстар правярае час ад часу таўшчыню сценак і дзе трэба дадае воўны ці расцягвае таўставатыя месцы, выпроставае складкі. Потым валёнак абліваюць гарачай вадой і, скруціўшы ў рулон, ціскаюць, мнуць, качаюць ва ўсе бакі, час ад часу раўняючы і выпрастваючы, зноў і зноў ашпарваючы кіпенем, пакуль абутак не звяляецца да патрэбнага памеру, а лямец стане шчыльным і роўным.

Потым валёнак трэба вывернуць і "пасадзіць на калодку" патрэбнага памеру, а пасля фармаваць з дапамогай правілкі і клінкоў. Пасля гэтага разам з калодкай валёнкі ставяць у добра прапаленую печ. Нарэшце, высушаныя валёнкі застаецца прасмаліць, каб яны мелі прыгожы і, як кажуць, таварны выгляд.

Такім чынам, за 12 гадзін бесперапыннай працы: качання і валяння, таптання і ашпарвання — можна звалять файныя валёнкі. Паспрабуйце, можа і атрымаецца. Дарэчы, воўны на вялікі, мужчынскі памер валёнкаў неабходна каля паўтара кілаграма, а на жаночыя — не больш 850 грамаў.

І ўсё ж такі за адзін дзень валёнкі зрабіць не атрымаецца, бо для гэтага неабходна найперш падрыхтаваць воўну. Для таго, каб яна стала мяккай, пушыстай і не было камякоў, дрыбінскія шапавалы выкарыстоўвалі такую прыладу для рыхлення воўны, якая называецца "брында" ці "струна". Патрэбна яшчэ рашотка з лучыны, звязаная шнуркамі, драўляныя калодкі — так званыя "балванкі" і "правідлы" — для надання правільнай формы валёнкам. Трэба мець таксама драўляныя і жалезныя качалкі для раскочвання лямцу, жалезныя шчоткі для расчэсвання ворсу і іншыя інструменты ды прылады.

Не толькі назвы шапавальскіх інструментаў былі адметнымі, але і сама мова майстроў здавалася абсалютна незразумелай для старонняга чалавека. Гэта быў так званы "Катрушніцкі лемязень".

«Катрушніцкі лемязень»

Гэта цяпер нават у Інтэрнэце можна знайсці інфармацыю пра шапавальства. А даўнейшыя майстры не вельмі ахвотна рассакрэчвалі сваё рамяство. Шапавалы з Дрыбінскага раёна нават мову сваю мелі, якая складалася не толькі з прафесійных дыялектаў, а была абсалютна незразумелай для недасведчаных. Каля тысячы патаемных, не проста дыялектных слоў і выразаў, складалі прафесійны говар, своеасаблівы слэнг. Недасведчаныя нават сэнсу размовы шапавалаў зразумець не маглі. Так майстры сакрэты свайго рамяства захоўвалі, а яшчэ падчас вандровак па вёсках іншым разам і гаспадароў-заказчыкаў, якія не надта гасціннымі былі, маглі абдурыць.

Супрацоўнікамі Дрыбінскай раённай бібліятэкі быў сабраны і выдадзены так званы "Катрушніцкі лемязень" — слоўнік дрыбінскіх шапавалаў. Паводле запісаў Е. Раманава, лексічны склад яго налічваў каля 915 слоў і ахоплівaў 13 паняційных груп. Дарэчы, сама назва рамяства "шапавальства" і прафесія "катрушнік" таксама з ліку гэтых патаемных слоў.

Гэтыя адмысловыя выразы і патаемныя раней словы і зараз ведаюць ды выкарыстоўваюць прафесіяналы, майстры-рамеснікі, што працуюць на Дрыбіншчыне. Там шапавальства — адмысловы брэнд, які прыцягвае турыстаў, бо не ўсюды ж можна пабачыць, як валяюць валёнкі ці шапку-магерку.

Магерка, брыль і рукавіцы

У XVI — XIX стагоддзях магерку ці маргелку — мужчынскі галаўны ўбор, распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі, мужчыны насілі круглы год. Фасоністая, фарсістая шапка, якая лічылася неад'емнай часткай мясцовага гарнітуру, рабілася дрыбінскімі шапаваламі двух відаў: паўдвайная і двайная, гэта значыць, загорнутая да паловы вышыні і акольш шапкі шчыльна прылягаў да верху, а ў другім выпадку ён даходзіў да самага краю. Магеркі былі лямцавыя (валяныя з воўны) ці сшытыя з чатырох кускоў тоўстай валянай тканіны. Іх рабілі вышынёй 15 — 20 см белага, шэрага, карычневага і чорнага колераў у форме ўсечанага конуса.

Вельмі запатрабаванымі былі вырабы для конскай збруі — лямцы. Без іх нельга было запрэгчы каня, бо яны ўмацоўваліся ў хамуты.

Валяныя лямцавыя брылі насілі ў любую пару года. Формай і памерамі яны былі падобныя да саламяных, толькі лініі пераходу ў іх больш мяккія, пластычныя, а аздабленне больш сціплае. Сёння такія капелюшы вельмі запатрабаваныя ў парылках аматарамі лазні.

Рукавіцы рабілі з шарсцяных нітак, якія майстар намотваў на драўлянае кола, а потым шыдэлкам (кручком) звязваў іх так, як вязалі сурвэткі ці шалікі. Пасля гэтага рукавіцу валялі і яна станавілася вельмі шчыльнай, цёплай. Але больш вядомыя на Дрыбіншчыне рукавіцы з двума ці трыма пальцамі, якія называлі "сподкі". Па тэхналогіі іх выраблялі як валёнкі, аднак зрабіць такія рукавіцы мог толькі адмысловы спрактыкаваны майстар.

Вяртанне да вытокаў

Такія майстры ёсць у беларускай сталіцы. У самым цэнтры старога горада, у Траецкім прадмесці ў мастацкай галерэі "Славутасць" можна пазнаёміцца з (нельга сказаць — з вырабамі) мастацкімі творамі маладой таленавітай мастачкі, мастака-дызайнера Алены Аляксеевай. На аўтарскай выставе і вопратка, і абутак, і шалікі, і кветкі, а яшчэ і вытанчаная мастацкая вышыўка. Гэта сапраўды высокая мода ў творчасці таленавітага майстра. Рэчы гэтыя, можна сказаць, бясцэнныя. І сапраўды, воўна — з Прыбалтыкі прывезена, а валянне, шапавальства — справа зусім нежаночая, бо так трэба біць-малаціць тую воўну, каб лямец атрымаўся, што і рукі, і плечы, і спіна адымаецца. Нездарма ж даўней толькі мужчыны шапавальствам і, дарэчы, саломапляценнем займаліся. А зараз усё пад сілу нашаму брату.

У міжсезонне перад надыходам зімы нават гараджане ў халодных кватэрах абуваюць валёнкі. З прылаўкаў размятаюць валёнкі Смілавіцкай фабрыкі, хоць яны і цвёрдыя ды мулкія. Некаторыя модніцы ўжо і па вуліцы разгульваюць у ёменькіх расшытых валёначках. Таму можна смела канстатаваць, што шэрстабітны абутак, валёнкі папулярныя і запатрабаваныя і сёння, а майстры-шапавалы будуць мець заробак.

Аднак каб шапавальства развівалася, трэба мець спецыялізаваныя фермы і разводзіць авечак, пажадана раманаўскай пароды. А яшчэ воўну неабходна перапрацоўваць. Некалі былі спецыяльныя прадпрыемствы, дзе воўну часалі. Зараз іх на пальцах пералічыш. І зразумела, неабходна падтрымліваць, заахвочваць майстроў, вучыць моладзь. Вось гэтым і займаюцца на Магілёўшчыне, у прыватнасці, у Дрыбінскім раённым гістарычна-этнаграфічным музеі. Там дзейнічае аматарскае аб'яднанне "Шапавал", у склад якога ўваходзяць мясцовыя майстры Любоў Ціханава, Стэфан Багданаў, Рыгор Цыганкоў, Анатоль Міхееў, а таксама навучэнцы Дрыбінскай сярэдняй школы.

Алена Мікалаеўна Рабкавец, дырэктар Дрыбінскага гісторыка-этнаграфічнага музея разам з навуковым супрацоўнікам музея Таццянай Міхайлаўна Чараповіч, майстрыхай-шапавалам прадстаўлялі тэхналогію валяльнай тэхнікі — шапавальства на разгляд Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь для надання ганаровага статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці гэтаму рэдкаму зараз і унікальнаму промыслу.

Ёсць надзея, што такое арыгінальнае традыцыйнае рамяство як шапавальства не знікне і набудзе новы імпульс і ўвасабленне ў творах маладых майстроў, бо сапраўднае мастацтва вечнае, а народная творчасць заўжды мае працяг.

Галіна СУША

На здымку: мастак-дызайнер Алена Аляксеева.

Фота аўтара і Ірыны Савосінай

Пачатак сёлетняй зімы прынёс нечакана моцныя маразы. На сваім веку і не прыпомню, каб снежань некалі быў такім халодным. Прыйдзецца, відаць, купляць валёнкі. Ніколі не паверыў бы, што іх можна выраблять круглы год, нават летам. Тавар гэты хоць і сезонны, але яго вытворчасць не спыняецца ні на хвіліну. У гэтым мяне запэўніў дырэктар Смілавіцкай валяльна-лямцавай фабрыкі Васіль Сабан.

Валёнкі носяць і ў Парыжы

— Летам рыхтуем запас на зіму. Бо пасля не паспяваем усіх забяспечыць. Мы ж не можам 200 тысяч пар выраб іць за адзін месяц. Таму працуем круглы год, — кажа Васіль Мікалаевіч. — Бо калі прыходзяць маразы, то да фабрыкі чэргі па валёнкі стаяць. А пачатак гэтай зімы як ніколі паспрыяў вялікай запатрабаванасці нашых валёнак.

200 тысяч пар! І ўсё гэта выраблене толькі 137 чалавек. А валёнкі — не адзіны ж тавар, які выпускаецца на фабрыцы.

Валёнкі заўжды лічыліся вясковым абуткам. Разбэшчаныя жыхары гарадоў саромеліся іх. Але гэта толькі наш народ саромеецца і да сёння. А вось ва ўсім свеце валёнкі (а правільна іх называць фетравым абуткам) не з'яўляецца чымсьці неардынарным. "Людзі, якія сябе паважаюць, клапоцяцца пра сваё здароўе, носяць. Сярод іх жыхары Парыжа, амерыканцы. Яшчэ 2007 у Францыі быў абвешчаны годам валенага абутку. Гэта толькі мы саромеемся. І ў беларускай вёсцы нават далёка не ўсе выбіраюць валёнкі". "А самі носіце валёнкі?", — пытаюся ў дырэктара фабрыкі. "Канечне. Штодзённа. Нават у любое надвор'е. І па 10 кіламетраў кожны дзень у іх хажу. Таму адчуваю сябе бадзёра і весела".

Словы Васіля Мікалаевіча пра запатрабаванасць валёнак ва ўсім свеце пацвярджае і геаграфія іх рэалізацыі —краіны Прыбалтыкі, Украіна, Польшча, Расія. "Зараз сваю прадукцыю павязём на выставу ў шведскую сталіцу Стакгольм", — дзеліцца бліжэйшымі планамі Васіль Сабан.

Валёнкі, што выраблялі хаця б 30 гадоў таму, значна адрозніваюцца ад таго, што выпускаюць сёння. Гэта і новыя тэхналогіі, і новае абсталяванне. А галоўнае — новы дызайн.

Чаму латышам і эстонцам, французам і палякам падабаюцца нашыя валёнкі, а мы іх саромеемся? Але не так усё змрочна. Над гэтым пытаннем пачынаем задумвацца і мы. Нездарма ж сёлета ў Мінску свята моды і стылю прайшло пад дэвізам "Валёнкі як ART-аб'ект ".

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

На здымку: дзяўчына ў валёнках, якія азадобіла дызайнер "Смілавіцкай валяльна-лямцавай фабрыкі" Святлана Длатоўская.

P.S. Пра тэхналогіі вырабу моднага абутку чытайце ў "Бярозцы" № 1 за 2010 год. Самыя актыўныя і кемлівыя чытачы змогуць выйграць валёнкі ў конкурсе, які праводзіць часопіс.

Фота Кастуся Дробава

Ганчары-чараўнікі

Пачатак керамічнай вытворчасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі быў пакладзены ў неаліце, 5 — 6 тысячагоддзяў таму, калі нашыя продкі пачалі вылепліваць гліняныя пасудзіны для гатавання стравы на агні. У Х-м стагоддзі, са з'яўленнем ганчарнага круга, вырабы з гліны набылі больш дасканалы выгляд. Свайго росквіту ганчарства на Беларусі дасягае ў XVI — XVII стагоддзях. Людзі, звязаныя з ганчарствам, кавальствам, млынарствам лічыліся ў народзе чараўнікамі, здольнымі паўплываць на ўраджайнасць глебы, адагнаць хваробу.

Нядаўна мне пашчасціла сустрэцца з прадстаўніком гэтай старажытнейшай прафесіі, майстрам-керамістам з Дзяржынска Андрэем Мяцельскім і яго жонкай Кацярынай, нядаўняй выпускніцай Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта. У звычайнай дзяржынскай двухпакаёвай кватэры, застаўленай керамікай, Мяцельскія за кубачкам кавы распавялі пра свой жыццёвы шлях, пра сваю творчасць. У Кацярыны не было ў радаводзе ганчароў: яна першая. А захапілася працай з глінай у час навучання на факультэце дашкольнай адукацыі, дзе навучылася і кераміцы, і ткацтву, і саломапляценню...

Неяк, гадоў чатыры таму, у Баранавічах праводзілася Свята горада, на якім дзейнічала выстава народных умельцаў. Кацярына, у той час студэнтка, выстаўляла свае творы, а Андрэй, на той час ужо вопытны майстар-керамік, — свае. І калі верыць мудрай народнай прымаўцы, што шлюбы адбываюцца на небе, дык гэта ў поўнай меры датычыцца Андрэя і Кацярыны: двое талентаў, апантаных любоўю да керамікі, сустрэліся на гэтай выставе, пазнаёміліся і пажаніліся.

Кацярына, як меней вопытная, вучыцца майстэрству ў свайго мужа, але за кароткі тэрмін паспела ўжо атрымаць за ўдзел у выставах граматы і дыпломы. Я пацікавіўся, як яна ставіцца да народнай прыказкі: "Ганчар гаршкі лепіць, а ў чарапку есці варыць"? На гэта Кацярына, смеючыся, адказала, што сапраўды так: мастацкія ганчарныя вырабы яна з мужам рыхтуе, галоўным чынам, на выставы, а посуд яны купляюць у краме.

У Андрэя, таксама як і ў Кацярыны, не было ў радаводзе ганчароў. Яшчэ ў раннім дзяцінстве ў хлопчыка выявіўся талент добра маляваць, таму ён, паралельна з навучаннем у агульнаадукацыйнай школе, наведваў заняткі ў Дзяржынскай мастацкай школе, дзе яго здольнасці маляваць дапамагаў адточваць даўні член Беларускага саюза мастакоў Уладзімір Шчарбін. Любоў да лепкі, керамікі Андрэю прывіла ў гэтай школе вопытны педагог, майстар сваёй прафесіі Наталля Ермаловіч. Менавіта дзякуючы ёй, Андрэй "пасябраваў" з глінай. Грунтоўную цягу да гліны і працы з ёю Андрэй набыў у час вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, дзе авалодаў тэхнікай вырабу керамікі, габеленаў, саломапляцення; у час вучобы адбылася і першая яго выстава керамікі. Пасля заканчэння вучобы працаваў майстрам па ганчарстве і выкладчыкам па кераміцы ў навучальных установах Мінска, затым скончыў Беларускі інстытут правазнаўства і атрымаў дыплом юрыста-міжнародніка. Захапляўся Андрэй і журналістыкай, неаднойчы друкаваўся ў перыядычным друку. Не абышоў Усявышні Андрэя і пісьменніцкімі здольнасцямі. У вольныя хвіліны, якіх у яго, на жаль, не шмат, ён на цудоўнай беларускай мове піша цікавыя гумарэскі, байкі ў прозе, філасофскія развагі пра жыццё і творчасць.

Андрэй Мяцельскі — адзін з нямногіх у сённяшняй Беларусі керамістаў, які выкарыстоўвае ў сваіх мастацкіх творах такія цяжка сумяшчальныя матэрыялы як гліну і саломку. Дастаткова азнаёміцца з яго алегарычным керамічным вырабам "Жанчына-луна". Але, як ён зазначае, творчасць не ведае межаў. Яго мастацкі керамічны твор "Дрэва жыцця" сімвалізуе сувязь пакаленняў; зачароўваюць таксама і прыгожыя музычныя інструменты-акарыны, і шматлікія біклагі, вазы, глякі...

У сваёй працы Андрэй шырока карыстаецца вядомым яшчэ з ранняга жалезнага веку такім відам апрацоўкі гліняных вырабаў, як дымленне, а таксама васкаваннем, якія прыдаюць кераміцы прыгожы выгляд. Таленавіты мастак-керамік — удзельнік шматлікіх міжнародных і айчынных выстаў, член праўлення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Кераміка Андрэя дэманстравалася ў Францыі, Малдове, Літве, Расіі. У Беларусі раней ён сам, а цяпер з жонкай Кацярынай неаднаразова выстаўлялі сваю кераміку на "Славянскім базары ў Віцебску". Сёлета, у наваколлі Віцебска, у Цэнтры народных рамёстваў, яны ўдзельнічалі ў пленэры ганчароў.

На вольным паветры, дзейнічалі печы па абпальванні керамікі, былі ўсталяваны ганчарныя кругі. Мяцельскія ўспамінаюць урачысты момант пленэру, калі "адкрыццё печы" ўзяў на сябе міністр культуры Беларусі Павел Латушка, які сваім веданнем прыемна ўразіў удзельнікаў пленэру. Стоячы ля ганчарнага горна, ён пажартаваў, што таксама мае дачыненне да гэтай прафесіі, бо латушка — гэта ганчарная пасудзіна, у якой смажылі і тушылі мяса і бульбу. Гэты жарт міністра неяк духоўна зблізіў яго і майстроў-керамістаў.

Сёлета, у кастрычніку, Мяцельскія былі ўдзельнікамі дзён Мінскай вобласці ў адной з акруг Масквы, дзе была наладжана выстава-кірмаш майстроў народнай творчасці. Андрэй Мяцельскі за ганчарным крутам, у белай, аздобленай беларускім нацыянальным арнаментам, кашулі дэманстраваў масквічам сваё майстэрства, а Кацярына размясцілася побач з гатовымі ганчарнымі вырабамі. Масквічы з цікавасцю знаёміліся з іх вырабамі і хвалілі, што беларусы зберагліся, не згубілі свае традыцыйныя рамёствы. Дарэчы, кашулю пашыў і ўпрыгожыў арнаментам Андрэй сам, і на ўсе выставы апранае яе, каб усім было адразу бачна, што ён прадстаўляе Беларусь. З усіх выстаў Мяцельскія вяртаюцца з дыпломамі і ганаровымі граматамі. Зараз керамічныя вырабы Мяцельскіх дэманструюцца ў Новасібірску, на 5-м Міжнародным фестывалі сібірскай керамікі.

Сёння Кацярына Мяцельская займае пасаду дырэктара Дзяржынскага раённага Дома рамёстваў, а Андрэй працуе там жа майстрам — метадыстам па кераміцы. Абое яны мараць пра той дзень, калі ў Доме рамёстваў запрацуюць цэхі майстроў-керамістаў, кавалёў, ткачоў, калі адчыняцца шапікі па продажы сувенірных вырабаў для шматлікіх замежных і айчынных турыстаў.

Лявон ЦЕЛЕШ

На здымках: К. Мяцельская; "Жанчына-луна"; А. Мяцельскі за ганчарным крутам.

Фота з архіва А. Мяцельскага

Крыніца натхнення

Некалькі гадоў загадчыкам Зацітава-Слабадской сельскай бібліятэкі — клуба ў Пухавіцкім раёне працуе Таццяна Журок. Прыязджаючы да бабулі, я часта сустракаю гэтую ветлівую і сімпатычную жанчыну. І даўно хацела пагутарыць з ёю як з гаспадыняй бібліятэкі.

— ***Таццяна Аляксандраўна, вёска наша не такая і вялікая, а ці шмат чытачоў прыходзіць у бібліятэку?***

— У зону бібліятэчнага абслугоўвання ўваходзяць 6 вёсак. Чытачамі ў асноўным з'яўляюцца жыхары Зацітавай Слабады. А гэта — і школьнікі, і людзі сталага веку. У сваіх штодзённых клопатах стараюся арганізаваць працу так, каб бібліятэка была асяродкам прыцягальным, каб развівалася ў людзей любоў да роднай старонкі, каб шанавалі духоўную, матэрыяльную культуру беларускага народа. Адным з важных напрамкаў, які з'яўляецца прыярытэтным для бібліятэкі, на працягу некалькіх гадоў застаецца праграма па прапагандзе краязнаўчых ведаў. Пастаянна папаўняецца тэматычная кніжная паліца "Бацькоўскі край — крыніца натхнення". І тут неацэнную дапамогу і мне, і, мяркую, іншым бібліятэкам аказваюць Пухавіцкая раённая бібліятэка на чале з таленавітым арганізатарам і дарадцам Ганнай Лабаставай, аддзел культуры Пухавіцкага райвыканкама пад кіраўніцтвам Яўгена Сушко. Часта завітвае ў бібліятэку-клуб старшыня выканкама Пухавіцкага сельсавета Галіна Мірчук. Яна — не толькі актыўны чытач, але і ў некаторай ступені мой дарадца. Мне ж цікава ведаць, што цяпер вывучаюць па школьнай праграме, ці можа чым канкрэтна бібліятэка дапамагчы вучням.

— ***А якіх кніг усё ж не хапае ў сельскай бібліятэцы?***

— Мяркуючы па задавальненні попыту, здаецца, усё ў нас ёсць: і мастацкая літаратура, у тым ліку на беларускай мове, і дзіцячыя кнігі. Праўда, дачнікі, якіх летам у Зацітавай Слабадзе вельмі шмат, больш за ўсё пытаюцца пра дэтэктывы, а іх якраз у бібліятэцы зусім мала.

— ***А калі ўсё ж гаварыць пра густы...***

— Яны ў чытачоў розныя. Вось часта заходзіць да нас Аляксандр Шычко. Яму даспадобы творчасць беларускіх пісьменнікаў. Чытае, як мне падаецца, з задавальненнем прозу Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Алеся Савіцкага.

— ***Дзеці якога ўзросту — найбольш актыўныя чытачы ў Зацітавай Слабадзе?***

— Часцей прыходзяць хлопчыкі і дзяўчынкі малодшага і сярэдняга школьнага ўзростаў. Праводзім конкурс "Лепшы чытач лета". Сёлета пераможцамі сталі вучаніцы 7 класа Пухавіцкай сярэдняй школы — Насця Манюк і Насця Шчэрба. Конкурс заахвочвае дзяцей часцей прыходзіць у бібліятэку, больш чытаць.

— ***Таццяна Аляксандраўна, але ж і вы не толькі бібліятэкар, а і чытач... Што вас болей усяго цікавіць?***

— Чытаю шмат. Перавагу аддаю беларускай мастацкай літаратуры. Люблю чытаць літаральна ўсе газеты і часопісы, якія прыходзяць да нас. Мне падаецца, што і ў горадзе, і ў вёсцы бібліятэкары павінны апекавацца адным — як захаваць у людзей цікавасць да чытання. У дзяцінстве я і ўяўленні ніякага не мела аб прафесіі бібліятэкара. І пасля доўгія гады займалася справамі, далёкімі ад кнігі. А вось прыйшоў час — і сцежкі-дарожкі прывялі мяне ў бібліятэку.

Гутарыла Дар'я ШОЦІК

Эксклюзіў у цэнтры Еўропы

Як вядома, раённы цэнтр Акцябрскі, што ў Гомельскай вобласці, з'яўляецца сталіцай фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня". Першы фэст ладзіўся тут у 1998 — 1999 гадах у межах невялікага рэгіёна. Другі фестываль (2001 г.) ахапіў Гомельскую вобласць, а трэці, чацвёрты і пяты ўжо мелі статус рэспубліканскіх. І кожны раз ён аб'ядноўвае апантаных людзей, зацікаўленых у захаванні сваіх каранёў і сваёй культуры.

І вось нядаўна ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў адбыўся Рэспубліканскі семінар спецыялістаў па фальклоры абласных, раённых цэнтраў культуры, кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў пад назвай "Падрыхтоўка ўдзельнікаў фальклорных калектываў да Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня". Метадыст аддзела традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Мікалай Козенка акрэсліў арганізацыйныя і мастацка-творчыя асновы чарговага, VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня", які мае адбыцца ў наступным годзе. Мікалай Аляксеевіч падкрэсліў, што гэты фэст без перабольшвання можна ахарактарызаваць як эксклюзіў у цэнтры Еўропы. Ён узнік на аснове пакуль што не растрачанай, яшчэ жывой народнай творчасці: танцавальнай, песеннай, інструментальнай, апавядальнай, дэкаратыўна-побытавай аўтэнтычнай культуры беларусаў. І таму ў ім заключана адна з самых гуманных ідэй сучаснасці — аднаўленне грамадскага і асабістага жыцця чалавека на зямлі, ідэя захавання ў чалавеку чалавечага.

У наш складаны і супярэчлівы час фестываль "Берагіня" іграе яскрава вызначаную канструктыўную ролю, бо ён рэальна супрацьстаіць націску ўзораў масавай культуры, ставячы сваёй мэтай фарміраванне каштоўных арыенціраў беларускага грамадства ў кірунку асэнсавання значнасці традыцыйнага мастацтва ў сістэме сучаснай беларускай і сусветнай культуры, а таксама ахову, захаванне рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай спадчыны. Гэта фестываль асобага тыпу, які адзіны ў Беларусі ва ўмовах постмадэрнісцкай культурнай парадыгмы, яе ўхіламі ў псеўда- ці нават антыкультуру паслядоўна скіраваны на адвечныя чалавечыя каштоўнасці, сканцэнтраваныя ў традыцыйнай культуры.

Святлана Беразоўская, начальнік аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама Гомельскай вобласці, расказала пра дзейнасць, набыткі, дасягненні ў галіне культуры і мастацкія калектывы раёна, пра фестывальны рух, адраджэнне традыцый, танцаў, песень... Ларыса Казакова, метадыст Акцябрскага раённага цэнтра культуры, патлумачыла прысутным тэхналогію правядзення конкурсу выканаўцаў народных побытавых танцаў, а Таццяна Пладунова, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ, распавяла пра мастацкую рэканструкцыю свята Купалля на дакументальнай аснове з вопыту правядзення яго на мінулым фестывалі "Берагіня".



Увогуле, хоць фестываль і праходзіць раз у два гады, падрыхтоўка да наступнага ідзе, так бы мовіць, перманентна, адразу пасля заканчэння чарговага, і складаецца з чатырох этапаў. Першы, другі і трэці праводзяцца па рашэнні абласных, Мінскага гарадскога і раённых (гарадскіх) арганізацыйных камітэтаў. А чацвёрты этап уяўляе сабой рэспубліканскія заключныя мерапрыемствы. Гэта — III Рэспубліканскі турнір салістаў-выканаўцаў твораў народнай спадчыны (г. Лепель, 12 — 13 лютага 2010 г.); Тыдзень фальклорных відэафільмаў (г. Мінск, 8 — 13 сакавіка); VI Рэспубліканскі конкурс танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (г. Горкі, 19 — 20 сакавіка); V Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання" (г. Лагойск, 17 — 18 красавіка) і I Рэспубліканскі конкурс апавядальнікаў народнай прозы (г. Гродна, 17 — 18 мая). Ну, а фінал фестывалю пройдзе 24 — 27 чэрвеня ў гарадскім пасёлку Акцябрскі.

Удзельнікі "Берагіні" павінны прадставіць фальклорныя праграмы, якія скіраваны на змястоўнае раскрыццё мастацкіх традыцый менавіта сваёй мясцовасці: адноўленыя і бытуючыя аўтэнтычныя песні каляндарнага (вясна, лета) і сямейна-абрадавага (вяселле, хрэсьбіны) цыклаў, пазаабрадавыя песні, карагоды, танцы (сольныя, парныя, гуртавыя), гульні, інструментальную музыку, творы празаічных жанраў.

Адметнасць і адрозпасць фестывалю "Берагіня" ад многіх іншых, якія праводзяцца ў Беларусі, заключаецца перш за ўсё ў навукова абгрунтаванай канцэпцыі, дакладна распрацаваных умовах і зместу, якія найлепшым чынам адпавядаюць самой назве "Берагіня", адлюстроўваючы глыбокі сэнс і спрадвечную сутнасць народнага мастацтва. Застаецца з нецярпеннем чакаць, што падчас "Берагіні-2010" на Акцябршчыне збярэцца яшчэ больш калектываў, якія прадставяць гасцям свята адроджаныя мастацкія ўзоры нашай нацыянальнай спадчыны.

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымку: Мікалай Козенка.

Фота аўтара

Сёння, 24 снежня, споўнілася роўна 6 гадоў, як у сядзібе Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы пабывалі першыя наведвальнікі. Паўмільёна жыхароў з 92 краін свету прайшліся яе казачнымі сцяжынамі.



У госці да Дзеда Мароза

— Часцей за ўсё — гэта нашы землякі-беларусы і блізкія суседзі з Расіі, Украіны. Няма такога дня, каб тут нехта не быў, — тлумачыць мне гаспадар сядзібы Белавежскі Дзед Мароз. — Пабывалі ў мяне людзі з усіх рэгіёнаў, нават самых-самых аддаленых.

— ***А па ўзросце?***

— 65 працэнтаў — дарослыя. Дзяцей крыху менш.

У атачэнні шматвяковага лесу, у яго некранутай аўры спасцігаеш простую філасофію жыцця. Чалавек сярод прыроды — прыгожы. І думкамі, і справамі. Пушча — лес насамрэч першабытны, некалі ён распасціраўся ад Балтыйскага мора да ракі Буг і ад Одэра да Дняпра. У доказ таго, што тут былі стаянкі першабытнага чалавека, за шклом у пушчанскім Музеі прыроды прадстаўленыя розныя рэчы — крэмніевыя наканечнікі стрэл, скрабкі, керамічны посуд. Тут гаспадарылі досыць моцныя ваяўнічыя плямёны, якія палявалі, лавілі рыбу. У больш блізкі да нас час, у канцы XIV стагоддзя вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Ягайла аб'явіў пушчу запаведнай і ўвогуле ўстанавіў тут забарону на паляванне. Першыя ж пісьмовыя згадкі пра Белавежскую пушчу датуюцца 983 годам. Глыбіні вякоў!

Можа таму, цяпер сярод пяцісотгадовых дрэў нават дарослыя пачуваюць сябе як у казцы. Ва ўсёй пушчы. А на сядзібе Дзеда Мароза, якую адкрылі ў 2003 годзе, лірычны настрой падтрымаюць яшчэ 12 месяцаў — выявы беларусаў, якія абяцаюць выкананне вашых жаданняў. Альбо іншыя казачныя персанажы — драўляныя Беласнежка і сем гномаў, царэўна-лягушка. Пры ўсім яны сведчаць пра наша старадаўняе ўмельства ў аб'ёмнай разьбе па дрэве. А яшчэ ў сядзібе — самая вялікая ў Еўропе ёлка, вышынёй у 42 метры. Ёй 120 гадоў!

— ***Дзеці зазвычай расказваюць Дзеду Марозу вершы. Што ж яны чытаюць?***

— Гасцей у мяне вельмі шмат, і не заўсёды маецца магчымасць паразмаўляць. Але чытаюць дзеткі... Чытаюць! Любяць Якуба Коласа. "Мой родны кут, як ты мне мілы..." Тым больш, што гэты куточак якраз адпавядае таму настрою лірычнаму і тым фарбам, якія ў паэме, ды цалкам — уяўленням пра Беларусь. Мы вельмі ганарымся, што прырода не абышла нас, а наадварот, адарыла незвычайнай прыгажосцю. Гэта наша візітная картка — зубр і Белавежская пушча... Чытаюць дзеці. Але што павінен сказаць: сучасныя сродкі масавай інфармацыі, тэлебачанне, Інтэрнет вельмі перашкаджаюць інтэлектуальнаму развіццю. Але можа, сітуацыя хутка зменіцца. Галоўнае, што дзеткі добрыя, пішуць цікавыя пісьмы. І змест гэтых пісьмаў самы светлы, яркі. Яны так цікава пішуць пра сваіх бацькоў, жадаюць ім дабра, шчасця, столькі ў лістах падзякі! Пішуць і настаўнікам, расказваюць пра сваіх сяброў.

— ***У падарунак кнігу замаўляюць?***

— А як жа? Просяць. Розныя кнігі. І займальныя, і маленькія ілюстраваныя з вялікім шрыфтам. У нашых сувенірных лаўках ёсць шмат цікавых кніг менавіта па гісторыі Белавежскай пушчы, пра станаўленне нацыянальнага парку, пра зуброў, пра жывёл. Гэта цікава!

— ***Ваша нацыянальная апратка, выдатны саламяны капялюш — спецыяльна рыхтуюцца?***

— У мяне на кожную пару года спецыяльны ўбор. Гэта варыянт восеньскі. А ёсць і летні, і зімовы, і вясновы. А гэты галаўны ўбор, карона, ды і наогул уся вопратка — ад таленавітых жанчын з Мінска. Ёсць такое прадпрыемства "Скарбніца". Яны ўсе мае капрызы выконваюць.

— ***А як прымаюць саламяную карону?***

— Вельмі хораша. Тым больш, што гэта эксклюзіўны варыянт. Прыязджаў сюды неяк мільянер з Японіі, дык ён праз перакладчыка так угаворваў мяне, каб я прадаў сваю карону! І вялікія грошы даваў. Але ж не прадаецца такая прыгажосць. Многія цікавяцца нашымі нацыянальнымі строямі. Нядаўна наш пасол з Фінляндыі перадала мне афіцыйнае запрашэнне наведаць іх краіну. І вельмі зацікавілася маім адзеннем. Параіў звярнуцца ў тое самае атэлье "Скарбніца". Так што для іхняга Ёлу-Пукі можна і ў нас заказаць вопратку.

— ***Дзед Мароз мае мірское імя?***

— Мае. Але гэта канфідэнцыяльная інфармацыя.

— ***Як жа назваць вас чытачам "ЛіМа"?***

— Дзед Мароз!

Сядзібу наведала Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: Сядзіба Дзеда Мароза; Дзед Мароз у восеньскай вопратцы; пісьмы ад беларускіх дзяцей; маляўнічы куток Белавежскай пушчы.

Фота аўтара і Кастуся Дробава

У наступным нумары ЛіМ

Анатолю Галушку было 17, калі ён, выпускнік вясковай школы, здаў уступныя экзамены ў "мараходку". Спякотным летнім днём на беразе Шчары, такой роднай для яго прыгажуні-ракі, хлопец радаваўся жыццю, марыў пра вучобу ў далёкім горадзе, пра караблі ды марскія падарожжы. У тыя хвіліны ён не прадчуваў ніякай бяды. А яна была зусім побач... Страшныя выпрабаванні выпалі на долю колішняга юнага рамантыка. Але Анатоль Галушка, вось ужо 30 гадоў прыкуты да інваліднага ложка, знайшоў у сваім новым жыцці прыгожы і вялікі сэнс. Пра гэтага мужнага і таленавітага чалавека — нататкі Валерыя Гапеева "Добрага дня, Анатоль!"

З глыбінкі

Чым старэй, тым прыгажэй

Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя Іосіфа Стаброўскага адсвяткаваў 80-я ўгодкі. За гэты час музей быў сведкам розных падзей у гісторыі горада: больш чым трохгадовай акупацыі кайзераўскай Германіяй, 20-гадовага перыяду ў складзе Польшчы, трохгадовага зняволення нямецка-фашысцкімі захопнікамі, стваральнай пасляваеннай дзейнасці працоўных горада і раёна.

Галоўны захавальнік фондаў музея Ірына Шпыркова з пачуццём гордасці за ўстанову, якой яна аддала больш як паўвека, расказвае пра выставу "Знаёмы і незнаёмы Слонім", прымеркаванай да юбілею. А пачыналася яна з эксклюзіўнага плана горада 1825 года. 56 абазначэнняў розных збудаванняў, канал Агінскага — той гістарычны цэнтр, які складваўся з XIV па XVIII стагоддзе. Гэта сапраўды унікальны план, які выдатна захаваўся да нашых дзён. Яшчэ адзін план-эксклюзіў прысвечаны перабудове гістарычнага цэнтра пасля таго ўжо, як тутэйшыя землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

— Як лічаць многія гісторыкі-архітэктары, — распавядае Ірына Рыгораўна, — Слоніму вельмі пашанцавала, што ён захаваўся. І цяпер экскурсанты, асабліва замежныя, дзівяцца: "Дык у вас тут як у сапраўднай Еўропе!". А ў нас насамрэч цудоўны гістарычны цэнтр, які раней быў абнесены помнікамі культавага дойлідства. Гэта капліца святога Дамініка і слонімская сінагога, касцёл і кляштар бернардзінцаў (Свята-Троіцкая царква)... Старажытны горад паўстае як добра знаёмы з-за помнікаў даўніны, якія захаваліся. І ў той жа час слонімцы, асабліва маладое пакаленне, дзякуючы музею шмат пра што дазналіся і ўбачылі ўпершыню.

У музея багатае мінулае. Яго экспазіцыі і фонды захоўваюць унікальныя артэфакты, якія адлюстроўваюць жыццё і побыт нашых продкаў. Дарэчы, яго заснавальнік — ураджэнец Слонімшчыны, археолаг, нястомны даследчык роднага краю Іосіф Стаброўскі — у 1939 годзе перадаў гораду больш як пяць тысяч прадметаў.

— За мінулы год, — далучаецца да размовы дырэктар музея Наталля Рыжак, — наш фонд папоўніўся больш як 250 экспанатамі. Найбольш цікавыя — эксклюзіўныя матэрыялы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікаў вайны ў Афганістане, здымкі канца XIX стагоддзя, на якіх адлюстраваны некаторыя падзеі з жыцця горада і наваколля. За шматгадовую плённую працу музей у 2002-м узнагароджаны Дыпломам і прэміяй Прэзідэнта Беларусі "За духоўнае адраджэнне" ў намінацыі "Музейная справа".

Сёння яго калектыў выкарыстоўвае шматлікія формы работы: экспазіцыйную, экскурсійную, музейныя заняткі, лекцыі, выдавецкую дзейнасць... У музея цудоўная будучыня, нягледзячы на яго ўзрост. Таму што чым ён старэй, тым прыгажэй, упэўнена Ірына Шпыркова.

Галіна РАМАНЧУК

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
(намеснік галоўнага рэдактара)
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-84-61
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
навін — 284-82-04, 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3006
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 23.12.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 7
Заказ — 6977

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686